№ 16 (422) 29 красавіка 2005

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



### Генэрал Фралоў за Мілінкевіча

«Тры чалавекі здольныя перамагчы Лукашэнку».

старонка 2

### Жыць у праўдзе

Эсэ Сяргея Дубаўца.

старонка 14

### Летні расклад электрычак

Палосы «Інфарматар» і «Вольны час».

старонка 11

100 ГАДОЎ «НН»

**Помнік чытачу**

Ініцыятыва «Нашай Нівы». **Старонка 3.**

НАША СТРАВА

**Калдуны**

Сапраўдныя калдуночкі трэба не раскусваць, а толькі раздушваць языком аб паднябеньне, каб раздаваўся характэрны піск. Алесь Белы пра культавую страву беларусаў. **Старонка 17.**

КУП

**Беларусь на продаж**

У Інтэрнэце можна набыць як аскепак Брагінскага мэтэарыту, так і цэлую плянэту Беларусь. Інтэрнэт-гандаль беларускім таварам. **Старонка 13.**

ЛЮСТРА ДЗЁН

**Саўка на мітынгу**

Беларусы апошнія 20 гадоў годна выглядаюць толькі на мітынгах і ў шэсьцях. «Сучасьнікі» Адама Глёбуса. **Старонка 20.**

IN MEMORIAM

**Апошнія прызнаньні Барыса Рагулі**

Памёр харызматычны стваральнік «Наваградзкага швадрону». **Старонка 10.**

ЛІТАРАТУРА

**Нямецкі папа**

Апавяданьне Сяргея Астраўца. **Старонка 18.**

# Райс сказала раз

І лічыць яна будзе да трох? Вашынгтон узяў выразны курс на зьмену Лукашэнкавага рэжыму. **Раман Якаўлеўскі** зь Вільні — на старонцы 3: «Гэта спакуса для беларускай апазыцыі». Аналіз **Аляксандра Батуры** на старонцы 4: «Аналёгіі не спрацуюць, у 2006-м адбудзецца нешта якасна новае, не падобнае ні на выбары 2001-га году, ні на выбары ва Ўкраіне». Пазьняк Лукашэнку: «Адмаўленьне ад удзелу ў выбарах — найлепшы варыянт для вас» — старонка 4. Аднагодка Лукашэнкі, жанчына без сумневаў — партрэт жалезнай Кандалізы на старонцы 6.



WWW.STATE.GOV

### РГА «Таварыства беларускай школы»

**запрашае бацькоў вучняў 8-х—10-х клясаў 12-гадовай сярэдняй школы (альбо 7-х—9-х клясаў 11-гадовае школы)** на цыкл канфэрэнцый і сустрэч з адміністрацыяй, выкладчыкамі, вучнямі й бацькамі вучняў зачыненага **Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа**, прысьвечаных наступным тэмам:

«Што дае й чаго не дае цяперашняя рэформа школы», «Як эфэктыўна падрыхтавацца й паступіць на вучобу ў беларускія і замежныя ўнівэрсытэты», «Як вучніцца й пасьпяхова здаваць іспыты па-беларуску», «Беларуская ліцэйская адукацыя ў мінулым і цяпер».

Сустрэчы будуць адбывацца ў **суботы** (30 красавіка, 7, 14, 21 і 28 траўня) — пачатак а 12-й, а таксама **ў чацьвяргі** 5 і 19 траўня — пачатак у 18.30 — у памяшканьні РГА «ТБМ імя Ф.Скарыны» (г.Менск, вул. Румянцава, 13, ст. мэтро «Плошча Перамогі»). Удзел у сустрэчах і канфэрэнцыях бясплатны. Расклад і тэматыка канфэрэнцый будуць пададзены асобна.

Кантактныя тэлефоны: (8-0172) 99-10-45 (увечары і ў выхадныя), мабільны: 704-62-10.

# «Ні кроку назад!»

Чарнобыльскі шлях–2005: моладзь спыніла спэцназ. Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага.**

Здавалася, рэзыдэнцыя ды яе ваколіцы вымерлі. Так, рэдкія ахоўнікі ў цывільным ды міліцыянты, што парачкамі сумуюць пад халодным дажджом. Пусты сквэрык ля Купалаўскага тэатру. Але на крутой вуліцы, што ўздымаецца да Дому афіцэраў, усё было інакш. Магутныя «Уралы», пад брызэнтам — спэцназ у камуфляжы. Вайсковая машына хуткай дапамогі. «Уазікі» з антэнамі. У дворыку — чырвоны пажарны вадаліў, сёньня вадамёт па сумяшчальніцтве.

— Далей нельга. Вучэньні.

На скрыжаваньні Энгельса ды Маркса, ля выхаду са станцыі мэтро «Купалаўская», ахоўнікі правяраюць білеты ў групы дзяцей, якіх настаўніца вядзе ў Тэатар юнага гледача, што па іншы бок рэзыдэнцыі. «У нас тут яшчэ будзе хлопчык ісьці, ён спазьняецца, прапусьціце і яго», — просіць настаўніца, сьпяшаючыся правесьці клясу цераз скрыжаваньне. Калі хлопчык пакажа білет — пройдзе. А безьбілетнікам — бой. Жыхароў навакольных дамоў таксама не прапускаюць, акрамя як па пашпарце з пазначанай прапіскай.

Працяг на старонцы 12.

50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

ЭЎРАПЕЙСКІЯ ПАРАДКІ. У пасланьні Фэдэральнаму сходу Пуцін заявіў, што Расея «*мае і далей*» выконваць «*цывілізатарскую місію на эўразійскай прасторы*».

Іначай бачыцца эўразійская пэрспэктыва газэце бізнэс-колаў Расеі «Ведомости». Падсумоўваючы ў сваім рэдакцыйным камэнтары вынікі візытаў Кандалізы Райс у Маскву й Вільню, а таксама сустрэчы Пуціна з Лукашэнкам, гэтае ўплывовае выданьне канстатуе: *«У спрэчцы Расеі з Захадам за будучыню Беларусі нашы шанцы выглядаюць вельмі слаба»*. І далей: *«Літва й Беларусь былі адзінай дзяржавай ці тэрытарыяльнай адзінкай з канца XII да пачатку XX ст. Што б там ні памяняла рэвалюцыя, гэтыя краіны й Польшчу зьвязвае доўгае супольнае жыцьцё. (…) Вільня прапануе суседзям дэмакратыю, эўрапейскія парадкі й свабоду, Масква — «апошняга дыктатара», што стварыў у краіне атмасфэру страху й тэрору»*. Выглядае, што пуцінская прэса дазваляе сабе прамаўляць тое, што думае расейская палітычная кляса, але што не прызначае для шырокай публікі. Вакол Беларусі складваецца новы міжнародны кантэкст. Пра гэта — старонкі 3—6.

СТАРТ СТАГОДЗЬДЗЯ. Увечары ў чацьвер мы, аўтары і чытачы «НН», сустрэнемся ў вялікай залі Дому літаратара. Будзе гаворка, дыскусія, як вядзецца. Гэтая вечарына задуманая як старт вялікага сьвяткаваньня 100-годзьдзя газэты, якое ёсьць адначасова 100-годзьдзем рэгулярнае беларускае прэсы. Да лістапада 2006 году — рухавік нацыянальнага адраджэньня запрацаваў 10 лістапада 1906 году — Рэдакцыя пляную выдаць сэрыю кніг з публіцыстычным, эсэістычным і літаратурным даробкам 1991—2006 гадоў. Хай 2006 году пройдзе пад знакам «Нашай Нівы».

### «Наша Ніва» шукае

**вярстальніка** (-цу)
для працы на поўную стаўку.
Зьвесткі пра сябе падаваць
на e-mail: nn@promedia.by.

ДА СТАГОДЗЬДЗЯ «НАШАЕ НІВЫ»

# Помнік Чытачу

Адны нацыі паўстаюць у выніку паўстаньняў і рэвалюцый, іншыя — у выніку тысячагадовае рэлігійнае традыцыі або геаграфічнае ізаляцыі. А беларускую нацыю стварыла прэса.

У наступным годзе, 10 лістапада, споўніцца 100 гадоў з дня выхаду першага нумару «Нашае Нівы». «Першая беларуская газэта з рысункамі» перадусім была першым пэрыядычным сродкам масавае інфармацыі па-беларуску. Пры ўсім жаданьні цяжка дараўнаць да яе «Нашу Долю», што выйшла толькі шасьцю нумарамі, праклямацыйную «Мужыцкую праўду», што ціснулася ў пушчанскіх нетрах, ці «Газэту Гродзеньску» на дзьве бачынкі фарматам 15x20 см… Тая «Наша Ніва» за дзевяць гадоў рэгулярнага выхаду здолела злучыць цэлы край ад Аўгустова да Смаленску, усталяваць трывалыя повязі паміж многімі тысячамі людзей. Стварыць мову. Стварыць нацыю. На тым падмурку стаіць Беларусь да сёньня.

Напярэдадні вялікага нацыянальнага юбілею самы час падумаць пра тое, якім чынам Беларусь яго мае адзначыць. Першае, што прыходзіць да галавы, — гэта назваць у гонар «Нашае Нівы» вуліцы, праспэкты, пляцы й бульвары. Урэшце, маем жа ў сталіцы праспэкты, названыя ў гонар маскоўскіх газэт «Правда» ды «Известия». Традыцыя называць вуліцы, заводы, шахты, станцыі, паселішчы й нават цэлыя гарады ў гонар камуністычных газэт глыбока ўкаранілася за савецкімі часамі. Застаецца толькі дзівіцца, што ў БССР гэткае тапанімікі было небагата. Але гэта не выключна расейска-бальшавіцкая традыцыя. Так, адна з вуліцаў Ерусаліму названая ў гонар газэты «А-Ор», якую на пачатку XX стагодзьдзя выдаваў адраджэнец размоўнага іўрыту, наш зямляк Элізэр Бэн-Егуда.

Урэшце, увекавечыць імя газэты можна й па-іншаму. Так, кляса буераў (яхтаў з канькамі) «DN», названая ў гонар газэты «Дэтройт Ньюс», якая ў 1934 годзе абвясьціла конкурс на найлепшую мадэль буера. Цяпер гэтыя самыя надзейныя й танныя буеры ведаюць у цэлым сьвеце, як і газэту.

А ў Кітаі ў гонар першае кітайскае газэты навінаў «Каіюань», што выйшла ажно ў 713 годзе, названыя ня толькі вуліцы й машыны, але й гатэлі, паркі, бібліятэкі. Лішне казаць, што кітайцы кожны юбілейны год той газэты адзначаюць як агульнанацыянальнае сьвята.

Як жа ж мусіць ушанаваць сваю «Нашу Ніву» Беларусь? Напэўна, паставіць помнік. Найлепей на адной з цэнтральных плошчаў Менску. Лягічна — там, дзе нешта нагадвае нам пра колішніх «нашаніўцаў» Купалу, Коласа ці Бядулю. Але якім мусіць быць гэткі манумэнт газэце? Анры Матыс неяк запісаў у сваім дзёньніку: «Для сапраўднага мастака няма нічога больш складанага, як намаляваць ружу, таму што перад усім ён мусіць забыць пра тое, як яе выяўлялі іншыя мастакі». Натуральна, гэткі мэмарыял у XXI стагодзьдзі мусіць адпавядаць найноўшаму часу, але таксама і сьведчыць пра тую, несавецкую, нескрываўленую традыцыю Беларушчыны.

Мо гэта мусіць быць набор нейкіх іранічных мэтафараў ці наадварот, сувора-ўзьнёслая Аўтарыя? Можа, там будзе зьмешчаны несупынны тэкст кірыліцаю й лацінкаю або партрэтныя выявы яе першых рэдактараў і аўтараў? Альбо гэта мусіць быць выява Чытача?

А мо гэта будзе й ня помнік з каменю й мэталу. Можа, пасадзім сто дубоў з усяе Беларусі?




МАЛЮНАК СЯГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Пераназавём аэрапорт?

Маем час падумаць. Тыя з нас, хто чытае «Нашу Ніву» й да сёньня, маюць права самі прапанаваць свой юбілейны праект. Эскізы помнікаў і кінасцэнары, эсэ й паэмы, развагі й ідэі ў любой форме. Будзем чакаць. Далучайцеся да праекту «Нашай Ніве» — 100»!

### Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску на «НН» прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапіках «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапіках «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

# Фралоў заклікаў галасаваць за Мілінкевіча

«Гадзіць, груба кажучы, нікому не зьбіраюся, — сказаў В.Фралоў. — Бачу трох кандыдатаў, гатовых перамагчы Лукашэнку». На гарадзенскай канфэрэнцыі найбольш галасоў набралі Мілінкевіч і Шушкевіч. **Сяргей Максімовіч** — з Горадні.

Абласная канфэрэнцыя дэмакратычных сілаў адбылася ў Горадні ў нядзелю 24 красавіка. На ёй галасавалі за прэтэндэнтаў на ролю адзінага кандыдата ад апазыцыі на будучых выбарах. Прысутнічалі 86 з абраных 101 дэлегата, удзельнічалі ў галасаваньні 83. У гарадзенца Аляксандра Мілінкевіча 57 галасоў, у Станіслава Шушкевіча — 49, у Сяргея Калякіна — 32, у Анатоля Лябедзькі — 25. Самавылучэнцы атрымалі меней чым па 10 галасоў.

**Працяг на старонцы 5.**

IN MEMORIAM

### Ён мог стаць беларускім Адамкусам

22 красавіка ў Канадзе на 86-м годзе жыцьця памёр Барыс Рагуля (нар. 1 студзеня 1920 году), намесьнік старшыні Рады БНР.

Ён пражыў поўнае прыгод і небясьпекі жыцьцё. У вайну ствараў беларускае войска, на чужыне стаў вядомым лекарам. Б.Рагуля не лічыў сябе героем, сьціпла казаў, што зрабіў для беларускай справы ўсё, што мог. І ўсё ж хацеў зрабіць больш.

Ён быў харызматычны лідэр, які ў час нямецкай акупацыі здолеў запаліць агонь беларускага патрыятызму ў сэрцах навагрудзкай моладзі. Ягоны конны «швадрон», укамплектаваны нацыянальна сьвядомымі хлопцамі з настаўніцкай сэмінарыі, быў пасьпяховым прапагандысцкім праектам. Людзі, упершыню ўбачыўшы сваё беларускае войска, верылі, што калісьці будзе і свая беларуская ўлада.

Барыс Рагуля вельмі любіў спорт. У 1942 годзе на навагрудзкім стадыёне ён бег стомэтроўку з найлепшым у раёне на гэтай дыстанцыі — Кастусём Рамановічам. Цікава, што нарадзіліся яны ў адзін дзень — 1 студзеня, толькі ў розныя гады. На фініш прыйшлі пляча ў пляча. А сёлета амаль адначасова пакінулі гэты сьвет…

Апошняе інтэрвію з Б.Рагулем у пачатку гэтага году запісаў журналіст зь нямецкага Ростаку Аляксандар Адзінец. У сакавіку ён зьвязаўся зь ім зноў, каб задаць яшчэ некалькі пытаньняў, але Рагуля ўжо быў вельмі слабы. «Мне надышоў час зьбірацца ў дарогу», — сказаў Барыс Рагуля, калі апошні раз тэлефанаваў мне з Канады.

**Сяргей Ёрш**

Апошнія прызнаньні Барыса Рагулі — старонка 10.

Георгі Ліхтаровіч
запрашае сяброў
запаліць
Ліхтарыкі
**4 траўня ў Доме літаратара**
У вечарыне прымуць удзел
**Галіна і Барыс**
**ВАЙХАНСКІЯ**
Пачатак у 18-30, вул. Фрунзэ, 5. Уваход вольны



# Спакуса для беларускай апазыцыі

Вашынгтон узяў выразны курс на зьмену Лукашэнкавага рэжыму. Зь Вільні — **Раман Якаўлеўскі.**

«Беларуская тэма» ўсё больш выходзіць на пярэдні плян у міжнародных справах. Падчас сваіх нядаўніх візытаў у Маскву і Вільню пра Беларусь гаварыла дзяржсакратар ЗША Кандаліза Райс. Нечакана гучна закранулі беларускую тэму і на саміце краін ГУУАМ у Кішынёве. Найбольш жорстка выказаўся Міхаіл Саакашвілі. Паводле яго слоў, народ Беларусі мае права на свабоднае, дэмакратычнае разьвіцьцё і Грузія гатова аказаць яму ўсю магчымую дапамогу. Словам, грузінскі лідэр стрымаў абяцаньне, дадзенае раней, — назваць на саміце ГУУАМ краіну, у якой адбудзецца наступная «аранжавая рэвалюцыя». Удзельнікі саміту прынялі сумесную заяву пра «стварэньне дэмакратыі ад Балтыкі да Чорнага мора». Некалі пра Балтыйска-Чарнаморскую Садружнасьць гаварыў і БНФ.

Нашмат менш пэўна для будучыні Лукашэнкавага рэжыму выглядала маскоўскае пасяджэньне вышэйшае дзяржаўнае рады саюзнай дзяржавы. Сярод прынятых на ім рашэньняў ня значылася канкрэтных тэрмінаў ўвядзеньня адзінай валюты і Канстытуцыйнага акту. Для многіх назіральнікаў гэта азначае, што праект саюзнай дзяржавы служыць толькі шырмай для нейкіх закулісных ці то таргоў, ці то перагавораў паміж двума прэзыдэнтамі.

### Цьвёрда трымаўся таварыш Лаўроў

Цяжка было не заўважыць, што пасьля зробленых у Маскве зусім не пахвальных заяў Кандалізы Райс на адрас беларускага рэжыму, на наступны дзень, калі Пуцін ужо прымаў Лукашэнку, гаспадар Крамля так нічога публічна і не сказаў у абарону старшыні вышэйшай дзяржрады саюзнай дзяржавы. За яго гэта зрабіў у Вільні міністар замежных спраў РФ Сяргей Лаўроў. Як вядома, у літоўскай сталіцы адбылася нефармальная сустрэча кіраўнікоў МЗС краін — членаў NATO. Адначасова і тамсама праходзілі пасяджэньні радаў NATO—Расея і NATO—Украіна.

На сваёй прэс-канфэрэнцыі ў Вільні «таварыш Лаўроў» (азначэньне Лукашэнкі) атрымаў такое пытаньне: «Ці выпадкова супалі з гэтым натаўскім мерапрыемствам у Вільні маштабныя беларуска-расейскія вучэньні на захадзе Беларусі?» У адказ міністар Лаўроў не прызнаў узаемасувязі паміж гэтымі дзьвюма падзеямі і адносна Беларусі асабліва падкрэсьліў, што Расея супраць навязваньня каму б там ні было дэмакратыі звонку. Пры гэтым дадаў, што ня будзе камэнтаваць выказваньняў іншых у адрас беларускага саюзьніка. Зразумела, што ў першую чаргу пад «іншымі» мелася на ўвазе дзяржсакратар ЗША.

### Воля народу

Прагучала «беларуская тэма» і на прэс-канфэрэнцыі міністра замежных спраў Украіны Барыса Тарасюка. Ён выказаў абурэньне з нагоды зробленага Аляксандрам Лукашэнкам параўнаньня Аранжавай рэвалюцыі ва Ўкраіне з бандытызмам. Як сказаў Барыс Тарасюк, украінскія падзеі мінулага году ва ўсім сьвеце ацэньваліся як негвалтоўны пратэст украінцаў. «Яны вырашылі, што ня будуць мірыцца зь невыкананьнем іх палітычнай волі, будуць абараняць сваю свабоду выбіраць лідэра, які ім падабаецца. Так што ніхто ня можа называць гэтую праяву волі людзей бандытызмам», — падкрэсьліў міністар.

Але гэтым «беларуская тэма» вычарпана не была. Сэнсацыяй, што ў нейкай ступені засланіла, як падалося, астатнія пытаньні прайшоўшага ў Вільні натаўскага мерапрыемства, стала сустрэча Кандалізы Райс зь нечакана ўзьніклай дэлегацыяй беларускай апазыцыі. Дакладней было б назваць яе не дэлегацыяй, а групай прадстаўнікоў дэмакратычных сілаў.

Гэтым разам знакавых палітычных постацяў апазыцыі сярод іх не было. Мадэратарам групы выступаў акадэмік Міхайлаў, рэктар закрытага беларускімі ўладамі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту, які жыве цяпер у Вільні. А вядучы выніковай прэс-канфэрэнцыі, намесьнік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Аляксандар Дабравольскі быў прадстаўлены на сустрэчы з Кандалізай Райс як кіраўнік аналітычнай групы кааліцыі «Пяцёрка+». Відаць,



ВІЛЕНСКАЯ СУСТРЭЧА. Ад левай: рэктар забароненага ЭГУ Анатоль Міхайлаў, намесьнік старшыні АГП Аляксандар Дабравольскі, зубровец Зьміцер Бародка, трэці справа — Хаўер Саляна, побач Кандаліза Райс.

той самай, якая высунула ідэю і распрацавала мэханізм вылучэньня апазыцыйнага адзінага кандыдата ў прэзыдэнты-2006. Што з гэтага выйдзе — меркаваць беларускім выбаршчыкам. Сярод суразмоўнікаў дзяржсакратара ЗША былі і прадстаўнікі беларускіх СМІ, жаночага, моладзевага і праваабарончага рухаў.

Мяркуючы па іх словах, уражаньнях ад сустрэчы, якая адбылася, Кандалізе Райс была прадстаўлена даволі аб'ектыўная сытуацыя ў Беларусі. Зрэшты, прадстаўнікі дэмакратычных сіл Беларусі прызналіся, што былі прыемна зьдзіўлены той паінфармаванасьцю пра Беларусь пані Райс, якую яна прадэманстравала ў ходзе зносінаў зь імі. Відавочна, што ў гэтым немалая заслуга належыць і пасольству ЗША ў Менску.

Трэба меркаваць, што ў недалёкай будучыні ў пані Райс будзе ўсё ў парадку са склонамі ня толькі расейскай, але і беларускай мовы. Усё ж цяперашні дзяржсакратар ЗША некалі працавала прарэктарам Стэнфардзкага ўнівэрсытэту. І заўсёды адзначалася яе старанасьць у вывучэньні таго ці іншага прадмету. Ня лішне будзе нагадаць і пра маштабы гэтай навучальнай установы. Хоць бы па адной лічбе. Гадавы бюджэт унівэрсытэту ў бытнасьць там на пасадзе пані Райс складаў 1,5 млрд даляраў.

### Пухліна дыктатуры

Варта адзначыць і факт, пра які мала гаварылася. Пры зносінах Кандалізы Райс з прадстаўнікамі беларускіх дэмсіл прысутнічаў і Хаўер Саляна — вярхоўны прадстаўнік Эўрасаюзу па пытаньнях замежнай палітыкі і бясьпекі. Пасьля нядаўняга прыняцьця ў Камісіі па правах чалавека ААН сумеснай рэзалюцыі ЗША і ЭЗ па Беларусі сустрэча ў Вільні зь беларускімі апазыцыянэрамі стала яшчэ адным сьведчаньнем салідарнага падыходу сусьветнай супольнасьці да «праблемы Лукашэнкі». Менавіта як такую праблему ў кулюарах віленскіх сустрэч называлі сытуацыю, зьвязаную зь Беларусьсю. Пры гэтым вельмі часта ўпаміналіся вядомыя пастуляты Кандалізы Райс, агучаныя ёю яшчэ ў бытнасьць памочнікам прэзыдэнта па нацыянальнай бясьпецы. Новая сусьветная палітыка ЗША, адзначала пані Райс, ужо ня будзе ўключаць гатоўнасьці падтрымліваць дыктарскія рэжымы, якія забясьпечваюць стабільнасьць у той ці іншай краіне і рэгіёне. Доўгачасовую стабільнасьць здольна забясьпечваць толькі дэмакратычная супольнасьць. А тыранія, тлумачыць ужо дзяржсакратар Райс, — гэта «раковая пухліна», якая ня можа быць дабраякаснай. І, натуральна, ад яе трэба пазбаўляцца.

Як вядома, прэзыдэнт Дж.Буш да тыраніяў залічыў і рэжым Лукашэнкі. Пра ўсё большую ўвагу да яго Вашынгтону можа сьведчыць ня толькі сам факт сустрэчы ў Вільні з удзелам дзяржсакратара ЗША. На выніковай прэс-канфэрэнцыі беларускіх суразмоўнікаў пані Райс чулі і здымалі прадстаўнікі ўсіх вядучых амэрыканскіх СМІ. Такога раней не назіралася. Відаць, пачалася масіраваная інфармацыйная кампанія ў ЗША па вытлумачэньні грамадзянам пазыцыі Вашынгтону ў дачыненьні да рэжыму Лукашэнкі. Што і казаць, ад такой хады разьвіцьця падзей зьяўляецца спакуса для статуснай беларускай апазыцыі. Толькі вось, думаюць многія, ці здольна яна перайсьці на якасна іншы ўзровень і ў выпадку зьмены ўлады ўпісацца і ўтрымацца ў ёй? Адказ на гэтае пытаньне далёка не відавочны.

### Чатыры ўмовы пані Райс

У Вільні пані Райс прадставіла чатыры пункты дэмакратызацыі ў Беларусі. На першым месцы — падтрымка незалежных СМІ. Далей ідзе грамадзкі рух, створаны вакол не палітычнай, а грамадзкай праблемы — напрыклад, зьнікненьня людзей. На трэцяй пазыцыі — аб'яднаньне сілаў апазыцыі і грамадзянскай супольнасьці. І толькі пасьля гэтага — пошук кандыдата ад апазыцыі, апанэнта Аляксандра Лукашэнкі.

Адной з галоўных праблем на сустрэчы з прадстаўнікамі дэмсіл было названа і тое, што беларускі рэжым і ня думае ствараць умовы для роўнай барацьбы.

### Разважаньні генэрала Мальцава

Паводле некаторых даных, сярод Лукашэнкавых апанэнтаў не выключаецца і магчымы варыянт намэнклятурнага перавароту з наступным правядзеньнем свабодных, дэмакратычных выбараў. Цікава, што пры разважаньнях на гэтую тэму нярэдка згадваюць адну заяву міністра абароны генэрала Леаніда Мальцава. На адной з сваіх прэс-канфэрэнцый генэрал выказаўся на тэму галоўнага ўроку такога хуткага падзеньня рэжыму Садама Хусэйна. Ён заключаецца ў тым, што амэрыканцам удалося купіць генэралаў дыктатара. І тыя проста здалі, пакінулі свайго гаспадара.

Нядаўна ў Беларусі прайшлі ваенныя вучэньні, якія, на думку шэрагу аналітыкаў, блізкія да рэпэтыцыі прыдушэньня ўзброенага канфлікту ў заходніх абласьцях краіны. Супастаўляючы факты — сцэнар праведзеных вучэньняў, бесьперапынныя заявы пра тое, што ніякіх каляровых рэвалюцый у Беларусі ня будзе, — многія назіральнікі гавораць, што сам Лукашэнка ў гэтым зусім ня ўпэўнены.

**Раман Якаўлеўскі, Вільня—Менск**

## СЬЦІСЛА

### Рэха Краснапольля

26 красавіка ў Магілёўскім абласным судзе быў абвешчаны прысуд у «краснапольскай справе». 27 студзеня 2004 г. у Краснапольлі ў спартзалі школы абрынуліся перакрыцьці й забілі чатыры чалавекі. Суд прызнаў вінаватымі ў службовай халатнасьці восем чалавек, якія праектавалі й будавалі навучальную ўстанову, — ад начальніка ўпраўленьня капітальнага будаўніцтва да прарабаў і майстроў. Працэс доўжыўся сем месяцаў і быў закрыты для журналістаў. Усе падсудныя атрымалі ад чатырох да шасьці гадоў пазбаўленьня волі. Пакараньне будуць адбываць у калёніі-пасяленьні для асобаў, што ўчынілі злачынствы па неасьцярожнасьці. З гэтых людзей таксама будзе спагнаны мільярд рублёў для кампэнсацыі шкоды пацярпелым — а іх каля 30 чалавек.

### Колькі таго лета

З 11 траўня ў Менску пачнецца традыцыйнае летняе адключэньне гарачай вады з мэтай падрыхтоўкі цеплавой сетак. Першымі прымуць на сябе «ўдар» жыхары, што жывуць у дамах па вуліцах Кашавога, Ванеева, Даўгабродзкай, Васьняцова, Захарава, Пуліхава, Чапаева, Фрунзэ, Варвашэні, Багдановіча, Харужай, а таксама Кальварыйскай, Адаеўскага, Матусевіча, Прытыцкага, Берута, некаторых дамоў на праспэкце Пушкіна.

### Рада Эўропы супраць эўтаназіі

Парлямэнцкая асамблея Рады Эўропы (ПАРЭ) выступіла супраць легалізацыі эўтаназіі. ПАРЭ ў сераду прыняла адпаведную рэзалюцыю, што асуджае наўмыснае спыненьне чалавечага жыцьця. Парлямэнцкая асамблея, выказваючы непакой тым, што ў некаторых мэдыцынскіх установах практыкуецца эўтаназія, прапануе краінам Рады Эўропы стварыць звод правілаў па аказаньні дапамогі невылечным пацыентам, што доўга знаходзяцца ў цяжкім стане.

### Ёсьць у рэвалюцыі пачатак

Каля 100 чалавек уварваліся ў сераду ў будынак Вярхоўнага суду ў Бішкеку, запатрабаваўшы адстаўкі ўсяго судзейскага корпусу Кіргізіі й старшыні Вярхоўнага суду Курманбэка Асмонава. Людзі абяцаюць, што ня сыдуць, пакуль іх патрабаваньне ня будзе задаволена. Некалькі сотняў пратэстантаў чакаюць вынікаў ля будынку. Міліцыя адмовілася ўжываць сілу супраць маніфэстантаў.

**АГ; svaboda.org, afn.by**

# Гадзіньнік зацікаў

Аналёгіі не спрацуюць, у 2006-м адбудзецца нешта якасна новае, не падобнае ні на выбары 2001-га году, ні на выбары ва Ўкраіне. Нешта істотна новае для Беларусі бачыцца ў камбінацыі такіх фактараў, як дэмакратызацыя Ўкраіны, уступленьне ў ЭЗ Польшчы, заявы Кандалізы Райс наконт дэмакратызацыі Беларусі і валтузьня вакол саюзу Беларусі і Расеі. Аналізуе **Аляксандар Батура**.

Многія людзі маюць тэндэнцыю думаць па аналёгіі. Палітыкі думаюць па аналёгіі. Аналёгіі вельмі зручныя для спрошчваньня карціны сьвету. Так, пасьля правалу мюнхенскіх перамоў з Гітлерам і наступстваў Мюнхену для гісторыі Эўропы Мюнхен стаў зручнай падставай для рацыяналізацыі замежнай палітыкі ў сытуацыях, якія больш-менш нагадваюць сытуацыю зь Мюнхенам. Гэта значыць, дамовіліся з дыктатарам, прапанавалі яму нешта. А ён нешта ўзяў, а пасьля ўсіх кінуў. Высновa Мюнхену — ніколі не даваць паблажкі дыктатарам, бо яны гэта ўспрымаюць як слабасьць. Па аналёгіі з Мюнхенам амэрыканцы пайшлі ў Віетнам, трымалі савецкі Саюз у «détente» падчас халоднай вайны, цяпер пайшлі ў Ірак.

Але ня ўсе думаюць па аналёгіі. Ганс Георг Вік прапусьціў мюнхенскую аналёгію ў 1999—2000. Але, магчыма, ён ужываў іншую аналёгію — якога круглага стала, як у Польшчы пад канец 1980-х. Аналёгіі даюць магчымасьць прагнозу, але яны таксама ўводзяць у зман, бо людзі бачаць тое, што яны хочуць бачыць, і прапускаюць, што ня ўпісваецца ў аналёгію. Цяпер мы ўсе пачалі думаць па аналёгіі з Аранжавай рэвалюцыяй: раз ва Ўкраіне было, то павінна быць і ў Беларусі, раз не было, то не спрацуе і ў Беларусі.



**АЛЕСЬ БАТУРА** — палітычны аналітык часопісу «ARCHE», выкладчык Дублінскага ўнівэрсытэту.

Аналёгія падаўжаецца да Кіргізіі і Сэрбіі. Раз Юшчанка быў супэрпапулярны і апазыцыя была аб’яднаная задоўга да 2004, то тое трэба і ў Беларусі. Раз рэвалюцыя была аранжавая, то трэба нейкі колер і ў паўночнай суседкі, а то «не зачэпіць».

Самае сьмешнае, што ўся гэтая аналёгія пачынае быць відавочнай толькі пасьля падзеі, пастфактум, тады, калі ўсё зразумела і ўся краіна магла ўжо згуляць у футбол лепей за нацыянальную зборную, якая гуляць ня ўмее. Па аналёгіі. Але аналёгіі вельмі выбарачныя. У Сэрбіі апазыцыя аб’ядналася незадоўга да выбараў і Каштуніца стаў вядомым палітыкам толькі за некалькі месяцаў да выбараў, у адрозьненьне ад Юшчанкі, які быў папулярны з 2001 году. Чаму выбіраюць аналёгію Ўкраіны, а ня Сэрбіі? Бо аналёгію Сэрбіі бралі за ўзор у 2001. А чаму ня выбраць аналёгію падзей у Кот-д’Івуары ў 2000-м, ці ў Тога нядаўна, ці ў Пэру ў 2000?

У Пэру прэзыдэнт Фухіморы абнуліў адзін тэрмін, пайшоў на выбары трэці раз, перамог. І празь некалькі месяцаў пасьля яго перамогі пачаліся такія дэманстрацыі, што мусіў уцячы з краіны. Чаму ня гэтая аналёгія? Можна знайсьці столькі ж падабенстваў паміж Беларусьсю і Пэру, колькі паміж Беларусьсю і Кот-д’Івуарам ці паміж Беларусьсю і Ўкраінай.

На самай справе, мысьленьне па аналёгіі добрае толькі для матывацыі і мабілізацыі, а не для таго, каб рабіць высновы. Падзеі могуць пайсьці па любым сцэнары ці па іх камбінацыі, а можа, будзе нешта зусім новае. Нешта істотна новае для Беларусі бачыцца ў камбінацыі такіх фактараў, як дэмакратызацыя Ўкраіны, уступленьне ў ЭЗ Польшчы, Літвы і Латвіі, актывізацыя ГУУАМ, заявы Кандалізы Райс наконт дэмакратызацыі Беларусі і, як ні дзіўна, вяртаньне да валтузьні вакол саюзу Беларусі і Расеі.

Беларусь з гэтага часу мяжуе з ЭЗ, зонай стабільнасьці і дэмакратыі. Гэта не часовая зьява, а назаўсёды. З ЭЗ трэба сябраваць. Нават аўтарытарныя рэжымы Марока, Альжыру ды Тунізіі ня могуць сабе дазволіць такой раскошы, як пляваць у эўрапейскі агарод. Беларусь знаходзіцца ў якасна іншай сытуацыі ад афрыканскіх суседзяў у тым, што яна эўрапейская краіна. Эўрапейская краіна павінна быць дэмакратычнай, гэта цяпер аксіяматычна. Прынамсі, на найбліжэйшыя чатыры гады Беларусь трапляе пад пільную ўвагу ЗША — пашырэньне свабоды зьяўляецца стрыжнем замежнапалітычнай дактрыны Дж.Буша. Кандаліза Райс сказала тое, што яна сказала ў Вільні, не ад сябе, а ад адміністрацыі наймацнейшай краіны. Гэта трэба слухаць. Гэта сур’ёзна.

> У беларускім пытаньні ёсьць тры гульцы цяпер — Лукашэнка, Расея, Захад. Раней былі два гульцы — Лукашэнка і Пуцін.

Наіўна думаць, што Расея дамовіцца з ЗША па дэмакратызацыі Беларусі. Але наіўна думаць, што, па-першае, ЗША будуць і надалей лічыць Беларусь зонай расейскіх інтарэсаў — пасьля рэфэрэндуму 2004-га ў Беларусі Расея страціла легітымнасьць па беларускім пытаньні. Па-другое, што расейцы не памяняюць тактыкі ў дачыненьні да Беларусі. Вельмі сымптаматычнымі былі іх паводзіны падчас падзей у Кіргізіі.

У беларускім пытаньні ёсьць тры гульцы цяпер — Лукашэнка, Пуцін, Амэрыка. Раней былі два гульцы — Лукашэнка і Пуцін — і два паўгульцы — Амэрыка і Эўропа. Пасьля дэмакратызацыі Ўкраіны, узбуйненьня ЭЗ і павелічэньня замежнапалітычнай ролі Польшчы інтарэсы Амэрыкі і Эўропы ў дачыненьні да Беларусі, я думаю, збольшага супадаюць, нават нягледзячы на сяброўства паміж Пуціным і Шродэрам. Пры гэтым роля Захаду значна ўзрастае.

Заявы Райс наконт дэмакратызацыі Беларусі трэба разглядаць без адрыву ад праблемы дэмакратызацыі Расеі, асабліва праблемы трэцяга тэрміну Пуціна. Сымптаматычна ў гэтым сэнсе зьяўленьне артыкулу Паўла Фэльгенгаўэра ў «Москаў таймс», у якім ён, спасылаючыся на нейкія крыніцы ў Адміністрацыі прэзыдэнта Расеі, кажа, што быццам бы выпрацоўваецца варыянт падаўжэньня паўнамоцтваў Пуціна праз стварэньне саюзнай дзяржавы зь Беларусьсю, абнуленьне яго тэрмінаў і стварэньне пасады віцэ-прэзыдэнта пад Лукашэнку. Ці Фэльгенгаўэр што не дачуў, ці гэта адна з «вутак» Крамля, ці гэта сапраўды адзін з варыянтаў — цяжка сказаць, я б ужо нічому не зьдзіўляўся.

У Пуціна ёсьць некалькі варыянтаў. Гэта: 1) проста пайсьці на трэці тэрмін; 2) зьмяніць канстытуцыю і правіць у якасьці прэм’ер-міністра; 3) абнуліць тэрміны праз стварэньне саюзнай дзяржавы Беларусі і Расеі ды застацца прэзыдэнтам; 4) абраць пераемніка. На сёньня ўсе гэтыя варыянты рэальныя. Першы варыянт вельмі дрэнны для легітымнасьці: Расея аўтаматычна афіцыйна ператвараецца ў краіну трэцяга сьвету, што цягне за сабой выхад з G8, страту надзеі на адраджэньне ўплыву і гэтак далей. Другі варыянт рэальны, і яго яшчэ не адкінулі. Трэці варыянт рэальны, але тут ёсьць такія ж хібы, як і пры першым варыянце, калі ня большыя, і ён можа працаваць толькі пры аўтаматычным «кіданьні» Лукашэнкі пасьля далучэньня Беларусі да Расеі. Гэты варыянт таксама небясьпечны для расейскага фэдэралізму, бо можа яго проста ўзарваць. Апошні варыянт таксама цалкам рэальны, але тады прыйдзецца сыходзіць з улады і дамаўляцца. Мне здаецца, што варыянт з саюзнай дзяржавай найбольш дрэнны для Пуціна, але гэта не азначае, што ён яго не разглядае, хоць ён яго можа разглядаць з тактычнымі мэтамі ў кантэксьце праблемы 2006 году для Лукашэнкі.

Для Лукашэнкі варыянтаў ня так шмат. 1) Проста «элегантна» ісьці на трэці тэрмін а-ля канстытуцыйны рэфэрэндум 2004-га. 2) «Апгрэйдзіцца» ў нейкі другі фармат у саюзнай дзяржаве. 3) Знайсьці пераемніка. Лукашэнка страціў найлепшы варыянт для свайго становішча — ператварыць Беларусь у інстытуцыйную аўтакратыю і стаць на чале дамінантнай партыі, а-ля Малайзія ў нядаўнім мінулым ці, можа, нават Мэксыка — для Эўропы гэта магло б выглядаць больш легітымна і прымальна, гэта выглядала б як дэмакратызацыя з хібамі, хоць ёй і не зьяўлялася б. Гэта не выглядала б так брутальна, як цяпер. Асноўная праблема Лукашэнкі ў тым, што ён у Эўропе. Я ня веру ў трэці варыянт, пры другім варыянце імавернасьць, што яго «кінуць», надзвычай высокая. Застаецца самы прывычны — гэта першы варыянт.

Да якой канфігурацыі прывядуць прэфэрэнцыі Пуціна і Лукашэнкі ўрэшце, ніхто ня ведае — нават яны самі, я думаю. Але пачалася нейкая новая дынаміка, якая незразумела да чаго прывядзе. Няясна і хто каго «кіне», але што гэта адбудзецца, можна быць упэўненым.

Аналёгіі не спрацуюць, будзе нешта якасна новае, не падобнае ні на выбары 2001-га году, ні на выбары ва Ўкраіне. Ні Захад, ні Расея так проста на гэта ўсё ня будуць глядзець. Ні Лукашэнка, ні апазыцыя таксама ўжо ня будуць так проста аглядацца на Захад і Расею. Пакуль самы стабільны фактар ва ўсіх выкладках — гэта, як ні дзіўна, беларускія выбарцы. Але магчымасьць каскадаў грамадзкай думкі заўсёды існуе, як паказала Ўкраіна. Нешта мяняецца, але незразумела пакуль што. Праблема прагнозаў у тым, што яны ніколі не збываюцца.

# Найлепшы варыянт для прэзыдэнта

Апазыцыйны кандыдат, нават не набраўшы большасьці галасоў, у вачах міжнароднай супольнасьці будзе легітымнейшым за Лукашэнку.

18 красавіка Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя — БНФ зьвярнулася да прэзыдэнта з прапановай. «Спадар Лукашэнка», паводле меркаваньня КХП-БНФ, ня мае юрыдычнага права балятавацца на трэці тэрмін, прапанавана падпарадкавацца Закону і ня ўдзельнічаць у чарговых прэзыдэнцкіх выбарах. «Мы зьвяртаем Вашу ўвагу на тое, што ў сьвятле палітычных падзей і тэндэнцый, якія разьвіваюцца ва Ўсходняй Эўропе і Паўночна-Заходняй Азіі, адмаўленьне ад незаконнага ўдзелу ў выбарах ёсьць найлепшым варыянтам асабіста для Вас і таксама для нашай краіны. Выбары прэзыдэнта Беларусі павінны адбыцца ў 2006 г. бяз Вашага ўдзелу», — напісана ў звароце. Яго падпісаў старшыня КХП-БНФ Зянон Пазьняк.

Упершыню ў ходзе перадвыбарнай кампаніі-2006 выразна і ўголас пастаўлена пытаньне пра легітымнасьць самога ўдзелу ў ёй Лукашэнкі. Захад не прызнаў вынікаў рэфэрэндуму-2004. Беларускі апазыцыйны кандыдат, нават і не набраўшы большасьці галасоў, усё роўна ў вачах міжнароднай супольнасьці будзе больш легітымным за Лукашэнку, які «расьпячатае» сваю другую дзесяцігодку на пасадзе. Успрыманьне Лукашэнкі не як афіцыйнага суперніка, а толькі як непазьбежнай перашкоды на шляху да перамогі можа зрабіцца стрыжнёвым пунктам перадвыбарнай кампаніі апазыцыі.

У гэты ж час на сьценах сталічных дамоў зьявіліся невялікія чорна-белыя налепкі з рэзкім тэкстам: «Расейская найміта Лукашэнку пад суд за парушэньне Канстытуцыі, закону, за разбурэньне дзяржавы, за карупцыю, за незаконнае ўтрыманьне ўлады. Хопіць цярпець зьдзек! Ініцыятыва «Беларуская салідарнасьць». Відаць, у актывістаў КХП-БНФ малавата спадзяваньняў на тое, што Лукашэнка прыслухаецца да іх звароту.

**Алесь Кудрыцкі**

# «Ад Кіева да Менску далёка»

Адкрыцьцё прадстаўніцтва Эўракамісіі ў Беларусі заходнія дыпляматы лічаць справай вырашанай. Пасол Латвіі камэнтатару АНТ: вы зашмат глядзіце перадачы свайго тэлеканалу. На прэс-канфэрэнцыі, прымеркаванай да гадавіны пашырэньня Эўразьвязу, прысутнічаў **Віталь Тарас**.

Працяг на старонцы 10.

# Фралоў за Мілінкевіча

Працяг са старонкі 2.

## Прыклад акадэмікаў

Апроч двух лідэраў, вынікі галасаваньня, безумоўна, пацешылі С.Калякіна, але не маглі асабліва задаволіць А.Лябедзьку, які, дарэчы, сам адсутнічаў.

Выступіць на канфэрэнцыі далі таксама аднаасобнікам — Аляксандру Вайтовічу, Уладзімеру Коласу і гарадзенцу Валер'ю Фралову. Гаварылі яны па дзесяць хвілінаў, як і ўсе астатнія.

А.Вайтовіч сказаў, што ягоная мэта — зьмена палітычнай сытуацыі ў краіне. Умовы для гэтага існуюць, бо шырокія слаі насельніцтва не задаволеныя цяперашнімі парадкамі. А.Вайтовіч прывёў прыклад агульнага сходу Акадэміі навук, які адбыўся ў мінулы чацьвер. На ўдзельнікаў быў аказаны жорсткі прэсінг, каб навязаць зьмены ў статуце акадэміі. Аднак удзельнікі не пабаяліся, адкрытым галасаваньнем выказаліся супраць. Але, падкрэсьліў выступоўца, неабходна скалануць грамадзтва і знайсьці згоду паміж усімі прэтэндэнтамі, якія хочуць выступіць кандыдатамі.

## Воплескі генэралу

У.Колас сказаў, што адчувае сябе крыху няёмка, бо не падпісаў агульнай заявы прэтэндэнтаў. Але, мяркую, мы павінны адрозьнівацца ад рэжыму, які робіць прэсінг на тых, хто ня зь ім. Чаму яны, незалежныя кандыдаты, ня маючы структур, усё ж ідуць у кампанію? Бо, на ягоную думку, у прадстаўнікоў партый няма вялікіх шанцаў на выбарах. Коласава пазыцыя: трэба шукаць фігуру нэўтральную, якая будзе выклікаць сымпатыі ўсяго грамадзтва. У.Колас прыгадаў, што на мінулых выбарах гарадзенцы далі аднаго з важкіх кандыдатаў… Далей ён сказаў, што, можа, пацісьне руку таму, хто з кандыдатаў выйдзе наперад, але магчыма, што яму самому працягнуць руку. «Будзем разам, і мы пераможам, — скончыў У.Колас. — Жыве Беларусь!»

«Крыху дзіўна ў якасьці госьця выступаць у родным горадзе», — пачаў генэрал Валеры Фралоў. Ён сказаў, што добра ведае А.Мілінкевіча, і заклікаў дэлегатаў галасаваць за яго. Удзельнічаць у выбарах паводле дзейнага кодэксу бессэнсоўна, лічыць В.Фралоў, таму ён паспрабуе ініцыяваць рэфэрэндум аб зьмене выбарчага заканадаўства. «Гадзіць, груба кажучы, нікому не зьбіраюся, — сказаў В.Фралоў, — хаця ў палітыцы сяброў няма». Ён сказаў, што намерваецца сур'ёзна працаваць. Дарэчы, генэрал першым атрымаў воплескі ўдзельнікаў канфэрэнцыі.

## Зломкаў аддзяліць

У кулюарах генэрал Фралоў сказаў, што бачыць трох чалавек, здольных перамагчы Лукашэнку. Аднак, на ягоную думку, гэтыя трое маюць мала шанцаў на вылучэньне адзіным кандыдатам на Нацыянальным кангрэсе. Але калі хтосьці з гэтых трох пройдзе, генэрал Фралоў гатовы працаваць на яго.

С.Шушкевіч заклікаў вылучыць тых людзей, якія маюць большую імавернасьць выбраньня, а ня тых, хто падабаецца табе асабіста. Ён таксама заклікаў «зломкаў, недацёп аддзяліць», выкрасьліць зь бюлетэняў. Каб на кангрэсе былі тыя, хто ня будзе псаваць… С.Шушкевіч не пагадзіўся з тымі, хто асуджае партыі. Паколькі ўсе рэпрэсіі — на іх, бо яны адкрыта змагаюцца за ўладу і іх становішча цяжкае. Ён сказаў, што пра сябе гаварыць ня будзе, і зазначыў, што яму спадабаўся выступ А.Вайтовіча. На агульным сходзе Акадэміі сам С.Шушкевіч ня быў, але яму даспадобы, што яго ўдзельнікі фактычна выказалі адкрыты пратэст.

А.Мілінкевіч прызнаўся, што адчувае сябе сярод гарадзенцаў больш упэўнена. Ён зрабіў экскурс у 2001 год — тагачасныя прэзыдэнцкія выбары сталі выдатнай школай. Перад імі была створана ва ўсіх абласьцях кааліцыя «Рэгіянальная Беларусь». А.Мілінкевіч прызнаўся, што сёлета аб'ехаў усю Беларусь.



WWW.UCPB.ORG

**КАНДЫДАТЫ, ЯКІЯ ЯНЫ ЁСЬЦЬ.** Колас, Калякін, Мілінкевіч і Шушкевіч на гарадзенскай перадвыбарчай канфэрэнцыі.

## Пераходная фігура

Замест адсутнага з паважнай прычыны А.Лябедзькі выступаў Станіслаў Багданкевіч. Ён у пэўнай ступені рэклямаваў А.Лябедзьку, гаворачы, што той выступае супраць рэжыму «з адкрытым забралам», спрабуе адстойваць дэмакратычныя пазыцыі на міжнароднай арэне, а таксама дбае пра тое, каб ізаляваць рэжым. «Ня столькі інтэлектуал патрэбен, колькі баец, трыбун, публіцыст», — гаварыў С.Багданкевіч. Ён яшчэ зазначыў, што гэта павінна быць «пераходная фігура». «Мне падабаецца Лябедзька, бо чысты інтэлігент мае менш шанцаў на перамогу», — працягваў выступовец. Ён, праўда, адзначыў, што на кангрэс трэба вылучыць некалькіх кандыдатаў, і яшчэ раз нагадаў, што А.Лябедзька «гатовы да самаахвярнасьці, да барацьбы». Дарэчы, на канфэрэнцыі раздавалі друкаваны зварот А.Лябедзькі да дэлегатаў, а таксама ягоны буклет. Можа, гэта якраз спрацавала адваротным чынам.

Свой нядоўгі выступ самавылучэнец дацэнт зь Менску Валеры Арцішэўскі скончыў словамі аб тым, што ён «гатовы ў імя таго, каб мара ператваралася ў рэальнасьць, працаваць на любога кандыдата».

## Кангрэс пад адкрытым небам

Апошнім выступаў Сяргей Калякін. Ён зазначыў, што краіну і народ могуць выкінуць на абочыну гісторыі.

«А.Лукашэнка разважае пра тое, ці будзе ён кіраваць у 2015 годзе. Наша задача — каб ён перастаў кіраваць у 2006 годзе», — падкрэсьліў С.Калякін. На яго думку, большасьць насельніцтва жадае выбраць іншага чалавека. Але ажыцьцявіць гэта будзе «па сілах супольнаму кулаку дэмакратычных сіл». Ён мяркуе, што 80% дэмакратычных сіл уцягнуты ў працэс і, калі нават 50% будуць працаваць на адзінага кандыдата, будзе магчымасьць перамагчы. С.Калякін зазначыў, што лепшых правілаў для выбарчай кампаніі ня варта чакаць, бо Лукашэнка «не самагубца». Але, «каб лукашызм скончыўся, трэба пераступіць цераз партыйныя прыхільнасьці». Кіраўнік ПКБ, дарэчы, таксама атрымаў воплескі. Не ў апошнюю чаргу таму, што нагадаў пра досьвед КПЗБ і партызанаў — асабліва калі Нацыянальны Кангрэс будзе праводзіцца напаўлегальна.

Усе ўдзельнікі гаварылі пра тое, што Кангрэс дэмакратычных сілаў неабходна правесьці чым хутчэй, і не пазьней за ліпень—жнівень — каб мець час на раскрутку адзінага кандыдата. Пагатоў, калі давядзецца праводзіць кангрэс дзесьці пад адкрытым небам, нельга цягнуць да халадоў і дажджоў.

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### ПДВ павысяць

Урад абмяркоўвае магчымасьць значнага павышэньня ПДВ. Цяпер гэты падатак складае 18%. Пры гэтым падаткі з абароту будуць зьніжаны. Зробяць гэта для таго, каб захаваць аб'ём цэнтралізаваных сродкаў, якія ідуць на выкананьне амбітных дзяржаўных праграм. Новы прынцып спагнаньня ПДВ паводле краіны прызначэньня, мяркуюць ва ўрадзе, «развязваў рукі» Беларусі: цяпер падатак спаганяецца не з экспартэраў беларускай прадукцыі, а зь мясцовых імпартэраў расейскага тавару.

### Рухавікі на ўсход

Горкаўскі аўтамабільны завод (ГАЗ) ды Паўлаўскі аўтамабільны завод (ПАЗ) сёлета значна павялічаць аб'ёмы закупак беларускіх рухавікоў, вырабленых на Менскім маторным заводзе. ГАЗ павялічыць закупкі прадукцыі ММЗ на дзьве трэці, ПАЗ — у паўтара разу. Сам ММЗ сёлета выпусьціць 90 тыс. рухавікоў — на 15 тысяч больш, чым летась.

### Трыюмф МАЗу

Аўтапоезд новага пакаленьня МАЗ-5440 названы найлепшым грузавіком 2005 году ў Расеі. Беларуская машына атрымала такое прызнаньне па выніках прэстыжнага конкурсу, які прайшоў у рамках выставы «Камэрцыйны аўтатранспарт-2005» 25—26 красавіка ў Маскве.

### Саветызацыя бізнэсоўцаў

Саўмін прыняў палажэньне пра «саветы» індывідуальных прадпрымальнікаў. Мясцовыя ўлады павінны да 1 чэрвеня правесьці адпаведныя арганізацыйныя сходы. У кожным савеце будзе ад трох да сямі актывістаў, якіх будуць выбіраць тайным галасаваньнем на агульных сходах прадпрымальнікаў. Аб'яднаньне прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва» бачыць у гэтым спробу стварыць кішэнную альтэрнатыву свабодным прафсаюзам прадпрымальнікаў.

### Прад'явіце дакумэнты!

Урад зацьвердзіў пералік дакумэнтаў, якія індывідуальныя прадпрымальнікі павінны прад'яўляць кантрольным органам. У сьпісе 31 пункт. Раней такога пераліку проста не існавала, праз што нярэдка ўзьнікалі канфлікты падчас праверак. Адзіная палёгка: ня ўсё з таго 31 дакумэнту трэба заўсёды трымаць пад рукой на выпадак раптоўнага візыту кантралёраў — некаторыя могуць запатрабаваць толькі афіцыйным лістом.

### Пошліны на нафту

У Беларусі экспартныя пошліны на большасьць нафтапрадуктаў павялічаны з $45,4 да $68,2 за тону. Экспартная пошліна на мазут засталася на ўзроўні $45,5. У рамках правядзеньня ўніфікацыі і стварэньня адзінай сыстэмы тарыфнага і нетарыфнага рэгуляваньня ў саюзнай дзяржаве Беларусь павінна ўсталёўваць стаўкі вывазных мытных пошлін на ўзроўні расейскіх.

**АК, АФН, Інтэрфакс**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 28 красавіка:**
1 амэрыканскі даляр — 2 151 рубель.
1 эўра — 2 780,92 рубля.
1 латвійскі лат — 3 995,17.
1 літоўскі літ — 808,22.
1 польскі злоты — 656,64.
1 расейскі рубель — 77,36.
1 украінская грыўна — 428,91.

**Паводле Нацбанку**

# Без сумневу

Першае, што бачыць кожны, хто ўваходзіць у офіс **Кандалізы Райс**, — вялікае каляровае фота, на якім яна стаіць на сцэне разам са знакамітым віялянчэлістам Ё–Ё Ма. Іх рукі счэпленыя і ўзьнятыя ўгару ў знак трыюмфу. Яны прымаюць авацыі публікі пасьля супольнага выкананьня санаты Брамса ў вашынгтонскай канцэртнай залі «Constitution Hall». На стале ў Райс — чатыры да бляску працёртыя скрынкі, на якіх пазначэньні: «аналітыка», «адаслаць», «прачытаць» ды «неадкладна зрабіць», а за імі — невялічкае настольнае люстэрка на падстаўцы. Партрэт дзяржсакратаркі ЗША аўтарства **Нікаласа Лімана** з часопісу «Ньюёркер».


WWW.KEYNEWS.ORG

**Райс ніколі не была замужам, у яе няма братоў ды сясьцёр, а бацькі ўжо адышлі ў лепшы сьвет. Буш і праца ўяўляюць вялікую частку яе жыцьця. Вашынгтон мучыцца ў здагадках: хто на каго ўплывае? Райс на Буша ці Буш на Райс?**

Райс — выканаўца. Яна пачала вучыцца музыцы з трох год, а ўпершыню зьявілася перад публікай, калі ёй было чатыры.

«І я грала шмат, пакуль мне ня споўнілася дзесяць. Тады, зусім раптоўна, я перастала быць маленькім прыгожанькім дзіцем. Мне сапраўды абрыдла піяніна, і я захацела кінуць гэты занятак. Але мая маці сказала: «Ты яшчэ занадта маленькая, каб прыняць такое рашэньне». І я вельмі рада, што яна не дазволіла гэтага зрабіць. Бо тады, калі я зусім сьвядома вырашыла адмовіцца ад музычнай кар’еры, я ўжо магла выканаць усё, што хацела».

У першыя выходныя пасьля тэрарыстычнай атакі на ЗША, калі найвышэйшыя чыноўнікі сабраліся ў Кемп-Дэвідзе, каб абмеркаваць захады ў адказ, Райс ды генпракурор Джон Эшкрафт падымалі дух калег ігрой на піяніна ды традыцыйнымі амэрыканскімі песьнямі.

Нярэдка нядзельнымі раніцамі Райс можна ўбачыць у якасьці госьці тэлевізійных ток-шоў, дзе яна, як заўжды красамоўна і дакладна, тлумачыць прынцыпы замежнай палітыкі Джорджа Буша.

Райс любіць шопінг ды апранаецца даволі стыльна, нават, як на вашынгтонскі стандарт, сьмела. Яна носіць яркія строі, спадніца — зазвычай крыху вышэй калена. Час ад часу яна фатаграфуецца ў сукенках з аголенымі плячыма для модных часопісаў. «Шэўрон», каліфарнійская нафтавая кампанія, дзе яна працавала ў радзе дырэктараў да таго, як зрабілася дарадцай па пытаньнях нацыянальнай бясьпекі, назвала ў гонар Кандалізы адзін са сваіх танкераў.

Райс умее выступаць — і ў гэтым разгадка яе імклівага кар’ернага ўздыму. Яна зрабіла першы крок у вялікую палітыку падчас вячэры, якая адбылася пасьля сэмінару для маладых выкладчыкаў Стэнфардзкага ўніверсытэту ў 1984 г. Імпрэзу наведаў Брэнт Скаўкрафт, кіраўнік камісіі па стратэгічных узбраеньнях пры прэзыдэнце Рэйгане. Маладзенькая Райс уступіла зь ім у спрэчку, і так удала, што Скаўкрафт прымеціў яе ды пачаў рыхтаваць да палітычнай кар’еры, запрашаючы на сэмінары і ладзячы сустрэчы з «патрэбнымі людзьмі». Зрабіўшыся ў 1989 г. дарадцам па пытаньнях нацыянальнай бясьпекі, Скаўкрафт паставіў Райс кіраваць тым дэпартамэнтам Рады нацыянальнай бясьпекі, які адказваў за дачыненьні з Савецкім Саюзам. Праз дзесяць год яна ўжо сама ўзначаліла каманду дарадцаў Джорджа Буша па пытаньнях замежнай палітыкі, якая атрымала мянушку «Вульканы».

На кожны выступ Кандаліза Райс прыходзіць узброеная вялізнай масай дэталяў, якія яна трымае ў галаве і можа падаць у простай, зразумелай форме. Любы адказ яна выдае ў выглядзе акуратнага пакуначка ўпэўненасьці ды цьвёрдых перакананьняў.

Перад тым як адказаць на пытаньне, Райс робіцца падобнай да фігурысткі (фігурнае катаньне — яшчэ адно захапленьне яе маладосьці), якая прыгадвае праграму сёньняшняга дня спаборніцтваў, зьлёгку хітае галавой — маўляў, «Ага, зразумела», — а потым дае грунтоўны адказ.

У Вашынгтоне нішто ня мае такой вагі, як блізкасьць да прэзыдэнта. І Райс, відавочна, найбольш блізкі да яго чалавек, прынамсі, калі зыходзіць з часу, які яна праводзіць разам зь ім. Яна ня толькі дае яму справаздачу кожную раніцу, наведвае шэраг пратакольных сустрэч зь ім кожны тыдзень і мае зь ім працоўныя гутаркі некалькі разоў на дзень. Яна вельмі часта бавіць выхадныя разам з Бушам на яго ранча ў Кроўфардзе (Тэхас). Райс, якая шчыра падзяляе прэзыдэнцкую любоў да спорту, асабліва да амэрыканскага футболу, нярэдка праводзіць з прэзыдэнтам доўгія гадзіны паза працоўным часам. Вашынгтон мучыцца ў здагадках: пра што яны так доўга размаўляюць? Хто на каго ўплывае?

Але Райс пра гэта нічога не раскажа. Нават у сваім невялікім коле сяброў, калі гаворка заходзіць пра палітыку Адміністрацыі, яна кажа тое самае, што і з тэлеэкрану. Хіба што ў такія моманты яна больш адкрыта выказвае сваё захапленьне прэзыдэнтам. «Я не магу знайсьці таго архімэдавага пункту апоры, які мог бы перакуліць любоў Райс да Буша», — гаворыць адзін зь яе сяброў.

> Райс абсалютна верыць у тое, што кожны чалавек можа адолець уласныя слабасьці.

Для Райс, якая ніколі не была замужам, у якой няма братоў ды сясьцёр, чые бацькі ўжо адышлі ў лепшы сьвет, Буш і праца ўяўляюць вельмі вялікую частку яе жыцьця. У яе ёсьць невялічкае кола старых сяброў ды родных, але большасьць зь іх жывуць на поўдні ці ў Каліфорніі. Яна — нетыповы вашынгтонскі чыноўнік. Яе дом — па-спартанску мэбляваная кватэра ў жыльлёвым комплексе Ўотэргейт. Выступы Райс — гэта выступы Буша, які атрымаў талент прамоўцы.

Кандаліза Райс нарадзілася ў мястэчку Бірмінгем, штат Алабама, у 1954 г. Гэтае імя прыдумала яе маці — яно паходзіць ад італьянскага музычнага тэрміну con dolcezza. Райс жыла ў субкультуры, якая цяпер зьяўляецца аб’ектам вялікай настальгіі сярод афраамэрыканцаў, — у стабільнай, веруючай, арыентаванай на сямейныя каштоўнасьці паўднёвай сярэдняй клясе, у часы, калі пакуль барацьбы за правы чарнаскурых ужо адчуваліся, але яшчэ не перарасьлі ва ўраган.

Райс часта гаворыць пра тое, што яе бацькі казалі ёй: «Ты можаш зрабіцца прэзыдэнткай», — у часы, калі чорныя яшчэ нават ня мелі права галасаваць на выбарах. Райс настолькі цьвёрда верыць у тое, што чалавек можа сам адолець любыя ўласныя слабасьці і абмежаваньні, што яе амаль абражае сама магчымасьць таго, што дзеяньні іншых людзей ці дзяржавы таксама неяк паўплывалі на яе жыцьцё. У асабістым кодэксе паводзінаў Райс строга забаронена жаліцца на расізм, зь якім даводзіцца сутыкацца, ці прасіць нечага толькі на падставе колеру сваёй скуры.

Спачатку Райс была дэмакраткай па перакананьнях. Упершыню яна завагалася тады, калі ў 1980 прэзыдэнт-дэмакрат Джымі Картэр сказаў, што ён «шакаваны ўварваньнем Савецкага Саюзу ў Аўганістан». Сама Райс была шакаваная тым, што гэта магло некага шакаваць. Дзіва, што ў выніку яна апынулася ў лягеры Джорджа Буша, які рыхтаваўся да сваёй пераможнай прэзыдэнцкай кампаніі.

У студзені 2000 г. яна надрукавала артыкул у часопісе «Foreign Affairs», які быў адразу ўспрыняты як шаблён для будучай замежнай палітыкі адміністрацыі Буша. Райс выказала нездаволенасьць клінтанаўскай палітыкай «нацыебудаўніцтва» ў такіх малазначных краінах, як Гаіці, Самалі ці Босьнія. Кандаліза прапанавала зноў сфакусавацца на вялікім палітычным гандлі паміж звышдзяржавамі.

Аднак праз нейкі час Райс адмовілася ад гэтых перакананьняў ды перайшла на бок палітычных маралістаў. Яна пачала сьцьвярджаць, што спаборніцтва паміж звышдзяржавамі — справа мінулага, бо яны цяпер маюць супольныя мэты (у сэнсе, мэты, супольныя з амэрыканскімі).

У 2002 г. офіс Райс выдаў дакумэнт, названы «Стратэгіяй нацыянальнай бясьпекі». Згодна зь ім, існуе адзіная абгрунтаваная мадэль нацыянальнага посьпеху — амэрыканская, якая «падыходзіць для кожнага чалавека, для кожнага грамадзтва». Паводле Райс, існуюць «краіны, што адхіляюцца», — тыя, якія падтрымліваюць тэрарызм, не выконваюць міжнародных пагадненьняў і не зьяўляюцца дэмакратычнымі. «Ня кожная нацыя, што адхіляецца, мусіць быць аб’ектам вайсковага ўзьдзеяньня. Усё залежыць ад абставін». Колькі тых краін? «Ня многа і ня мала. Іх ня тры, як у «восі зла», але іх і не дзясяткі». Ці ёсьць краіна, якая адхіляецца, але якую ЗША не паспрабуюць зьмяніць, бо яна не ўяўляе для іх пагрозы? «Я ня думаю, што на плянэце ёсьць месцы, дзе няма сэнсу спрабаваць нешта зрабіць. Існуе шмат магчымасьцяў. Ня думаю, што гэта сумленна — пакідаць няшчасных жыхароў дыктатарскіх краін сам-насам зь лёсам».

# Як выжыць у чарнобыльскім раёне

Знадворны радыяцыйны фон блізкі да натуральнага. Радыянукліды цяпер трапляюць у чалавечы арганізм пераважна зь ежай — праз садавіну і гародніну, мяса і малако. Як уберагчыся ад радыяцыі сёньня?

Пра гэта й ішла гаворка на круглым стале «Гуманітарныя праблемы Чарнобыльскай аварыі», зладжаным Фондам спрыяньня лякальнаму разьвіцьцю. Вёў круглы стол Аляксандар Мілінкевіч.

Кандыдат біялягічных навук, чалец-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі геранталёгіі Ларыса Талькоўская зазначыла, што ўлады маюць рацыю, калі гавораць, што ў забруджаных раёнах можна весьці гаспадарку. Але пры гэтым трэба ўлічваць некалькі момантаў.

1. Масла не ўтрымлівае радыянуклідаў (у адрозьненьне ад сыроваткі, якая набірае іх найбольш) — значыць, трэба вырабляць масла, сыр (клінковы), тварог.

2. Не набірае радыянуклідаў і алей, таму на адзначаных тэрыторыях можна вырошчваць тэхнічныя культуры (рапс).

3. Радыянукліды не пагражаюць меданосным культурам.

4. У забруджаных раёнах трэба ўжываць толькі завозныя арганічныя ўгнаеньні.

5. Свойскую жывёлу, прызначаную на мяса, перад забоем трэба на працягу двух месяцаў трымаць у стойле на чыстым корме, каб вывесьці з арганізму радыянукліды.

«Іначай складаецца ўражаньне, што чалавек пайшоў не ад Адама, а ад Сызыфа», — рэзюмавала Л.Талькоўская. Бо колькі ні дбай пра вызваленьне ад радыянуклідаў, але ж ад іх не пазбавішся, пакуль спажываеш заражаныя прадукты.

Не абмінуў праблему харчаваньня і чалец-карэспандэнт НАНБ, прафэсар Іван Нікітчанка. Ён згадаў, што ў канцы 1980-х «нават мяса ў чарнобыльскія раёнах прывозілі з Галяндыі». Цяпер жа, кажа Нікітчанка, прадукцыя, выробленая ў чарнобыльскіх раёнах, не абавязкова ўся забруджаная, але ніхто ня дбае аб праверцы. Ступень пераходу радыянуклідаў у расьліны, паводле ягоных слоў, залежыць ад вільготнасьці глебы, яе складу, структуры: «На тарфяна-балоцістай глебе пры шчыльнасьці забруджаньня 1 кюры/км² выходзіць «брудная» прадукцыя: яна бярэ ўсё з глебы адзін да аднаго. Глiністая глеба забірае частку нуклідаў. Сёньняшняе адвольнае вывядзеньне нейкіх тэрыторый зь ліку забруджаных абсалютна ня мае ніякай падставы».

Адзінае, што можа выратаваць здароўе наша і будучых пакаленьняў, — гэта прымусіць уладу лічыцца з грамадзтвам.

На жаль, пакуль гэта выглядае добрым пажаданьнем. Улада, як адзначыў Аляксандар Мілінкевіч, «манапалізавала» вырашэньне Чарнобыльскай праблемы і не імкнецца да дыялёгу з грамадзтвам. Гэта ж пацьвердзіла кіраўніца ліквідаванага жаночага ГА «Ініцыятыва» Галіна Скараход: у Чарнобыльскай зоне дазволена дзейнічаць толькі праўладным грамадзкім арганізацыям. Улады не дазвалялі зарэгістравацьу Брагіне да 2003 г. ніводную грамадзкую ініцыятыву. Першая грамадзкая арганізацыя (вядома, праўладная) зьявілася толькі таму, што пад яе выдаткаваў грошы швайцарскі бок.

**Аркадзь Шанскі**

# Абраза Караля

Над супрацоўнікамі газэты «Згода» навісла пагроза крымінальнае справы — паводле слыннага арт.368 КК «Абраза прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі». Піша **Аркадзь Шанскі**.

Падставай для гэтага сталі вынікі ператрусу, якія наладзілі 24 сакавіка ў рэдакцыі газэты міліцыянты й невядомыя ў цывільным, што не захацелі назвацца. Нібыта на падставе вуснай (!) скаргі аднаго з суседзяў на «неправамерныя дзеяньні» міліцыянты бяз санкцыі ўварваліся ў прыватную кватэру, дзе месьцілася рэдакцыя, і канфіскавалі рэдакцыйныя кампутары й каляжы, разьвешаныя на сьценах.

Галоўны рэдактар газэты Аляксей Кароль напісаў скаргу ў пракуратуру Партызанскага раёну. Але з адказу пракурора Раманоўскага даведаўся, што не міліцыянты парушылі закон, а сам ён можа стаць фігурантам крымінальнай справы. Як засьведчыў пракурор, экспэртыза выявіла, што «публічная дэманстрацыя ўказаных каляжаў можа быць кваліфікаваная як злачынства, прадугледжанае ч.1 арт.368 КК». Таму, маўляў, і кампутары затрымалі: каляжы маглі вырабляць на іх. Як у прыватнай кватэры можна наладзіць публічную дэманстрацыю, пракурор растлумачыць не захацеў.

Кароль паскардзіўся ў гарадзкую пракуратуру, патрабуючы прыцягнуць да адказнасьці, прынамсі, трох міліцыянтаў, чые імёны ўдалося высьветліць, — участковага Пятроўскага і супрацоўнікаў апэратыўна-сьледчай групы Кірылу Новікава й Дзьмітрыя Елісеевіча.

Кіраўнік цэнтру прававой дапамогі пры ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Міхаіл Пастухоў перакананы, што крымінальную справу супраць блізкай да сацыял-дэмакратаў «Згоды» «замовілі». Ахвярай можа стаць галоўны рэдактар Кароль ці рэдактар Алесь Зьдзьвіжкоў.

Сам Кароль кажа, што вялікага энтузіязму сярод міліцыянтаў і работнікаў пракуратуры не назірае. Ён думае, што яны ня дужа хочуць выконваць такія брыдныя заданьні.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Лідэр «Маладога фронту» Зьміцер Дашкевіч у судзе, найперш апрануў прынесены сябрамі пухавік — затрыманых трымалі ў халодным РУУСе. За ўдзел у «Чарнобыльскім шляху» 26 красавіка З.Дашкевіч атрымаў дванаццаць сутак арышту.**

## СЬЦІСЛА

Міністэрства інфармацыі вынесла 13 красавіка папярэджаньне недзяржаўнай газэце **«Народная Воля»**. У міністэрстве палічылі, што ў публікацыі «Віртуальная вайна ўнучкі з бабуляй» за 3 сакавіка былі апублікаваныя не завершаныя вытворчасьцю матэрыялы судовай справы безь пісьмовага дазволу судзьдзі. А зварот да воінаў-інтэрнацыяналістаў лідэра руху імя Юр'я Захаранкі «Абаронцы Айчыны» Алега Волчака 31 сакавіка міністэрства кваліфікавала як распаўсюджваньне інфармацыі ад імя незарэгістраванага аб'яднаньня.

Недзяржаўная газэта **«Вольнае Глыбокае»** атрымала папярэджаньне 15 красавіка за зьмену мовы (беларуская й расейская замест беларускай) без інфармаваньня органу рэгістрацыі, парушэньні ў выходных зьвестках і публікацыю рэклямных абвестак пра ліцэнзаваныя віды дзейнасьці без указаньня нумару ліцэнзіі.

15 красавіка папярэджаньне атрымалі й недзяржаўныя **«Борисовские новости»**, бо не паведамілі пісьмова пра зьмену тэрыторыі распаўсюджваньня, выкарыстоўвалі нестандартныя шрыфты (sic!), дапускалі памылкі ў выходных зьвестках і зьмяшчалі рэклямныя абвесткі без указаньня ліцэнзіі.

9000 асобнікаў кнігі «Выпадковы прэзыдэнт», затрыманых міліцыянтамі ў віцебскага прадпрымальніка **Барыса Элькіна**, канфіскаваныя на карысьць дзяржавы. Так вырашыў 18 красавіка Віцебскі абласны гаспадарчы суд.

Крымінальная справа ў дачыненьні да **Паўла Севярынца** і **Міколы Статкевіча** ў сувязі з вулічнымі маніфэстацыямі ў кастрычніку 2004 г. перададзеная 18 красавіка ў суд Ленінскага раёну Менску.

19 красавіка **прафсаюз РЭП** атрымаў ад Міністэрства юстыцыі адказ: міністэрства адтэрмінавала рэгістрацыю зьмен і дапаўненьняў у статут РЭП, запатрабаваўшы тлумачэньняў, які род дзейнасьці яднае сяброў арганізацыі. Праект зьмен прафсаюз накіраваў у Мінюст у сакавіку; сярод іншага прадугледжвалася магчымасьць уступленьня ў РЭП работнікаў розных галін прамысловасьці.

Суд Дарагічынскага раёну пакараў актывіста ПБНФ журналіста недзяржаўнай газэты «Для вас» **Мікалая Брыча** на 2,7 млн руб. паводле пазову старшыні й сяброў участковай выбарчай камісіі. Падчас леташніх парлямэнцкіх выбараў ён, як цьвердзіць Брыч, стаў сьведкам парушэньняў на выбарчых участках з боку нецьвярозых прадстаўнікоў камісіі. Выдалены з участку журналіст напісаў скаргу пракурору, але пад мэдагляд патрапілі зусім іншыя сябры камісіі. Абвінавачаныя ў п'янстве прадстаўнікі камісіі й падалі ў суд на Брыча.

У Полацкім унівэрсытэце 21 красавіка прарэктары затрымалі падчас распаўсюджваньня студэнцкага бюлетэню «Макасін» студэнтаў **Вольгу Семенчукову** і **Алега Вяжэвіча**.

У Аршанскім пэдкаледжы падчас распаўсюджваньня бюлетэню незарэгістраванага «Маладога фронту» «Моладзь — ЗА» і буклетаў ЗБС 21 красавіка затрыманы кіраўнік мясцовай Рады моладзевых арганізацый **Ігар Казімірчак**. Яго затрымалі пэдагогі, якія й выклікалі міліцыю.

21 красавіка Мінюст паведаміў, што тэрмін пераводу **аргструктур партый і грамадзкіх арганізацый** з жылога ў нежылы фонд падоўжаны да 1 чэрвеня. Загад падпісаны міністрам юстыцыі Віктарам Галаванавым яшчэ 5 красавіка.

У Менску 22 красавіка сьпярша на тры гадзіны, а потым на трое сутак за арганізацыю акцыі 25 сакавіка затрыманы **Андрэй Клімаў**: на яго заведзена крымінальная справа паводле арт.342 КК (арганізацыя групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак, або актыўны ўдзел у іх). Падчас затрыманьня міліцыянты згубілі ягоны пашпарт. Тэрмін затрыманьня 25 красавіка першы намесьнік пракурора Менску Мікалай Старавойтаў падоўжыў на дзясяцера сутак. На Клімава заведзена яшчэ адна крымінальная справа — за паклёп і абразу прэзыдэнта; судовае пасяджэньне па ёй прызначана на 19 траўня.

Падчас распаўсюджваньня незалежнай газэты «Выбар» 22 красавіка ў СШ №19 Менску затрыманыя актывісткі незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Натальля Вушка** й **Алена Копач**. Міліцыянтаў выклікала завуч. На іх склалі пратаколы за распаўсюд выданьня без выходных зьвестак.

Машыну, на якой вярталіся ў Беларусь удзельнікі сустрэчы з Кандалізай Райс — **Людміла Пеціна**, **Сьвятлана Калінкіна** й **Гары Паганяйла**, мытнікіператрасалі больш за гадзіну.

За вывешваньне бел-чырвона-белага сьцяга насупраць прэзыдэнцкай рэзыдэнцыі 22 красавіка затрыманы актывісткі «Зубра» студэнткі **Ала Ковач** і **Надзея Носік**. Міліцыянты затрымалі іх, калі дзяўчаты пакідалі дах, але неўзабаве адпусьцілі, бо ня мелі доказаў.

25 красавіка 15 чалавек прайшлі галоўнай вуліцай Горадні. Яны ўсклалі кветкі каля памятнай мясьціны пад аблвыканкамам. За акцыяй сачылі супрацоўнікі міліцыі, людзі ў цывільным і тэлеапэратары. Шэсьце прысьвячалася падзеям 25 красавіка 1999 г., калі некалькі дзясяткаў маладых людзей у камуфляжнай форме з запаленымі паходнямі прайшлі па вуліцах гораду, пратэстуючы супраць падпісаньня саюзных пагадненьняў паміж Беларусьсю і Расеяй. Удзельнікі той дэманстрацыі былі жорстка зьбітыя АМАПам. Сёлета абышлося без затрыманьняў.

Суполцы **Свабоднага прафсаюзу мэталістаў** прадпрыемства «Лёс» (г.Барань Аршанскага раёну) не далі правесьці 23 красавіка дэманстрацыю й мітынг, прысьвечаныя сацыяльна-эканамічным праблемам. Дэманстрацыю проста забаранілі, а мітынг дазволілі ў хваёвым парку, што заяўнікі палічылі за абразу.

У Магілёве 26 красавіка акцыя «Зубра» скончылася затрыманьнямі: у пастарунак трапілі **Андрэй Зайцаў**, **Алег Мяцеліца**, **Максім Дварэцкі**, **Павал Угрыновіч**, **Андрэй Разумкоў**, **Андрэй Палуда**, **Яўген Суvoраў**, **Мікалай Ільін**, **Ганна Петракова**, **Тацяна Янковіч**, **Вольга Рагоўская**, **Валадар Турпанаў**, **Уладзіслаў Харкевіч**, **Уладзіслаў Барodка**.

Дэпутат Луцкага гарсавету (Украіна) **Ігар Гузь** быў зьбіты 26 красавіка ў Менску на Чарнобыльскай акцыі. Сярод затрыманых расейскія журналісты **Аляксей Амет** («Русский Newsweek»), **Міхаіл Раманаў** («Московский комсомолец»).

27 красавіка судзілі затрыманых на Чарнобыльскай акцыі ў цэнтры Менску. Кіраўнік расейскага руху «Якія ідуць бяз Пуціна» **Вадзім Рэзвы** асуджаны на дзясяцера сутак, кіраўнік «МФ» **Зьміцер Дашкевіч** — на дванаццацера сутак, актывіст «МФ» **Сяржук Лісічонак** — на дзясяцера сутак, актывістка АГП **Марына Багдановіч** атрымала 150 базавых велічынь штрафу. Затрыманы былі грамадзяне Расеі **Ільля Яшын**, **Віталь Рэзьнікаў**, **Міхаіл Пермякоў**, **Сямён Бурд**, **Павал Елізараў**, **Ірына Вараб'ёва**, старшыня БПС **Сяргей Высоцкі**, актывісты «МФ» **Артур Фінькевіч**, **Алесь Смольскі**, **Сяржук Мурашка**, **Кірыла Шымановіч**. З нагоды затрыманьня падчас акцыі пяці ўкраінцаў МЗС Украіны накіравала ў Беларусь ноту.

**АШ, Антон Лабовіч, Горадня**

## Талака ў Курапатах

Дзясяткі сяброў Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі — БНФ правялі першую сёлета талаку ў Курапатах. Актывісты зграбалі сьмецьце, рэстаўравалі крыжы, садзілі клюмбы. За зіму зламіліся некалькі крыжоў, пастаўленых паўз дарогу, зьнікла каплічка. Талокі ў нацыянальным нэкрополі будуць ладзіцца праз усё лета.

**МБ**

## Хай ваююць чальцы БРСМ

Верце ня верце, але ў «Палажэньні» аб правядзеньні ваенізаванай дзіцячай гульні «Зарніца» па Віцебскай вобласьці дадзена канкрэтная «ўстаноўка» па фармаваньні камандаў удзельнікаў. Імі могуць стаць вучні 7—8-х клясаў, якія зьяўляюцца чальцамі БРСМ. Вось такая прывілея. Кажуць таксама, што ў ваенкаматах у дапрызыўнікоў і прызыўнікоў патрабуюць дакумэнт, які пацьвярджае такое «членства».
Мо гэта азначае, што гонар служыць у арміі таксама будуць мець толькі «правільныя патрыёты»? Тады хлопцы, якія зьбіраюцца «касіць» ад войска, маюць цудоўныя шанцы — дастаткова толькі ня стаць сябрам БРСМ.

**Антон Бубала, Верхнядзьвінск**

## Зьмены вехаў

Старшыня Наваполацка-Полацкай рэгіянальнай арганізацыі Свабоднага прафсаюзу Беларускага Ўладзімер Антановіч разам з камандай падаў у адстаўку. Сыход ён матываваў нязгодаю зь дзейнасьцю кіраўніцтва СПБ і яго старшыні Генадзя Быкава — кіраўніцтва СПБ, на яго думку, мала ўдзяляе ўвагі рэгіянальным суполкам. Новым кіраўніком полацкай арганізацыі выбраны работнік полацкага ААТ «Полацак-Шкловалакно» Мікола Шарах. На гэтым прадпрыемстве дзейнічае адна з самых вялікіх прафарганізацый СПБ на Полаччыне.

**Васіль Кроква, Полацак**

## Сель у Палачанах

У вёсцы Палачаны паток веснавой вады змыў 20 мэтраў дарогі Маладэчна—Валожын. Звычайна вада ў гэтым месяцы па трубах пад дарогай накіроўваецца ў Бярэзіну. Аднак сёлета яна кілямэтры за два ад месца здарэньня змыла звалку. У выніку гэтага трубы засьмеціліся, і бурная вада расчысьціла сабе дарогу праз гасьцінец.

**«Рэгіянальная газета»**

## Чырвоная плотка

Берасьцейскі рыбак вылавіў у рэчцы Мухавец залатую рыбку. Дакладней, не залатую, а ярка-чырвонага колеру. Іхтыёлягі прызналі, што гэта вельмі рэдкая форма плоткі, якая называецца орфа, альбо чырвоная плотка. Гэта мутант. А розныя мутантныя формы рыб у прыродзе ўзьнікаюць часта, але выжываюць рэдка, толькі ў тых выпадках, калі знаходзяцца ў спрыяльных умовах. Увогуле ў Мухаўцы за апошнія гады зьявілася 4 новыя віды.

**«Брестская газета»**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ЦЯПЕР У ПІЯНЕРЫ заганяюць не 22 красавіка, а 26-га. Менскіх школьнікаў у піянеры і БРСМ урачыста прымалі «старэйшыя браты» з саюзнай Расеі.**

## Давядзеньне непаўналетніх

У першым квартале ў Асіповічах за розныя парушэньні грамадзкага парадку да адказнасьці прыцягнута 106 жыхароў. Сума штрафаў склала 5,853 млн руб.
Найбольшая колькасьць прыцягнута да адказнасьці па артыкуле 160 КааП — давядзеньне непаўналетніх да стану алькагольнага ап’яненьня.

**Рыгор Латышэвіч, Асіповічы**

## Павярніся, Ільліч, на Захад

З прычыны правядзеньня «Дажынак-2005» у Слуцку распачаліся маштабныя работы па абнаўленьні фасадаў і дахаў шматкватэрных дамоў абапал галоўных вуліц ды рэканструкцыя цэнтральнай плошчы. На гэта зь дзяржбюджэту выдзелена звыш 120 млрд руб., што ўдвая болей, чым увесь гадавы бюджэт гораду. Пад знос трапілі на плошчы ня толькі фантаны і кветкавыя клюмбы, а і бронзавы помнік Ільлічу, што стаяў на шасьціметровым пастамэнце. Ільліча перанесьлі цераз вуліцу ягонага імя і паставілі перад уваходам у Дом дзіцячай творчасьці, дзе да перабудовы месьціўся гаркам КПБ. І калі на старым месцы Ленін пазіраў на ўсход, у бок Масквы, то цяпер — на захад, да Эўропы. Праўда, пастамэнт новы невысокі, нейкія два мэтры з гакам, і не такі груваcткі, як раней.
Жыхары гораду паставіліся да такога перасяленьня правадыра пралетарыяту абыякава, затое былі абураны, калі паблізу новага месцазнаходжаньня Ільліча былі сьпілаваныя пад корань пяць прыгожых, нестарых ялін, у тым ліку дзьве срэбраныя, якія, між іншым, стаялі за сьпінаю правадыра.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Зь дзёньніка дэпутаткі Мілешчанкі

У Круглым няма ніводнай установы, якая б абслугоўвала «кветкі жыцьця» круглянцаў. Нават кавярню «Верасок», што задумвалася як дзіцячая, чыноўнікі ператварылі ў піцейную ўстанову, якая працуе толькі ў вячэрні і начны час. Гандлююць сьпіртнымі напоямі і ўсе «пункты» грамадзкага харчаваньня ў дзённы час. Таму ня дзіўна, што побач зь дзецьмі, якія ласуюцца марозівам, можна ўбачыць і п’янага бугая, што купляе пляшку таннага віна і тут жа выпівае.
Пра якое выхаваньне можа ісьці гаворка, калі скрозь і спрэс культывуецца п’янства? У той жа час не рэклямуюцца мясьціны, дзе можна цікава правесьці час разам зь дзецьмі. У кафэ нават няма тэлевізараў — дзеці ня маюць магчымасьці глядзець мультфільмы.
Нядзельная прагулка, якую дэпутат зьдзейсьніла па просьбе мацярок, што маюць малых дзяцей, пакінула горкае ўражаньне, хоць у адной з кнайпаў дэпутатку зь яе мужам абслужылі вельмі ветліва: мужу — сто грамаў гарэлкі, дэпутату — марозіва. Зачыненымі дзьвярамі сустрэў сямейную пару раённы дом культуры, на ўваходзе якога вісіць графік працы, нібы гэта звычайная кантора: з 9 раніцы да 17 гадзін вечара.
Ня дзіўна, што цікава правесьці выхадныя дні бацькам зь дзецьмі проста няма дзе. Ці не таму так «памаладзела» ў Круглым п’янства?

**Зінаіда Мілешчанка, Круглае**

# Украінізацыя

Украінскія тавары шырэй пранікаюць у Беларусь. Кірмаш у Хмяльніцкім цалкам замяніў варшаўскі стадыён. Аўтобусныя паркі павялічваюць колькасьць рэйсаў у гэты ўкраінскі горад, адкуль беларусы цягнуць танныя рэчы. Зь бядотнай суседкі (гаворачы словамі БТ) — у квітнеючую Беларусь. Назірае **Руслан Равяка**.

Разам з тымі рэчамі трапляе да нас і ўкраінская мова. Надпісы па-ўкраінску маюцца на ўсіх таварах, абгортках і пакунках. Прадпрымальнікі ўжо вольна чытаюць на ёй, вельмі хутка вывучыўшы яе без прымусу — дарэчы, як некалі й польскую. Прадавец лёгка чытае і тлумачыць пакупніку кампанэнты парфумы, спосабы ўжываньня шампуню. Нікога ня зьдзівіш украінскімі надпісамі на турэцкіх, кітайскіх прадуктах.

Законы Ўкраіны прымусілі ўкраінізавацца ня толькі заходніх вытворцаў, але і расейцаў. Дарма што на расейскіх каналах плявузгаюць пра забарону вывучэньня расейскай мовы ў Кіеве, амаль на ўсіх таварах расейскага паходжаньня ёсьць украінскія надпісы. Грошы й капітал перамагаюць палітыку. А магчыма, палітыка заплюшчвае вочы на бізнэс, жывячыся з тых самых сродкаў ад продажаў ва Ўкраіне.

Беларускія фірмы таксама хутчэй украінізуюцца, чым беларусізуюцца. Прыклад — пінская запалкі, на пушачках якіх зьмешчана налепка цалкам на ўкраінскай мове. Нашы марозіва, чыпсы, шакаляд маюць на абгортках расейскія і ўкраінскія тэксты. Некаторыя фірмы (збольшага беларускія, а не расейскія) дапісаліся да таго, перад расейскім надпісам ставяць два значка: RUS, BY. Недзе ніжэй ідуць надпісы па-ўкраінску, польску, чэску, славацку.

Забыўшыся на беларускую мову, нашы вытворцы вельмі хутка асвоілі моўнае заканадаўства суседняй краіны. Украінізацыя пасьпяхова рэалізуецца на прадпрыемствах Гомелю і Берасьця. Зыходзячы з гэтага, відавочна, што беларусізацыя пойдзе шпаркім крокам, як толькі дзяржава пачне надаваць гэтаму пэўную ўвагу. Пакуль, на жаль, у нас адбываецца адваротнае…

Як гэта ні парадаксальна, украінізацыя мае станоўчыя вынікі для Беларусі. Вытворцы расейскага соку «Мая сям’я» ці макароны «Шабекінскай», зыходзячы з украінскага вопыту, пераклалі адразу і на беларускую мову свае надпісы на ўпакоўцы. Расейскія фірмы, каб не дурыць сабе галавы беларускім заканадаўствам, лягічна мяркуюць, што калі ёсьць незалежная дзяржава, дык і родная мова тамака мае лепшае становішча. Памыляюцца расейцы. Дзякуй за гэта ўкраінцам.

# Пісьменьнік-кінік Андрэй Пяткевіч



Мінула дзесяць гадоў, як няма Андрэя Пяткевіча. Андрэй нарадзіўся ў 1966 годзе ў вёсцы Ўселюб на Навагрудчыне. Вучыўся ў Гарадзенскім унівэрсытэце, уваходзіў у літсуполку «Верш-гурт «Дыяген», Гарадзенскі літаратар Юрась Пацюпа ў эсэ «Постмадэрнізм, калыска мая» пісаў: «Для Андрэя Пяткевіча кінізм быў пэрманэнтным палітычным бунтам супраць таталітарнае дзяржавы, патаптаньнем нормаў філістэрскага грамадзтва. Ён, пісьменьнік, не цаніў пісанага слова, калі трэба было выбіраць паміж словам і ўчынкам... Ягоны кінізм уяўляў бунтарскі стыль паводзінаў і філязофскі лад жыцьця».

Для Андрэя Пяткевіча кінізм быў пэрманэнтным палітычным бунтам супраць таталітарнае дзяржавы. Ён, пісьменьнік, не цаніў пісанага слова, калі трэба было выбіраць паміж словам і ўчынкам

Учынкаў, зьдзейсьненых Пяткевічам, было шмат. Ён выкрываў стукачоў і несумленных людзей, бесхрыбетнікаў і пафігістаў. Пра дамаганьні гарадзенскага КДБ расказаў у артыкуле «Паэт і камітэт», надрукаваным у гарадзенскай «Пагоні».

Маленькага росту, худзенькі, сухенькі, Андрэй Пяткевіч нагадваў фалькльёрнага дзядка-дамавічка, які мусіць сачыць за парадкам у хаце, а яго мала хто слухаецца. Таму ўвесь час трэба ўшчуваць і сарамаціць жыхароў дому.

Андрэй спачатку паставіўся крытычна да маёй ідэі ўтварыць Таварыства вольных літаратараў. У красавіку 1993 году ён даслаў у Полацак гнеўны ліст, у якім сярод іншага пісаў: «Ня бачу асобаў для ТВЛ, за выключэньнем трох-чатырох чалавекаў. Які літаратар ёсьць вольны? Абавязкова той, хто акрамя ўсяго іншага друкуецца толькі на тарашкевіцы й не супрацоўнічае з афіцыйнымі выданьнямі».

Упершыню ў полацкіх выданьнях вершы Андрэя Пяткевіча былі надрукаваны ў альманаху «Ксэракс беларускі». Сярод іх і праграмны: «Я сёньня быў самім сабою, у твар брыду назваў брыдою».

У яго ад нараджэньня быў парок сэрца, але сьмерць стала для ўсіх нечаканай. А пасьмяротнай кнігі няма і да сёньня.

**Алесь Аркуш**




### Канцэрты ў «Саюз-он-лайне»

6 траўня канцэртам «Крамбамбулі» пачынаецца новая акцыя беларускіх музыкаў. Штопятніцы ў сталічнай інтэрнэт-кавярні «Саюз-он-лайн» (вул.Чырвонаармейская, 3, Дом афіцэраў) плянуецца праводзіць эксклюзіўныя канцэрты айчынных рок-гуртоў.

Ініцыятарам акцыі стаў Піт Паўлаў: «Кіраўніцтва інтэрнэт-клюбу — мае даўнія знаёмыя, яны зьвярнуліся да мяне з прапановай зладзіць якую-небудзь акцыю, што прыцягнула б увагу да іх. Як па мне, дык найлепшая акцыя — гэта рок-канцэрт». На думку Піта, «Саюз-он-лайн» можа стаць новым пунктам жывога гуку. Музыка кажа, што інтэрнэт-клюб цалкам прыдатны для правядзеньня канцэртаў, адзінае — кампутары стаяць, так што «каўбасіцца па-вар'яцку» нельга будзе. «Але піва папіць ды пахадзіць — калі ласка!» Клюб можа зьмясьціць да 200 чалавек.

**Сяргей Будкін**

НОВЫЯ КНІГІ

### Запісы БІНІМу — 28

Запісы. Беларускі інстытут навукі й мастацтва. №28. 2005.

Новы нумар штогодніка прысьвечаны дырэктару нью-ёрскага Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва Вітаўту Кіпелю. Друкуюцца ўспаміны-абразкі пра сп.Вітаўта У.Арлова, Т.Бэрда, Я.Запрудніка, А.Мальдзіса, Г.Сагановіча, Ю.Туронка, З.Шыбекі. Зьмешчана бібліяграфія твораў В.Кіпеля — кнігі, артыкулы, рэцэнзіі (460 пазыцый).

У разьдзеле «Тэксты» — артыкулы пра Ўладзімера Дубоўку, Восіпа Арлоўскага й яго кнігу «Беларускія народныя расказы». Артыкулы пра БАПЦ, БЦР, мовазнаўчую канфэрэнцыю 1942 г. Разьдзел «Літаратура» прадстаўлены паэзіяй Я.Золака, Зьніча, зацемкамі Я.Юхнаўца.

Сярод дакумэнтаў — ліст жонкі Алеся Салаўя, які праясьняе прычыны дэпрэсіі паэта ў Аўстраліі. Своеасаблівая сэнсацыя — факсыміле справаздачы амэрыканскага разьведчыка аб «вандроўцы» ў Беларусь у 1948—1949 г. і побыце ў беларускіх партызан. Калі гэта не фальсыфікацыя, вядома.

КАЛЯНДАР

## Травень

**1** — Вялікдзень у праваслаўных.

**1** — Дзень працы.

**1** — 75 год з дня нараджэньня драматурга й празаіка Алеся Петрашкевіча (1930).

**2** — Сусьветны дзень Галакосту, у памяць пра шэсьць мільёнаў габрэяў, якіх зьнішчылі нацысты. Слова «галакост» з старажытнагрэцкай мовы перакладаецца як «зьнішчэньне агнём».

**3** — Сусьветны дзень свабоды друку.

**6** — 100 гадоў з дня нараджэньня паэта й перакладчыка Юркі Гаўрука (1905—1979), аўтара першай у Беларусі кнігі паэтычных перакладаў «Кветкі з чужых палёў» (1928 г.).

**7** — 125 гадоў з дня нараджэньня навукоўца Міхала Ромэра (1880—1945), аднаго з ідэолягаў «краёўцаў». Супрацоўнічаў з «Нашай Нівай», узначальваў віленскую масонскую лёжу «Літва», у якую ўваходзілі Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі.

**9** — Дзень Перамогі.

**9** — 75 гадоў з дня нараджэньня фізыка Міхаіла Цэдрыка (1930—1994).

**9** — 50 гадоў з дня нараджэньня гісторыка Ўладзімера Емяльянчыка (1955—2003).

**10** — Радаўніца.

**11** — 150 гадоў з часу заснаваньня графам Яўстахам Тышкевічам у Вільні музэю старажытнасьцяў (1855 г.).

**13** — 100 гадоў з дня нараджэньня народнай артысткі Беларусі Стэфаніі Станюты (1905—2000).

**13** — 75 гадоў з дня сьмерці нарвэскага дасьледчыка Арктыкі Фрыт'ёфа Нансэна, ляўрэата Нобэлеўскай прэміі міру 1922 г.

**14** — 50 гадоў з дня нараджэньня Аляксандра Данілава (1955), чальца-карэспандэнта НАН Беларусі, навукоўца ў галіне сацыялёгіі й паліталёгіі.

**16** — 50 гадоў з дня нараджэньня гімнасткі Вольгі Корбут (1955).

**18** — 75 гадоў з дня нараджэньня Андрэя Нарбута (1930), дасьледчыка генэалёгіі шляхецкіх родаў Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны й Расеі, старшыні Маскоўскага рэгіянальнага аб'яднаньня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

**19** — 525 гадоў (1480) з дня сьмерці польскага храніста Яна Длугаша.

**20** — 75 гадоў з дня нараджэньня філёзафа Мікалая Жукава (1930), заснавальніка беларускай навуковай школы ў галіне філязофскіх праблем тэорыі сыстэм, кібэрнэтыкі, матэматыкі й інфарматыкі.

**22** — 75 гадоў ад нараджэньня фальклярыста Івана Цішчанкі (1930—2001).

**23** — 25 год з дня сьмерці опэрнай сьпявачкі (сапрана), народнай артысткі Беларусі Ларысы Александроўскай (1904—1980).

**24** — 75 гадоў з дня нараджэньня мастачкі і змагаркі за правы жанчын Галіны Русак (у дзявоцтве Родзькі) (1930—2000), беларускі, што жыла ў ЗША.

**25** — 75 год з дня нараджэньня Мікалая Дземянцея (1930). Кіраваў Вярхоўным Саветам БССР у 1990—1991 г., пры ім была прынята Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце.

**27** — 75 гадоў з дня нараджэньня навукоўца ў галіне ядзернай энэргетыкі Валянціна Барысевіча (1930).

**28** — 100 год публікацыі першага беларускага верша Янкі Купалы — верша «Мужык» у газэце «Северо-Западный край» (1905).

# «Ад Кіева да Менску далёка»

Працяг са старонкі 4.

Словы, вынесеныя ў назву, належаць паслу Вялікабрытаніі ў Беларусі Браяну Бэнэту. Пры гэтым глыбокага сымбалічнага зьместу ў гэтыя словы брытанскі дыплямат не ўкладаў. Проста гэткім чынам ён растлумачыў, чаму, на яго думку, офіс Эўрапейскай камісіі, г.зн. фактычна пасольства эўрапейскае протадзяржавы, патрэбен у Менску.

Прадстаўніцтва ў Кіеве дэфакта займаецца сёньня таксама й пытаньнямі Беларусі ды Малдовы. Але зьбіраць і аналізаваць інфармацыю пра Беларусь супрацоўнікам Эўракамісіі на такой адлегласьці даволі складана. А ў тым, што гэта трэба рабіць, сёньня ніхто ў Эўразьвязе ўжо не сумняецца. Такая выснова вынікае з выказваньняў ня толькі сп.Бэнэта, але й іншых эўрапейскіх паслоў, што прагучалі падчас прэс-канфэрэнцыі ў брытанскай амбасадзе ў Менску 25 красавіка.

Фармальна прэс-канфэрэнцыя, зладжаная з ініцыятывы тыднёвіку «Белорусский рынок» з дапамогай Беларускай асацыяцыі журналістаў, была прысьвечана першай гадавіне пашырэньня Эўразьвязу. Насамрэч цяперашні момант даваў куды больш падстаў адзначыць гадавіну славутай прэс-канфэрэнцыі паслоў у Менску, правядзеньне якой тройчы прызначалася ў Нацыянальным прэс-цэнтры й тройчы пераносілася, пакуль яна не адбылася ўрэшце ў будынку літоўскае амбасады.

Тое, што год таму мела характар ледзьве не міжнароднага скандалу, сёньня ўжо нікога не зьдзіўляе. Нікога не зьдзівіў, напрыклад, той факт, што прэс-канфэрэнцыя, арганізатарам якой выступае беларускі тыднёвік, праходзіць на тэрыторыі замежнай дзяржавы. Відавочна, што яе правядзеньне ў якім хочаш іншым памяшканьні сталіцы выклікала б праблемы. Выявілася б, напрыклад, што ў арандаваным памяшканьні няма сьвятла, ці яно не адпавядае санітарным нормам, ці ў ім закладзена бомба. Альбо ўлады проста забаранілі б мерапрыемства — бяз дай прычыны.

Паслы краінаў Эўразьвязу гэтую акалічнасьць цудоўна ўсьведамлялі і таму імкнуліся адказваць на пытаньні журналістаў гранічна карэктна, хаця часам заставацца ў рамках палітычнай карэктнасьці было даволі цяжка. Так, пачуўшы з вуснаў камэнтатара АНТ сп.Думбадзэ, што краіны, далучаныя да Эўразьвязу, у выніку спазналі толькі занапад эканомікі, павышэньне цэн і беспрацоўе, амбасадарка Латвіі сп-ня Майра Мора выказала меркаваньне, што беларускі камэнтатар занадта шмат глядзіць перадачы свайго тэлеканалу. Гэтая рэпліка выклікала агульны сьмех прысутных. Праўда, сьмех атрымаўся сумны, паколькі ўсім было зразумела, што гэты адказ не прагучыць у дзяржаўным тэлеэтэры.

Супрацоўнікі БТ і АНТ прыйшлі на прэс-канфэрэнцыю зусім не для таго, каб задаваць пытаньні, а тым больш атрымліваць на іх адказы, а для таго, каб чытаць лекцыі кіраўнікам пасольстваў Эўразьвязу аб перавагах дзяржаўнага ладу Беларусі ды самабытнасьці беларускай дэмакратыі. Зрэшты, пераконваць паслоў у гэтай «самабытнасьці» не было патрэбы. Пасол Польшчы Тадэвуш Паўляк, напрыклад, хоць і адмовіўся камэнтаваць выказваньні кіраўніка Беларусі наконт падрыўной ролі польскай амбасады, проста заявіў, што яна, гэтая роля, «ня мае нічога супольнага з тым, што было сказана».

Пасол Літвы Ёнас Паслаўскас заклікаў журналістаў не драматызаваць сытуацыі ў сувязі з тым, што напярэдадні прэс-канфэрэнцыі яго выклікалі на размову ў беларускі МЗС. Паводле яго ных слоў, гутарка ў міністэрстве насіла чыста рабочы характар і ня мела дачыненьня да вядомай сустрэчы Кандалізы Райс зь беларускай апазыцыяй у Вільні. А той факт, што яны разам з латвійскай амбасадаркай наведалі ў турме Міхаіла Марыніча, увогуле, паводле слоў літоўскага дыплямата, ня зьвязана ні зь якімі замежнапалітычнымі падзеямі.

Выглядала так, што заходнія паслы спрабуюць супакоіць ня столькі журналістаў, колькі самых сябе. Здаецца, яны й самі гэта разумелі, паколькі лічбы аб росьце за мінулы год эканамічнага супрацоўніцтва іх краін зь беларускім бокам хоць і гучалі, але суправаджаліся рознага кшталту агаворкамі ды заявамі аб тым, што трэба падзяляць эканоміку й палітыку. Гэткім чынам было прапанавана й намер Эўразьвязу адчыніць сваё прадстаўніцтва ў Менску разглядаць не як палітычны, а як чыста тэхнічны акт. Тое, што гэты намер, таксама як факт самой прэс-канфэрэнцыі заходніх паслоў, улады Беларусі пастараюцца выкарыстаць у сваіх прапагандысцкіх мэтах, ніхто з паслоў нават не спрабаваў аспрэчваць. Адзіная аптымістычная нотка, што прагучала ў выказваньнях дыпляматаў, — гэта сьціплы спадзеў на тое, што на чарговую гадавіну пашырэньня Эўразьвязу наступным разам зноў прыйдуць журналісты.

IN MEMORIAM

# Апошняе інтэрвію Барыса Рагулі

З Барысам Рагулем гутарыць **Аляксандар Адзінец**.



СЯРГЕЙ ЕРШ

**Сустрэча «рагулёўцаў» у Вільні 3 ліпеня 1997 г. Барыс Рагуля першы зьлева.**

**— Пасьля таго як Вы пры канцы вайны апынуліся на чужыне, у родным краі больш ніводнага разу не былі. Што гэта — трагічнае непаразуменьне ці пячатка эпохі?**

— Для мяне гэта трагедыя. На працягу ўсяго пасьляваеннага жыцьця я меў надзею ўбачыць родную Беларусь. Але, як ні шкада, не ўдалося. Аднойчы я ўжо цьвёрда для сябе вырашыў: еду! Аднак адзін зь беларускіх дзеячаў, які жыве ў ЗША, папярэдзіў мяне, што гэта рызыкоўная ідэя і няма ніякіх гарантый маёй бясьпекі. Хіба ж так. Калі б я меў магчамасьць там нешта зьмяніць, тады б рызыкаваў. А так…

**— Якой Вам уяўляецца сёньняшняя Беларусь здалёк, з-за акіяну?**

— Зь вялікай павагай і зайздрасьцю слухаў навіны з Украіны, якая стала на шлях Заходняй Эўропы. А Беларусь і далей застаецца халуём Масквы.

**— Беларусы страчваюць мову, культуру і самабытнасьць. Якія працэсы прывялі народ да такога становішча?**

— Шматвяковы ўплыў расейскай культуры. Вазьміце майго дзядзьку Васіля Рагулю: ён быў адданым патрыётам Беларусі, адстойваў яе інтарэсы ў польскім сэнаце, але размаўляў толькі парасейску. На іншай мове гаварыць ня мог. Але мая маці, актыўная ўдзельніца Грамады, вучыла мяне шанаваць беларускую мову, свабоду і дала напрамак у жыцьці.

**— Калі б мары Вашага пакаленьня ператварыліся ў рэальнасьць і Беларусь, скарыстаўшыся з сутыкненьня супэрдзяржаваў у Другой сусьветнай вайне, аднавіла сваю незалежнасьць, хто павінен быў бы кіраваць дзяржавай, хто з грамадзка-палітычных дзеячаў таго часу меў самую моцную харызму?**

— Цяжка сказаць… Усевалад Родзька быў адным з самых здольных і таленавітых беларускіх інтэлігентаў на маім вяку. Менавіта Родзька ўтварыў Беларускую незалежніцкую партыю, што мела грандыёзныя пляны, і аддана кіраваў ёю. Пасьля пераезду на Захад мы рабілі намаганьні пайсьці супраць Саветаў адзіным фронтам з амэрыканцамі, аднак тыя, па сутнасьці, адмовілі нам у супрацоўніцтве. Потым у СССР забілі Родзьку, і дзейнасьць партыі канчаткова спынілася.

**— Да гэтага часу шмат спрэчак выклікае пэрсона Радаслава Астроўскага, які ўзначальваў Беларускую Цэнтральную Раду. Што гэта быў за чалавек?**

— У суме ён быў чалавек пазытыўны. Пры паляках хацеў ім падабацца, каб нешта зрабіць для беларусаў. Пры нямецкіх абставінах ён хацеў зрабіць таксама ўсё на карысьць беларусаў. Ён дабіўся мабілізацыі ў Беларускую краёвую абарону. Астроўскі быў з той часткі беларускай інтэлігенцыі, якая верыла, што ў любых умовах можна нешта рабіць на карысьць Радзімы.

**— Што абяцалі немцы акупаваным беларусам?**

— «Вас чакае зямля!» Але сапраўды мы не атрымалі нічога… Я вельмі хутка расчараваўся ў немцах. Калі ўцякаў зь нямецкага палону, перайшоў мяжу і зайшоў у адну зь сялянскіх хатаў, дык пачуў наступнае: «Дурні, вяртайцеся да немцаў і ратуйце нас ад бальшавікоў!» Гэта быў велізарны шок для мяне. Пасьля ж сталася так, што не было аніводнай прычыны, каб мы падтрымлівалі немцаў. Немцы зрабілі ў Беларусі тую ж памылку, што Буш зрабіў у Іраку. Палітычную.

**— Якой Вам сёньня ўяўляецца галоўная роля Навагрвдзкага швадрону?**

— Галоўная роля ў тым, што беларускі жаўнер ахоўваў свой народ! Менавіта ахоўваў. У ваколіцах Навагрдку, у вёсках, маіх хлопцаў прымалі, як сваіх дзяцей. Тады я пераканаўся, што, калі б мы мелі сваё войска, яно было б прыкладам аховы беларускага насельніцтва.

**— Вы, напэўна, нарадзіліся ў кашулі, бо столькі разоў уцякалі ад сьмерці…**

— Дык добра ўцякаў! Цяжэй за ўсё даліся ўцёкі з «амэрыканкі», знакамітай менскай турмы. Мне былў вынесены сьмяротны прысуд, я чакаў сьмерці ў спэцыяльнай камэры на 20 чалавек. Я дапамагаў старэйшым сябрам, рабіў шахматы з хлеба. Калі нас ужо вывозілі на сьмерць, пачалася нямецкая бамбёжка. Я кінуўся наўцёкі. Праседзеў колькі часу ў лесе, ішоў сьцежкамі і вярнуўся ў родны Навагрвдак, дзе даведаўся, што маці забіла бомба…

**— Чым цяпер займаюцца Вашы чацьвёра дзяцей — Рагнеда, Вітаўт, Валодзя ды Андрэй?**

— Дачка працуе настаўніцай у Атаве, адзін з сыноў таксама аддаў сябе пэдагагічнай справе. А двое другіх паехалі ў ЗША, дзе працуюць лекарамі. Іх цікавіць, што робіцца ў Беларусі. Аднак такога патрыятызму, як у нашага пакаленьня, у іх, ведама, няма…

**— Якая навіна прынясе Вам сёньня самае вялікае задавальненьне?**

— Любая добрая навіна з Бацькаўшчыны. Веру, што Беларусь знойдзе сваё сапраўднае месца ў сьвеце, месца, якога яна заслугоўвае.

**Паводле «Салідарнасці»**

# Расклад руху электрацягнікоў зь Менску

(ад 22 красавіка 2005 году)

## На Баранавічы

| Маршрут | Адпр. | Дні | Прыпынкі | Ст. (п.п.) адпр. |
|---|---|---|---|---|
| Берасьце | 0-54 | штодня | да ст. Памысьлішча — усюды, далей з прып. на станцыях і п.п. Воўчкавічы, Энэргетык | ІК |
| Баранавічы | 4-13 | штодня | без прып. Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды | МП |
| Стоўпцы | 5-52 | штодня | усюды | МП |
| Негарэлае | 6-16 | прац. | без прып. Рошча, Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станкава, Клыпаўшчына | Ст |
| Стоўпцы | 6-42 | штодня | усюды | ІК |
| Берасьце (электрацягнік павышанай камфортнасьці №805) | 6-49 | пн., ср., хуткі | з прып. Койданава, Стоўпцы, Гарадзея, Баранавічы, Даманава, Івацэвічы, Бяроза-Гар., Аранчыцы, Тэўлі, Жабінка | МП |
| Баранавічы | 7-08 | вых. | да ст. Негарэлае — усюды, далей з прып. Энэргетык, Коласава, Стоўпцы, Гарадзея, Пагарэльцы, Перамога | ІК |
| Стоўпцы | 7-35 | вых. | усюды | МП |
| Баранавічы | 7-58 | штодня | усюды | МП |
| Стоўпцы | 8-19 | штодня | усюды | МП |
| Стоўпцы | 9-02 | сб. | усюды | ІК |
| Стоўпцы | 9-24 | штодня | усюды | ІК |
| Стоўпцы | 9-54 | вых. | усюды | ІК |
| Берасьце | 10-12 | штодня | усюды | МП |
| Стоўпцы | 11-07 | сб. | усюды | ІК |
| Баранавічы | 11-34 | вых. | усюды | МП |
| Стоўпцы | 12-09 | вых. | усюды | ІК |
| Стоўпцы | 12-43 | штодня | усюды | ІК |
| Берасьце | 13-03 | штодня | без прып. Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка | МП |
| Стоўпцы | 13-37 | ндз. | усюды | МП |
| Баранавічы | 14-11 | штодня | усюды | ІК |
| Гарадзея | 14-36 | пт., вых. | усюды | ІК |
| Стоўпцы | 15-06 | штодня | усюды | ІК |
| *Баранавічы (Ждановічы—Баранавічы) | 15-35 | штодня, хуткі | з прып. Курасоўшчына, Фаніпаль, Койданава, Стоўпцы, Гарадзея | МП |
| Берасьце | 16-08 | штодня | без прып. Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Сінява | ІК |
| Стоўпцы | 16-23 | пт. | без прып. Пціч, Станкава | МП |
| Баранавічы | 17-03 | штодня | без прып. Варацішча, Ліпа | ІК |
| Стоўпцы | 17-47 | штодня | усюды | МП |
| Коласава | 18-07 | пт., ндз. | усюды | ІК |
| Стоўпцы | 18-24 | штодня | усюды | МП |
| Баранавічы | 19-11 | штодня | усюды | МП |
| Баранавічы | 20-22 | штодня | да ст. Стоўпцы — усюды, далей з прып. на станцыях і п.п. Пост 1 | МП |
| Стоўпцы | 21-30 | штодня | усюды | МП |
| Стоўпцы | 22-53 | штодня | без прып. Асіна, Мезінаўка, Цёмныя Ляды | ІК |

* Электрацягнік Ждановічы—МП—Баранавічы-Палескія курсуе штодня, у панядзелкі ходзіць па маршруце МП—Баранавічы-Палескія.

## На Асіповічы

| Маршрут | Адпр. | Дні | Прыпынкі | Ст. (п.п.) адпр. |
|---|---|---|---|---|
| Асіповічы | 0-20 | штодня | без прып. Чыгуначны, Дрычын, Вендзеж, Тэхнікум, Вяленскі, Блужа, Майскі, Весялоўскі, Вярхі, Савецкі | МП |
| Асіповічы | 4-55 | штодня | без прып. Чыгуначны | МП |
| Пухавічы | 6-05 | штодня | без прып. Чыгуначны, Асееўка, Раўнапольле, Дрычын, Тэхнікум | МП |
| Асіповічы | 6-14 | штодня | без прып. Чыгуначны, Седча, Зазерка, Новае Сяло, Вендзеж, Вярхі | МП |
| Асіповічы | 6-52 | штодня | усюды | МП |
| Асіповічы | 7-48 | вых. | без прып. Чыгуначны, Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Новае Сяло, Вендзеж | МП |
| Асіповічы | 7-56 | штодня | усюды | МП |
| Талька | 8-08 | вых. | без прып. Чыгуначны | МП |
| Асіповічы | 8-33 | штодня | усюды | МП |
| Талька | 8-59 | вых. | усюды | МП |
| Асіповічы | 9-28 | штодня | усюды | МП |
| Талька | 10-13 | вых. | усюды | МП |
| Асіповічы | 10-35 | вых. | без прып. Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Новае Сяло, Вендзеж, Вяленскі, Вярхі | МП |
| Пухавічы | 10-58 | сб. | без прып. Чыгуначны | МП |
| Асіповічы | 11-44 | штодня | усюды | МП |
| Асіповічы | 12-10 | вых. | без прып. Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Новае Сяло, Вендзеж, Вярхі | МП |
| Асіповічы | 13-20 | штодня | усюды | МП |
| Талька | 13-51 | вых. | усюды | МП |
| Асіповічы | 14-18 | штодня | без прып. Седча, Зазерка, Рыбцы, Раўнапольле, Новае Сяло, Дрычын, Вендзеж, Тэхнікум, Вяленскі, Блужа, Майскі, Весялоўскі, Вярхі | МП |
| Асіповічы | 15-19 | штодня | усюды | МП |
| Талька | 15-55 | вых. | без прып. Чыгуначны, Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Новае Сяло, Вяленскі | МП |
| Талька | 16-25 | штодня | усюды | МП |
| Пухавічы | 16-58 | пт., ндз. | без прып. Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Раўнапольле, Новае Сяло, Вендзеж | МП |
| Талька | 17-24 | штодня | без прып. Чыгуначны | МП |
| Асіповічы | 17-32 | штодня | усюды | МП |
| Талька | 18-00 | пт. | усюды | МП |
| Асіповічы | 18-23 | штодня | без прып. Вярхі | МП |
| Асіповічы | 19-26 | штодня | усюды | МП |
| Асіповічы | 20-56 | штодня | без прып. Вярхі | МП |
| Асіповічы | 22-24 | штодня | без прып. Вендзеж, Вяленскі, Весялоўскі, Вярхі, Савецкі | МП |

## На Маладэчна

| Маршрут | Адпр. | Дні | Прыпынкі | Ст. (п.п.) адпр. |
|---|---|---|---|---|
| Маладэчна | 4-37 | штодня | без прып. Радыятарны, Масюкоўшчына, Лебядзіны, Ждановічы, Менскае мора, Ратамка, Крыжоўка, Зялёнае, Беларусь, Хмелеўка, Анусіна, Радашковічы, Вязынка, Пралескі, Дубравы, Раманы, Аляхновічы, Баяры, Ласі | МП |
| Маладэчна | 5-22 | штодня | без прып. Лебядзіны | МП |
| Аляхновічы | 6-09 | штодня | без прып. Хмелеўка, у панядзелкі — Лебядзіны | МП |
| Маладэчна | 6-40 | штодня | без прып. Лебядзіны, Менскае мора, Крыжоўка, Анусіна | МП |
| Аляхновічы | 6-48 | прац. | без прып. Лебядзіны, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Вязынка | МП |
| Аляхновічы | 7-10 | вых. | без прып. Менскае мора | МП |
| Аляхновічы | 7-19 | сб. | усюды | МП |
| Маладэчна | 7-33 | штодня | усюды | МП |
| Аляхновічы | 7-52 | вых. | усюды | МП |
| Маладэчна | 8-20 | штодня | усюды | МП |
| Аляхновічы | 8-31 | сб. | усюды | МП |
| Аляхновічы | 8-46 | вых. | усюды | МП |
| *Ждановічы (Баранавічы—Ждановічы) | 8-55 | штодня акрамя пн. | без прып. Радыятарны, Масюкоўшчына | МП |
| Маладэчна | 9-11 | штодня | усюды | МП |
| Аляхновічы | 9-33 | вых. | усюды | МП |
| Аляхновічы | 9-51 | сб. | без прып. Менскае мора | МП |
| Маладэчна | 10-00 | штодня | усюды, без прып. Лебядзіны — у панядзелкі | МП |
| Аляхновічы | 10-24 | сб. | усюды | МП |
| Маладэчна | 11-11 | штодня | усюды, без прып. Лебядзіны — у панядзелкі | МП |
| Аляхновічы | 11-42 | вых. | усюды | МП |
| Маладэчна | 12-38 | штодня | усюды | МП |
| Маладэчна | 13-34 | штодня | усюды | МП |
| Аляхновічы | 14-29 | пт., вых. | усюды | МП |
| Маладэчна | 14-51 | пт., вых. | без прып. Менскае мора, Хмелеўка, Раманы, Крыніца, Селівонаўка | МП |
| Маладэчна | 15-22 | штодня | усюды, без прып. Лебядзіны — у панядзелкі | МП |
| Аляхновічы | 15-41 | ндз. | усюды | МП |
| Аляхновічы | 16-21 | пт. | без прып. Менскае мора | МП |
| Маладэчна | 16-30 | штодня | усюды | МП |
| Аляхновічы | 16-44 | пт. | усюды | МП |
| Аляхновічы | 17-19 | прац. | усюды | МП |
| Маладэчна | 17-44 | штодня | усюды | МП |
| Аляхновічы | 18-27 | штодня | без прып. Лебядзіны | МП |
| Маладэчна | 18-50 | штодня | без прып. Лебядзіны, Менскае мора, Ратамка, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Дубравы, Раманы | МП |
| Аляхновічы | 18-58 | штодня | усюды | МП |
| Маладэчна | 19-17 | штодня | усюды | МП |
| Аляхновічы | 20-09 | штодня | усюды, без прып. Лебядзіны — у панядзелкі | МП |
| Маладэчна | 20-36 | штодня | без прып. Селівонаўка | МП |
| Маладэчна | 22-03 | штодня | без прып. Лебядзіны, Мясота, Татаршчызна, Крыніца, Селівонаўка | МП |
| Маладэчна | 23-47 | штодня | без прып. Лебядзіны, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы, Баяры, Мясота, Крыніца, Татаршчызна, Селівонаўка; у суботы — без прып. Лебядзіны, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі, Раманы, Баяры, Татаршчызна, Селівонаўка | МП |

## На Воршу

| Маршрут | Адпр. | Дні | Прыпынкі | Ст. (п.п.) адпр. |
|---|---|---|---|---|
| Барысаў | 0-24 | штодня | без прып. Слабада, Дамашаны, Барсукі, Пралетарская Перамога | ІК |
| Барысаў | 5-05 | штодня | без прып. Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е, Барсукі, Пралетарская Перамога | МУ |
| Крупкі | 5-14 | штодня | усюды | ІК |
| Орша | 6-28 | штодня | усюды | ІК |
| Орша (электрацягнік павышанай камфортнасьці №802) | 7-05 | сб., ндз. | з прып. на ст. Смалявічы, Жодзіна, Барысаў, Крупкі, Талачын | МП |
| Барысаў | 7-14 | штодня | усюды | ІК |
| Барысаў | 8-10 | штодня | усюды | ІК |
| Барысаў | 8-50 | штодня | усюды | МУ |
| Орша | 9-04 | вых. | усюды | ІК |
| Барысаў | 9-50 | вых. | усюды | МУ |
| Барысаў | 10-00 | вых. | усюды | ІК |
| Барысаў | 10-37 | вых. | усюды | МУ |
| Орша | 11-01 | штодня | усюды | ІК |
| Барысаў | 11-33 | вых. | усюды | МУ |
| Барысаў | 12-14 | штодня | усюды | МУ |
| Барысаў | 12-42 | пт. | усюды | МУ |
| Орша | 13-06 | штодня | без прып. Садовы, Слабада, Загор'е, Барсукі, Пралетарская Перамога, Красноўка, Галошаўка | ІК |
| Барысаў | 13-44 | прац. | усюды | ІК |
| Орша | 13-44 | вых. | да ст.Бобр — усюды, далей з прып. на станцыях | ІК |
| Барысаў | 14-20 | вых. | усюды | ІК |
| Орша | 14-43 | штодня | усюды | ІК |
| Орша (электрацягнік павышанай камфортнасьці №804) | 15-22 | чц., пт., сб., ндз. | з прып. на ст. Смалявічы, Жодзіна, Барысаў, Крупкі, Талачын | МП |
| Барысаў | 15-39 | штодня | усюды | МУ |
| Крупкі | 16-17 | штодня | усюды | ІК |
| Барысаў | 17-09 | штодня | усюды | МУ |
| Барысаў | 17-37 | штодня | усюды | ІК |
| Орша | 18-21 | штодня | усюды | ІК |
| Барысаў | 19-17 | штодня | усюды | ІК |
| Барысаў | 20-26 | штодня | усюды | ІК |
| Барысаў | 22-02 | штодня | усюды | МУ |

ІК — п.п. Інстытут культуры, МП — ст. Менск-Пасажырскі, МУ — ст. Менск-Усходні, Ст — п.п. Сталічны.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# «Ні кроку назад!»

Працяг са старонкі 1.

Месца збору тых, хто плянаваў падаваць пэтыцыі ў адміністрацыю Лукашэнкі, апынулася далёка ў глыбіні недаступнай тэрыторыі, таму мітынгоўцы пакрысе пачалі акумулявацца на ходніку на рагу праспэкту Скарыны ды вуліцы Энгельса. А 18-й сабралася ўжо некалькі сотняў чалавек, у тым ліку кіраўнікі асноўных апазыцыйных партый.

Адразу заўважна: акцыя будзе вельмі маладой і вельмі стракатай. Маладафронтаўцы павязваюць на галовы блакітныя стужкі. Іх лідэр Зьміцер Дашкевіч раздае бляնкі пэтыцый тым, хто яшчэ не паставіў свой подпіс. Два хлопцы расьцягваюць аранжавы транспарант. Мо украінцы? Не — «Якія ідуць без Пуціна». А вось і ўкраінцы з жоўта-блакітным сьцягам. Дзяўчына ў бандане з надпісамі «СПС», на шыі — хустачка «Поры».

## За нашу і вашу свабоду

«Час на разыходжаньне — 5 хвілін, — пачынае міліцыя свой занудны рэчытатыў. — Вы замінаеце руху грамадзкага транспарту». «Хто супраць крыжа?», — пытаецца праваслаўны сьвятар, трымаючы крыж зь бел-чырвона-белай стужкай. Што думаюць амапаўцы, здагадацца цяжка, але ні сьвятара, ні крыж не чапаюць, прынамсі, пакуль.

Зьміцер Дашкевіч зьвяртаецца да журналістаў ды мітынгоўцаў: «Мы прыйшлі для таго, каб перадаць звароты прэзыдэнту Лукашэнку. Ён сам замацаваў заканадаўча, каб беларусы мелі права зьвяртацца да яго зь любымі сваімі пажаданьнямі». Ён пералічвае патрабаваньні: адмяніць прымусовае размеркаваньне ў чарнобыльскую зону, спыніць вытворчасьць прадуктаў у «брудных» раёнах і скасаваць забарону на аздараўленьне дзяцей на Захадзе. «Сябры, дзе маладафронтаўская там расьцяжачка? Дастаём!» — бадзёра камандуе Зьміцер, скончыўшы прамову.

Пасьля яго прамаўляе Ігар Гузь, кіраўнік украінскай моладзевай арганізацыі «Нацыянальны альянс». «Шаноўныя сябры! — кажа ён. — Сёньня ўкраінцы з аранжавымі сьцягамі прыехалі ў Менск. Наша задача — адолець апошнюю дыктатуру ў Эўропе. Нам задаюць пытаньне — ці мы баімся? Ні ў якім разе. Падчас аранжавай рэвалюцыі сотні беларусаў былі на Майдане, і сёньня мы будзем з вамі, да поўнай перамогі».

Разгортваюць бел-чырвона-белыя сьцягі, расейскі трыкалёр ды жоўта-блакітны «прапар». «Сёньня Ўкраіна — заўтра Беларусь!» — крычаць нашы. «Сёньня Ўкраіна — заўтра Расея!» — радасна намагаюцца перакрычаць іх два расейскія хлопцы. Па-новаму гучаць словы на расьцяжцы «За нашу і вашу свабоду». Ва Ўкраіне гэтага ўжо няма, у Расеі — пакуль няма яшчэ і такога, і таму яны ў Менску.

## Ланцуг на калёну

Спэцназ пераглядаецца, пачуўшы загад па рацыі, становіцца ланцугом ды пачынае рухацца наперад. «Ні кроку назад!» — галасна камандуе Зьміцер. Калёна счапляе рукі. Стаяць. Мікрапаўза. Кантакт. Тры тузіны апамаўцаў супраць трох тузінаў хлопцаў. Амаль што адзін на аднаго. Спэцназ разумее, што мае перавагу, і не хапаецца за дручкі — загаду няма. Задача іншая — адціснуць калёну як мага далей, працягнуць яе па праспэкце. Маўляў, паглядзіце, шчанюкі, на што вы здатныя.

Але калёна падаецца назад туга. Амапаўцы, атачыўшы яе па-мурашынаму з краю, цяжка, крок за крокам, пасоўваюцца наперад. Яны пнуцца, сапуць, з чырвонымі тварамі пхаюць адзін аднога ў сьпіны, а ў саміх боты сьлізгаюць па плітцы. Па азначэньні больш моцныя, гэтым разам яны выглядалі слабакамі. Бралі перавагай у мускульнатлушчавай масе.

Нарэшце, стаміўшыся напружваць цягліцы, амап бярэцца за гумовыя дручкі. Калёна разрэзаная, пачынаецца беганіна, падрульвае «ПАЗік» з чорнымі шыбамі. Кагосьці цягнуць у аўтобус, жанчыны крычаць. Частка амапаўцаў паўколам прыціскае рэшту хлопцаў з калёны да сьцяны. Па аднаму іх выхопліваюць ды цягнуць у аўтобус.

## Міліцыя з народам

«Трымаемся разам! Трымаемся разам!» — чуваць голас Зьмітра. Стаіць нейкі трэск, нібыта ламаюцца косткі, — але, хутчэй за ўсё, гэта «касманаўты» сутыкаюцца шлемамі. Заломваюць рукі. Нейкая дзяўчына бегае навокал ды галасна плача. Зьміцер і яшчэ некалькі чалавек на зямлі. Праз некалькі сэкунд іх таксама кідаюць у аўтобус.

«За нашу і вашу свабоду!», «Міліцыя з народам!», «Разам нас багата!» — праз дзесяць хвілін крычыць калёна, другім разам накочваючыся на ланцуг амапаўцаў. У радах — ужо іншыя твары. Амапаўцы больш не ідуць ланцугом, а кідаюцца наперад, моладзь разьбягаецца. Кагосьці схапілі. Два «касманаўты» на дыбачках падбягаюць да Марыны Багдановіч ззаду (каб ня ўбачыла), хапаюць яе пад рукі ды цягнуць за рог будынку ў бок аўтобусаў.

Анатоль Зінгер, той, хто «крочыць бяз Пуціна», стаіць на вуліцы Леніна. Толькі што міліцыя схапіла яго сябра. Анатоль на выгляд амаль падлетак, у джынсах ды куртачцы. «У Беларусі творыцца поўнае бязьмежжа, — высокім юначым голасам кажа ён. — Я чакаў шмат чаго, але не такога. Я ўпершыню ўбачыў усё гэта на свае вочы. Гэта жах». А што думае моладзь там, у Расеі? «Ёсьць вялікая колькасьць людзей, якім не падабаецца той рэжым, які цяпер усталёўвае пан Пуцін. Гэта факт. Чым больш жорсткім робіцца рэжым, тым больш жорсткім робіцца супраціў». А хто спачатку: Расея ці Беларусь? «Мабыць, усё-такі Беларусь, але Расея таксама не адстане».

## 112 крокаў

Бадай што кожны, хто прыходзіць на чарговы мітынг пратэсту, думае: а ці ёсьць яшчэ ў іх сэнс? Здаецца, сцэнары акцый вывучаныя на памяць, спэцназ ды мітынгоўцы ведаюць адзін аднаго ў твар. Можна нават лёгка адгадаць, якія сцэнкі будуць здымаць фотакарэспандэнты: крыж зь бел-чырвона белай стужкай на тле амапаўскага камуфляжу; палаючая сьметніца, за ёй — ланцуг спэцназу; хлопец з чорнай павязкай на твары, на якой намаляваны жоўты знак «радыеактыўна». Некалькіх дзясяткаў затрыманых, суды, тэлерэпартажы, артыкулы і — ніякіх зьмен.

«Што тут думаць — не пускаюць, ачапілі ўсё. Забралі некалькіх нашых», — кажа Яўгенія, маладзенькая актывістка «МФ» з Жодзіна. Але ж колькі ўжо было тых Чарнобыльскіх шляхоў? Няўжо тры сотні чалавек могуць зьмяніць рэжым? Дзеля чаго яна тут? Яўгенія доўга думае, перад тым, каб з усьмешкай адказаць: «Для душы».

На мітынгу часта казалі: мы разьяднаныя, моладзь — на праспэкце, старэйшыя — на Бангалоры, КХП-БНФ — у Курапатах. Што, маўляў, з такога можа выйсьці. Але ці трэба шукаць практычнага сэнсу ў тым, каб выйсьці зь бел-чырвона-белым сьцягам на цэнтральны сталічны праспэкт, прыйсьці на жалобны мітынг да чарнобыльскай капліцы ці запаліць сьвечку ля крыжоў у тым страшным лесе пад Менскам? Ці зладзіць, як гэта і было гэтым разам, акцыі на ўспамін пра ахвяр чарнобыльскага выбуху ў іншых гарадах? Дзе тут разьяднаньне?

Кажуць — замала людзей, кажуць — усё бессэнсоўна. Але гэтыя тры тузіны маладых хлопцаў і дзяўчат у калёне ў чарговы раз паказалі, што мы ёсьць. І не тэлебачаньню — нам самім. Ад скрыжаваньня Энгельса—Скарыны да таго месца, дзе апошніх іх павалілі на брук, — 112 крокаў. Іх можна прабегчы за дваццаць сэкунд, прайсьці — за хвіліну. А яшчэ іх можна вытрымаць плячом да пляча, тры разы прымусіўшы АМАП спыніцца. Гэта быў самы кароткі Чарнобыльскі шлях, але яны прайшлі яго годна.

# Прадавайце беларускае

У Інтэрнэце можна набыць як аскепак Брагінскага мэтэарыту, так і цэлую плянэту Беларусь. Мінулі часы інтэрнэт-буму пяцігадовай даўнасьці, калі, здавалася, байты-кілябайты самі сабой ператвараліся ў даляры. Разам з тым інтэрнэт-камэрцыя жыве й разьвіваецца. А ці спрабуе хто-небудзь зарабіць грошы ў сеціве на гандлі таварам зь беларускім тварам? Спроба ўвесьці слова «Belarus» у пошукавыя радкі найбольш вядомых віртуальных гандлёвых пляцовак дае нечаканыя вынікі. — Алесь Кудрыцкі.

Кніжны гандаль — адна з найбольш пасьпяховых сфэр сеціва. Найбуйнейшая ў сьвеце інтэрнэт-кнігарня «Амазон» прапануе каля 300 кніжак, у назьве якіх прысутнічае слова «Беларусь». Сярод іх б'е рэкорды папулярнасьці трэцяе выданьне турыстычнага даведніка з сэрыі «Lonely Planet» («самотная плянэта»). У кнізе цаной пад 20 даляраў Расея й Беларусь аб'яднаныя разам — цынічна, затое практычна. Нашая краіна, на погляд прафэсійных вандроўнікаў з «Lonely planet», выглядае так: «Пляскаты кавалак зямлі, які разьмясьціўся на самым кароткім адрэзку шляху паміж Масквой ды польскай мяжой.



**Кавалачак Брагінскага мэтэарыту вагой 7,42 грама пакуль не знайшоў пакупніка.**

Шырокія палосы гаёў, неабсяжныя парослыя лесам балоты ды драўляныя вёсачкі сярод узгоркавых зялёных ды чорных палеткаў западаюць у душу сваёй прыгажосьцю».

Другое месца ў краме трымае кніга «Беларусь» аўтарства Лі Хоган — проза, праўда, ня дужа мастацкая, фантастыка — але не зусім навуковая. Сюжэт такі: у далёкай будучыні ўся ўлада і маёмасьць сканцэнтраваная ў чэпкіх руках некалькіх багацеяў. Адзін з магнатаў Андрэй Міраненка адкрывае ў нетрах галяктыкі новую плянэту і вырашае пабудаваць на ёй «новую палепшаную Расею, якой яна была да таго, як бальшавікі яе зьнішчылі». Немаведама чаму самаабвешчаны цар вырашае назваць сваю плянэту «Беларусь». Ілюстратар кніжкі ўявіў галоўны мэгаполіс плянэты з хмарачосамі ў псэўдарасейскім стылі з купаламі-цыбулінамі на дахах. Але ў 19017 годзе гісторыя паўтараецца: міжгалактычная рэспубліка заглыбляецца ў хаос, плянэты адна за адной пачынаюць абвяшчаць незалежнасьць ад «цэнтру». Андрэй прысягае: што б ні сталася з рэштай галяктыкі, Расея пад назвай Беларусь будзе жыць… Аднак у гэты момант, нечакана для ўсіх, на арэну барацьбы выходзяць карэнныя насельнікі плянэты, гуманоідныя інсэкты, пра якіх ніхто й не падазраваў. Яны доўга хаваліся, але цяпер кінулі выклік каланізатарам. Распачынаецца вызваленчая вайна. Такі вось антыўтапічны блякбастэр на 416 старонках.

«Вавёрачка» — паперка ў 50 капеек — ацэньваецца ў сеціве прыкладна ў два з паловай даляры — Нацбанку такі курс нават ня сьніўся!

Можна шчыра парадавацца за ЯнкуЗапрудніка: яго англамоўная кніга «Беларусь: на скрыжаваньнях гісторыі» трывала займае першыя месцы ў рэйтынгах. Цана — 25 даляраў. «Запруднік піша з нацыяналістычнага гледзішча пра краіну, якой нялёгка даецца навука нацыяналізму», — пакінуў свой водгук ананімны чытач. Няблага прадаецца таксама Запруднікаў «Беларускі гістарычны слоўнік».




**Ангельскамоўная кніга Янкі Запрудніка «Беларусь: на скрыжаваньнях гісторыі» займае першыя месцы ў рэйтынгах. Цана — $25.**

Асартымэнт «Амазону» не абмяжоўваецца кнігамі. На мапы таксама заўжды ёсьць попыт — падрабязную каляровую схему беларускіх аўтамабільных дарог з плянам Менску можна набыць за 11 даляраў.

На паліцах інтэрнэт-крамы можна адшукаць таксама «Беларускі файл» («The Belarus File») — малавядомы ў Эўропе дэтэктыў, зьняты ў 1985 г. рэжысэрам Робэртам Маркавіцам. Патрыманы відэакасэту прадаюць за чатыры з паловай даляры. Дзеяньне стужкі разгортваецца ў Амэрыцы праз сорак гадоў пасьля заканчэньня Другой сусьветнай вайны. Былы вязень нацысцкага лягеру вышуквае габрэяў, якія дапамагалі нацыстам, і забівае іх. На ягоны сьлед выходзіць дэтэктыў, які, як высьвятляецца, сам зьвязаны зь людзьмі, што маюць дачыненьне да гэтай справы. Мяркуючы па водгуках гледачоў, фільм неблагі.




**Антыўтопія Лі Хоган пра «новую палепшаную Расею» пад назвай Беларусь трымае другое месца ў рэйтынгу.**

Нельга не зазірнуць на сусьветную барахолку — аўкцыён «Ebay». Там — сапраўдны зьвярынец. Квітнее гандаль банкнотамі з выявамі вавёрачак-зайчыкаў. «Вавёрачка» — паперка ў 50 капеек — ацэньваецца прыкладна ў два з паловай даляры — Нацбанку такі курс нават ня сьніўся!

Відаць, што замежныя камэрсанты добра-такі падзабыліся пра бел-чырвона-белы сьцяг ды «Пагоню». Сувэнірная спартовая вопратка з сымболікай — спрэс чырвона-зялёная. Стандартная прапанова — футболка за 15 даляраў з трайным надпісам «Belarus»: зялёны радок паміж двума чырвонымі.

Масава прадаюцца чырвона-зялёныя сьцяжкі, нярэдка — пад зьнішчальнай назвай «сьцяг новай Беларусі». Нарэшце, вось ён — бел-чырвона-белы сьцяг. Пра прадаўца вядома толькі тое, што ён жыве ў штаце Род-Айленд ды прыгандлёўвае патрыманымі кнігамі ды відэакасэтамі. Гандляр *Alex_gor80* з Галівуду прадае бел-чырвона-белыя налепкі для аўто зь літарамі BY. *Alex_gor80* спэцыялізуецца на продажы аўтастыкераў з розных краін і ўпарта трымаецца традыцыйных беларускіх колераў.

Асобную катэгорыю тавараў складаюць варыяцыі на тэму вырабаў МТЗ. Так, на «Ebay» можна адшукаць культавы рэклямны постэр трактара «Беларусь» 1974 году выданьня. На фота машына спраўна вырульвае з бруду пад праліўным дажджом. Рэклямны тэкст — ангельскі! Можна набыць і цацачны трактар, і трактар сапраўдны — напрыклад, той, што стаіць на фэрме ў мястэчку Мармадзюк у штаце Арканзас і каштуе дзьве з паловай (?!) тысячы даляраў.

Але самая ўнікальная прапанова — кавалачак Брагінскага мэтэарыту. «Ён важыць 7,42 грама ды варты сама менш 40 даляраў», — сьцьвярджае прадавец зь нікам *Meteorite-hunter*. Паводле ягоных зьвестак, месца падзеньня мэтэарыта знайшлі ў 1810 г. Пошукамі кавалачкаў касьмічнага каменя нелегальна займаюцца шукальнікі мэтэарытаў, якіх не спыняе нават тое, што Брагін знаходзіцца на радыяактыўна забруджанай тэрыторыі. Потым яны кантрабандай перасылаюць каменьчыкі за мяжу. Праўда, пачатковай цаны (1 цэнт) яшчэ ніхто не перабіў. Мо радыяцыі баяцца? А мо ня вераць у беларускасьць прапанаванага мэтэарыту? Яго прадавец жыве ў Арызоне, дзе знаходзіцца знакаміты мэтэарытны кратэр. Ці не адтуль той каменьчык?

Можна набыць і цацачны трактар, і трактар сапраўдны — напрыклад, той, што стаіць на фэрме ў мястэчку Мармадзюк у штаце Арканзас і каштуе дзьве з паловай (?!) тысячы даляраў.

АЎКЦЫЁНЫ

# Дарагая карціна



У Вербную нядзелю ў менскім Тэатры беларускай драматургіі адбыліся велікодныя таргі аўкцыённага дому «Paragis». Сярод пакупнікоў былі госьці зь Нямеччыны, Расеі, Індыі і Ўкраіны. Партнэрам «Paragis'у» выступаў славуты дом «Christie's». Піша Сяргей Харэўскі.

Пераважная большасьць выстаўленых на продаж рэчаў — камэрныя, хатняга ўжытку. Гэта даніна рэаліям айчыннага рынку, дзе галоўныя пакупнікі яшчэ не дасьведчаныя ў сур'ёзным мастацтве. Дзіва што амаль трацына экспанаваных парцалянавых і масянжовых статуэтак і талерак была распрададзена. З увагі на міжвелікодны час, арганізатары выставілі багата беларускіх, эўрапейскіх і расейскіх абразоў XVI—XX ст. Вялікую каштоўнасьць уяўляюць выстаўленыя гэтым разам старасьвецкія абразы зь Веткі.

Найдаражэй прадалася карціна «Начны краявід» **(на здымку)** расейскага мастака Р.Шаўчука (1849 г.) З увагі на час напісаньня — бясспрэчны рарытэт для Беларусі. Карціна ўяўляе сабою дзіўнавата-абстрактны заходнеэўрапейскі фантазійны пэйзаж, як мае быць з млыном-ветраком і мураванкай пад сьпічастым дахам. Задаволены сабою пакупнік адразу ж разьлічыўся й загадаў зьняць карціну з выставы — пэўна, каб прыйсьці дахаты не з пустымі рукамі. Кошт карціны малазнанага Шаўчука склаў паўтары тысячы даляраў. Значыць, грошы ў краіне ёсьць.

Можна цешыцца з таго, што ў краіне ёсьць энтузіясты з «Paragis», якія прывучаюць патэнцыйных пакупнікоў да гэткіх акцый. Глядзіш, у наступным пакаленьні беларусаў зьявяцца сур'ёзныя калекцыянэры й мэцэнаты. Мо хто ў высакародным запале будзе выкупляць старадаўнія абразы й вяртаць іх, напрыклад, у Ветку.

Выстава, дзе можна ўбачыць нераспрададзеныя пакуль рэчы, будзе працаваць да 1 траўня. Тамсама дадаткова будуць экспанавацца творы й рарытэты, якія выставяць на наступным аўкцыёне 29 траўня.

# Жыць у праўдзе

Мы жывём харашо, у нас мір і чыстыя вуліцы, мы не галадаем, а што яшчэ трэба? Слухаючы соты раз гэтую вулічную філязофію, я падумаў: калі б у сьвіней на калгаснай фэрме можна было ўзяць інтэрвію, дык адказы былі б такія самыя. Наша сьпеўная рэвалюцыя адбудзецца не тады, калі прыйдуць гранты або дастане рэжым правіцеля. Грантаў ніколі ня будзе дастаткова, а рэжым мы вытрымаем любы. Сёньняшні з тых, якія бачылі, яшчэ самы лібэральны. Наша рэвалюцыя пачнецца тады, калі нам самім абрыдне наша штодзённая і паўсюдная хлусьня. Эсэ **Сяргея Дубаўца**.

Калі мой знаёмы пэнсіянэр Васіль Капітонавіч выпраўляецца на свае соткі пад Менскам, суседзям ён паведамляе, што паехаў да сястры ў Віцебск. У электрычцы Васіль Капітонавіч, які ўсё жыцьцё працаваў у ЖЭСе, распавядае выпадковаму спадарожніку, што ён — адстаўны падпалкоўнік, а новаму суседу па сотках прадстаўляецца Васілём Канстанцінавічам. Такая дробная і зусім бясшкодная мана не бянтэжыць майго героя, бо даўно, яшчэ з савецкіх часоў стала арганічнай патрэбай і добрым тонам паводзінаў. Не бянтэжыць яна і ягоных сямейнікаў, і выпадковага спадарожніка ў электрычцы, і суседа па сотках. Яны ўсе выдатна разумеюць, што Васіль Капітонавіч маніць, але ўспрымаюць ягоную хлусьню за належнае. Бо яны ўсе жывуць і паводзяць сябе гэтаксама.

Гэтая зьява — хлусьня як заложны фон усяго нашага жыцьця — цікавіла мяне даўно, і даўно хацелася зразумець, навошта яна патрэбная? Гледзячы БТ, гартаючы газэты — што дзяржаўныя, што апазыцыйныя, — слухаючы палітыкаў з усіх лягераў, я ўвесь час натыкаўся на цэлыя напластаваньні няпраўды, якая накладалася адна на адну з нумару ў нумар, з прамовы ў прамову. Вось прэзыдэнт паведаміў, што чарговыя манэўры праведзеныя ў поўнай адпаведнасьці з правіламі ваеннага часу, а вось апазыцыйныя палітыкі рапартуюць, што выбралі адзінага кандыдата паводле адзінай, хоць і няўдалай схемы... Пры гэтым усе цудоўна разумеюць, што аніякае пагрозы для краіны няма, гэтаксама як і хоць якіх-кольвек шанцаў у вытусаванага з апазыцыйнай калоды кандыдата. Але ўсе пры гэтым захоўваюць вернасьць заложнаму фону і адпаведным правілам публічных паводзінаў, той гульні, у якую добраахвотна гуляюць.

Прыежджыя замежнікі, асабліва заходнікі, не разумеюць нашага жыцьця, нашага грамадзкага быту і нашай палітыкі. Для іх гэта — нейкі паралельны сьвет, у якім людзі белае называюць чорным, мір — вайной, а Васіль Капітонавіч прадстаўляецца Васілём Канстанцінавічам. Калісьці за савецкім часам у нас было тое самае, але тады мы ўсе былі ўдзельнікамі аднаго вялікага спэктаклю — пабудовы камунізму. А цяпер? Дзеля чаго цяпер мы бясконца хлусім самі сабе і іншым? Толькі па інэрцыі?

Вяртаньне да заложнае хлусьні пачалося разам з рэсаветызацыяй — прыходам да ўлады прэзыдэнта Лукашэнкі і ягонымі рэфэрэндумамі. Галасаваньне за роўны статус для беларускай і расейскай моваў было самай першай вялікай хлусьнёй, якая аб'яднала прэзыдэнта і ягоны электарат. Гэта была адкрыта цынічная хлусьня, бо насамрэч ні пра які роўны статус гаворкі не было. Калі ў вас засталіся ілюзіі на гэты конт, паспрабуйце ў афіцыйным месцы загаварыць пабеларуску, і вы адчуеце сябе папуасам на навуковым сымпозіюме. З гэтага пачалося вяртаньне заложнага фону. Можна, вядома, сказаць, што Лукашэнка падмануў народ, але нельга сказаць, што народ не гатовы быў падмануцца і неяк асабліва працівіўся хлусьні. Хутчэй, наадварот. Гэта было пагадненьне большасьці.

Хачу асабліва падкрэсьліць, што гаворка — не пра брак патрыятычных пачуцьцяў альбо пра нейкае стаўленьне да роднае мовы. Я кажу пра ману, незалежна ад тэмы і прадмету размовы. Бо кожны чалавек выдатна разумее, што рэфэрэндум адкрыў шлюзы для цунамі расейскае мовы, а беларускай у гэтай хвалі была вызначана роля тапельца, якому лішні раз білі па галаве, калі ён раптоўна выплываў, хапаючы паветра. Зусім не зь нялюбасьці да мовы электарат зрабіў гэта. Проста ня змог Васіль Капітонавіч не назвацца Васілём Канстанцінавічам. Ад патрэбы, так бы мовіць, душы.

Самая важная асаблівасьць нашай хлусьні ў тым, што для яе няма рацыянальнай матывацыі. Навошта хлусіць Васіль Капітонавіч? А проста так. Для чаго? Вось тут увага, нешта важнае, — каб быў парадак.

За савецкім часам расказвалі пра прыбалтаў. Маўляў, прыехалі мы ў Талін і калі пытаемся ў эстонца, як прайсьці да вакзалу, дык абавязкова пакажа ў іншы бок. Гэта нас абурала, бо мы народ ветлівы, ніколі ў такіх выпадках ня хлусілі.

Значыць, ёсьць хлусьня і хлусьня. Хлусьня эстонца, прынамсі, матываваная, зразумелая, хай сабе і непрымальная. А наша? Прымальная, але незразумелая, нематываваная.

Менавіта хлусьня, а ня што іншае ляжыць вызначальным чыньнікам пад усім, што з намі адбывалася, адбываецца і будзе адбывацца заўтра. Менавіта хлусьня ў вялікім і малым робіць наша жыцьцё такім, якое яно ёсьць. Усе астатнія чыньнікі — указы правіцеля і рухі апазыцыі, свабода і дыктатура, міжнародная ізаляцыя і свой адмысловы шлях — усё гэта потым і ўсё перадвызначана заложным фонам хлусьні. Чаму беларускі пэнсіянэр жыве горш за нямецкага? Таму што ў нас свой шлях. Быццам свой шлях — гэта прысуд для народа жыць горш за іншых.

> Наш правіцель ня кажа нам, што мы — эўрапейцы.

Іншы раз мне здаецца, што хлусьня ўвогуле ляжыць у аснове ўсяго, што робіцца ў сучасным сьвеце. І Савецкі Саюз разваліўся не з-за таго, што было мала свабоды, а з-за таго, што было шмат хлусьні. Знакавыя творы на гэтую тэму напісалі ў Расеі Аляксандар Салжаніцын — ягонае эсэ «Жыць без ілжы», у Чэхіі — Вацлаў Гавал — ягоны тэкст «Спроба жыць па праўдзе». 25 гадоў таму, у застойнай сацыялістычнай Чэхаславаччыне дысыдэнт Гавал распавёў пра сваю, чэскую мадыфікацыю нашага Васіля Капітонавіча:

*«Дырэктар праскай крамы гародніны зьмясьціў у вітрыне, паміж цыбуляю і морквай, лёзунг «Пралетары ўсіх краін, яднайцеся!»*

*Гэты лёзунг нашаму дырэктару крамы прывезьлі разам з цыбуляй і морквай з базы, і ён павесіў яго ў вітрыне проста таму, што робіць так ужо шмат гадоў, таму што ўсе так робяць, таму што так мае быць. Калі б ён гэтага не зрабіў, мог бы мець праблемы; хто-небудзь нават, можа, зьвінаваціў бы яго ў апазыцыйнасьці.*

*Аднак лёзунг на транспаранце мае таксама функцыю знаку. Як такі ён утрымлівае схаванае, але цалкам пэўнае паведамленьне. Яго можна было б сфармуляваць так: Я, гандляр гароднінай XY, сяджу тут і ведаю, што я павінен рабіць; я паводжу сябе так, як ад мяне чакаюць; на мяне можна пакласьціся і мяне ні ў чым нельга папракнуць; я паслухмяны і таму маю права на спакойнае жыцьцё.*

*Гэтае паведамленьне, само сабой, мае і свайго адрасата: яно скіраванае наверх, да начальнікаў гандляра гароднінай, і адначасова гэта шчыт, за якім дырэктар крамы хаваецца ад патэнцыйных даносчыкаў.*

*Цяпер уявім сабе, што аднаго дня дырэктар крамы паўстане і ня будзе больш выстаўляць транспаранты зь лёзунгамі, якія ён выстаўляў адно каб яго не чапалі; ня будзе больш хадзіць на выбары, пра якія ён ведае, што гэта зусім ня выбары; пачне казаць на сходах тое, што ён сапраўды думае, і знойдзе ў сабе досыць моцы, каб салідарызавацца з тымі, з кім яму загадвае салідарызавацца ягонае сумленьне.*

*Праз такое паўстаньне дырэктар крамы выйдзе з жыцьця ў хлусьні, адкіне рытуал і парушыць правілы гульні. Ён знойдзе сваё прыгнечанае я і сваю годнасьць, ён вызваліць сябе. Ягонае паўстаньне будзе спробай жыцьця ў праўдзе.*

*Рахунак яму выставяць хутка: ён страціць сваю пасаду і вымушаны будзе працаваць шафёрам, развозіць тавары. Ягоны заробак будзе зьменшаны. Яму давядзецца адмовіцца ад надзеі зьезьдзіць на адпачынак у Баўгарыю. Далейшая адукацыя яго дзяцей апынецца пад пагрозай. Начальства будзе да яго чапляцца, калегі будуць глядзець на яго як на дзівака.*

*Насамрэч дырэктар крамы зьдзейсьніў ня толькі нейкае індывідуальнае, завершанае ў сваёй адназовасьці парушэньне, ён зрабіў нешта непараўнальна важнейшае: парушыўшы правілы гульні, ён скасаваў гульню як такую. Ён пашкодзіў структуру ўлады, перарваўшы яе сувязі; ён паказаў, што жыцьцё ў хлусьні — гэта жыцьцё ў хлусьні.*

*Але з прычыны таго, што ўсе сапраўдныя праблемы і крызісныя зьявы схаваныя пад тоўстым слоем хлусьні, да канца ніколі ня ясна, калі ўпадзе, як той казаў, апошняя кропля, якая перапоўніць бочку, і што за кропля гэта будзе. Таму ўлада прэвэнтыўна і амаль аўтаматычна перасьледуе кожную спробу жыцьця ў праўдзе».*

Вацлаў Гавал піша пра непрадказальнасьць усенароднага ўздыму. Ніхто ня ведае, калі і якая кропля перапоўніць бочку. Ніхто, нават ініцыятары аранжавай рэвалюцыі не чакалі, што на майдан выйдзе столькі народу.

Аксамітныя і сьпеўныя рэвалюцыі па сутнасьці сваёй зусім не рэвалюцыі, а выхад з заложнага фону хлусьні ў бязьмежную эўфарыю праўды. Гэта як бы хворы пасьля папраўкі выходзіць зь лякарні ў прахалоднае вясновае паветра і ўдыхае грудзямі



**Народнаму пісьменьніку Васілю Быкаву «народныя ўлады» ні разу не далі слова ні на радыё, ні на тэлебачаньні.**

---

12 лютага 1974 г. **Аляксандар Салжаніцын** надрукаваў зварот да інтэлігенцыі, моладзі, да ўсіх суайчыньнікаў «Жыць без ілжы», у якім заклікаў да асабістага і духоўнага непадпарадкаваньня гвалту ў СССР. У гэты ж дзень Салжаніцын быў арыштаваны, пасаджаны ў Лефортава, дзе яму выставілі абвінавачаньне ў здрадзе Радзіме. На наступны дзень пісьменьніку прад'явілі ўказ Прэзыдыюма Вярхоўнага Савету СССР аб высылцы за межы краіны «за сыстэматычнае зьдзяйсьненьне дзеяньняў, якія не сумяшчальныя з прыналежнасьцю да грамадзянства СССР і наносяць шкоду СССР».
У 1980 г. чэскі дысыдэнт **Вацлаў Гавал** напісаў знакамітае эсэ «Спроба жыць па праўдзе». Абодва эсэ перакладзеныя на беларускую мову.
Эсэ **Сяргея Дубаўца** напісанае роўна праз 25 гадоў пасьля экспрэзыдэнта Чэхіі.

ўсю паўнату жыцьця. Гэта сапраўдны цуд. Вось што перажыла нядаўна Ўкраіна — эўфарыю праўды. Затурканыя сваёй будзённай хлусьнёй Васілі Капітонавічы, можа быць, упершыню адчулі, што такое ёсьць насамрэч іхнае жыцьцё.

Гэтае адчуваньне — вось што адрозьнівае нашу сытуацыю ад сытуацыі тых, хто выйшаў. Не дэмакратыя і свабода ці там адкрытасьць усяму сьвету. Гэта ўжо наступствы. Галоўнае — праўда. Калі Лукашэнка кажа, што пераварот у Кіргізіі быў непазьбежны, бо як можна жыць чалавеку за 7 даляраў, ён зноў хлусіць. Бо гаворка не пра суму. Гаворка пра праўдзівую рэальнасьць. Пра тое, як важна ведаць, што сьвет вакол цябе — насамрэч такі, якім ты яго бачыш. Ніхто нічога не прыдумаў, так і ёсьць. Калі ў Францыі зноў страйкуюць фэрмэры, дык гэта зусім ня значыць, што яны жывуць горш за нас, а нават калі і горш, іхная калясальная перавага — гэта рэальнасьць, адэкватнасьць іхнага жыцьця і яны ніколі не прамяняюць яго на наша.

Той, хто жыў у праўдзе, ніколі не пагодзіцца жыць у хлусьні, няхай сабе і больш забясьпечана, сытна і камфортна.

Калісьці «Пінк Флойд» сьпявалі, што самае страшнае для чалавека — гэта быць кімсьці выкарыстаным. Ты жывеш сабе і жывеш, а нехта за тваёй сьпінаю распараджаецца тваімі думкамі, учынкамі, тваім лёсам. У фільме Алана Паркера «Сьцяна», зьнятым паводле аднайменнага альбому «Пінк Флойд», людзі паступова ператвараюцца ў статак сьвіней. Жахлівае відовішча. Між тым, быць выкарыстаным — зусім нармальны стан для жыхароў патэрналісцкай дзяржавы.

Мы жывём харашо, у нас мірнае неба над галавой і чыстыя вуліцы пад нагамі, мы не галадаем, а што яшчэ трэба?

Слухаючы соты раз гэтую вулічную філязофію, я раптам уразіўся тым, што калі б у сьвіней на калгаснай фэрме можна было ўзяць інтэрвію, дык адказы былі б такія самыя. Плюс яшчэ два пункты: нашто нам тая свабода, мы ня ведаем, што гэта такое, ад каго свабода? І другое: чаму мы павінны жыць так, як яны, мы ж не такія.

Прычым гаворка ідзе ня толькі пра вуліцу. Адзін Лукашэнкаў міністар сказаў неяк журналістам, што ён «человек государев», а колькі такіх, што засталіся на сваіх пасадах пасьля публічных абразаў і аплявух... Гатовасьць быць выкарыстаным стала найвышэйшай доблесьцю беларускага чыноўніка і жыцьцёвай філязофіяй электарату. Тое, што ў «Пінк Флойд» — самае страшнае, што толькі можа з табой адбыцца, у нас — ледзьве не сынонім шчасьця.

Можа быць, гэта «Пінк Флойд» тут схібілі? Не. Яны толькі ўдала выказалі сучасную формулу рабаўладальніцтва і апратэставалі яе.

Раб — гэта зусім ня той, хто ходзіць у рызманах па арэне Рымскага цырку. Раб можа і ў андатравай шапцы расьсякаць паветра менскага праспэкту Скарыны на патрыманым «мэрсэдэсе». Бо раб — гэта тое, што ўсярэдзіне, а ня звонку. Гэта той, хто гатовы да выкарыстаньня.

Найвялікшая хлусьня ў сёньняшняй Беларусі заключаецца ў тым, што нашы эканамічная адсталасьць, прымітыўная мадэль улады, адсутнасьць свабодаў — усё гэта выдаецца за нацыянальную спэцыфіку беларускага мэнталітэту. У гэтым сутнасьць цяперашняе дзяржаўнае ідэалёгіі.

Мы жывём горш за іншых, бо мы не такія. Але чаму б нам, не такім, ня жыць лепей за іншых? Насамрэч, тое, як мы жывём, ня мае ніякага дачыненьня да мэнталітэту. Дакладней, мэнталітэт не падключаны да грамадзкіх працэсаў.

Наш правіцель ня кажа нам, што мы — эўрапейцы, якія былі адным зь перадавых народаў кантынэнту ў эпоху Рэнэсансу, калі будавалі найпрыгажэйшыя ў сьвеце помнікі архітэктуры, стваралі шэдэўр тагачаснае юрыспрудэнцыі — Статут 1588 году і першымі ва Ўсходняй Эўропе надрукавалі кнігу на сваёй роднай мове. Наш правіцель ня кажа, што мы спрадвеку былі народам шляхецкім, адукаваным і спраўным што на зямлі, што на будоўлі, што ў бітвах. І што ўсё гэта напоўніцу адлюстравана ў нашым багатым фальклёры. Калі б ён казаў пра такія рэчы, гэта і было б падключэньнем магчымасьцяў беларускага мэнталітэту да нашае стваральнае працы. І гэта было б праўдай. Але наш правіцель хлусіць. Ён кажа, што мы ніякія не беларусы, а расейцы, ён кажа — наша Масква і наш Пецярбург, хоць яны такія ж нашы, як Лёндан і Парыж. Ён кажа, што нас не было ў гісторыі да бальшавіцкага перавароту, бо да 1917 году ўсё, што мы ведалі — гэта галеча, лапці ды каўтун. І мы згаджаемся, бо прывыклі да гэтай хлусьні за 70 гадоў бээсэсэраўскай прапаганды.

> Гледзячы БТ, гартаючы газэты — што дзяржаўныя, што апазыцыйныя, я ўвесь час натыкаўся на цэлыя напластаваньні няпраўды.

Наша аксамітная, ці сьпеўная, ці аранжавая рэвалюцыя, якую цяпер нам так актыўна прарочаць, адбудзецца не тады, калі прыйдуць гранты або дастане рэжым правіцеля. Грантаў ніколі ня будзе дастаткова, а рэжым мы вытрымаем любы, сёньняшні з тых, якія бачылі, бадай, яшчэ самы лібэральны. Наша рэвалюцыя пачнецца тады, калі нам самім абрыдне наша дробная і бясшкодная бытавая хлусьня.

Калі ж нам расхочацца хлусьні і захочацца праўды? Адказ на гэтае пытаньне зусім ня просты і наўрад ці ляжыць у плоскасьці тыпалёгіяў. Усё ж такі ў тым, што мы ў часы перастройкі паўтаралі шлях іншых — стваралі народны фронт, абвяшчалі дзяржаўнай родную мову, дэклaравалі сувэрэнітэт і незалежнасьць, забаранялі кампартыю — ва ўсім гэтым было болей, так бы мовіць, статкавага інстынкту «куды ўсе, туды і мы», чым высьпелай унутранай неабходнасьці. Бо паралельна з гэтым народ масава галасаваў за захаваньне СССР, а пасьля гэтаксама масава — за Лукашэнкаву рэсаветызацыю. Таму адказ трэба шукаць у глыбіннай прыродзе беларускай нацыі, так непадобнай да ўсіх сваіх суседзяў.

Рэч у тым, што з часоў раньняга сярэднявечча панятак маны або хлусьні адсутнічае ў беларускай літаратуры і юрыдычнай практыцы. Антытэзай праўды ў нас спрадвеку была не мана, а крыўда. Менавіта крыўда, а не хлусьня выступае адным з галоўных юрыдычных паняткаў у знакамітым Статуце 1588 году. І менавіта крыўда супрацьстаіць праўдзе ва ўсёй адраджэнскай літаратуры XIX—XX стагодзьдзяў. Паводле Янкі Купалы, беларусы нясуць сваю крыўду на сьвет цэлы. Комплекс пакрыўджанага ўвогуле дзіцячы, а малыя дзеці ня ведаюць, прынамсі, не ўсьведамляюць адказнасьці за ману.

За сто гадоў пасьля таго, як быў напісаны Купалаў верш, сьвет зьмяніўся. Прайшоўшы праз мноства паралельных рэальнасьцяў, праз ружовыя і брунатныя туманы камунізму ды фашызму, празь не адно масавае ачмурэньне, сьвет зразумеў, што адзінае ягонае выратаваньне — у рэальнасьці, у адэкватным разуменьні таго, што адбываецца з табой і з тваёй краінай. Гэта як пацыент просіць у лекара: доктар, скажыце праўду, якой бы горкай яна ні была. А для чаго? Для таго, каб можна было распарадзіцца сваім лёсам. Праўда важнейшая за ўсе астатнія матывацыі. А цяпер параўнайце гэта з тым, як беларусы адказалі на пытаньне другога Лукашэнкавага рэфэрэндуму ў 1996 годзе. Пытаньне гучала так: ці хочаце вы ведаць, зь якіх крыніц фінансуецца дзяржаўная ўлада? Ні ў якім разе, запярэчылі мы. Гэта як бы доктар спытаўся ў нас: ці хочаце ведаць ваш праўдзівы дыягназ, а мы б адказалі: не, толькі, крый Бог, не кажыце.

Так і жывём.

Для «рэвалюцыі» ў сёньняшняй Беларусі трэба, каб народ, прынамсі, лідэры грамадзкае думкі, перасталі хлусіць. Напрыклад, пра тое, што лёс Беларусі будзе вырашацца ў самой Беларусі — пры тым, што асноўны спадзеў ускладаецца на вонкавыя фактары, а «ў самой Беларусі» нішто не абяцае якіх-кольвек перамен. Усе лідэры апазыцыі гавораць прыблізна тое самае, і словы іх зьліваюцца ў той самы заложны фон.

...Аднойчы ўначы да Васіля Капітонавіча зьявіўся анёл і сувора забараніў яму маніць. Напалоханы пэнсіянэр тры дні ўвогуле маўчаў, пасьля пачаў казаць адну праўду. Вельмі хутка ён зразумеў, што і сямейнікі, і выпадковы спадарожнік у электрычцы, і сусед па сотках пазіраюць на яго, як на дзівака. Жыць стала страшэнна няўтульна і нават пакутна. Кожнае слова, пачутае з тэлевізара або прачытанае ў газэце, выклікала алергію, бо літаральна кожнае было хлусьнёю. І ўсё астатняе, што атачала, раптам стала зьдзіўляць сваёй падманлівасьцю. Незразумелай раптам стала пэнсія — не таму што малая, а таму, што невядома чаму менавіта такая. І камунальныя рахункі былі такія таемныя, быццам іх выпісвалі ў КДБ. А кошты ў крамах браліся яўна «зь лямпачкі». Моцна засумаваў Васіль Капітонавіч. Прысеў на сваіх сотках і першы раз у жыцьці ўсім сэрцам пашкадаваў, што мы не такія, як іншыя, і што ў нас свой гістарычны шлях.

**Передрукоўваецца паводле праграмы радыё «Свабода» «Вострая Брама» «Спроба жыць у праўдзе» і культура падманшчыкаў у Беларусі».**



**Роўнасьць беларускай і расейскай моваў — мана нумар 1. Нават «Навіны» БТ пераведзеныя на беларускую мову.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

## Найтаньнейшая падпіска: сьпіс шапікаў

Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 1500 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:**
вул.Валадарскага, 16, пак.200 227-88-41

**Пункты прыёму падпіскі:**

| | |
|---|---|
| вул.Жукоўскага, 5, корп.1 | 224-32-03 |
| вул.Раманаўская Слабада, 9 | 200-83-04 |
| вул.Кашавога, 8 | 230-29-20 |

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224-03-76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284-83-59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232-46-23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227-11-92 |
| №5 | вул.Енісейская, 6 | 243-16-30 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235-63-11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288-30-20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232-45-10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247-30-15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233-74-88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255-80-71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278-77-61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82/2 | 264-06-42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227-75-55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 203-82-39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234-27-25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231-03-28 |
| №18 | ст.м. «Плошча Перамогі» | 284-31-06 |
| №19 | пр.Машэрава, 5/1 | 223-81-66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271-87-21 |
| №21 | ст.м. «Пушкінская» | 255-57-20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243-16-83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264-36-33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 295-05-74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227-08-52 |
| №26 | пр.Скарыны, 113 | 264-22-91 |

**Шапікі:**

№18 БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4
№18 Пэдунівэрсытэт, вул.Савецкая, 18
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул.Мясьнікова, 39
№136 ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15
№189 Аўтавакзал «Маскоўскі»
№198 БДЭУ, пр.Партызанскі, 26
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2
№228 Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17
№232 Менскі з-д халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61
№245 Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56
№259 Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183
№260 пр.Скарыны, 169
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31
№298 пр.Машэрава, 75/1
№302 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8
№313 Слабадзкі праезд, 24

# Вайсковая мэдыцына

СЯМЁН ПЕЧАНКО

Працяг. Пачатак у нумарах 6, 9, 12—14.

## «Хлопцы, хутка ў сталоўку»

Армейская мудрасьць сьведчыць: няма горшых дактароў і вадзіцеляў, як у войску. Наконт апошніх ня ведаю, а вось з дактарамі ў форме давялося сутыкацца, і неаднаразова. І магу сказаць, што ў нечым мудрасьць мае рацыю. Хоць далёка ня ўсё так страшна, як можа падацца на першы погляд. Часам ня самі ўрачы, а вайсковая сыстэма прымушае наракаць на нейкія малапрыемныя моманты. Лепш за ўсё зусім не хварэць, але гэта нерэальна. Таму час ад часу даводзіцца салдатам зьвяртацца па дапамогу ў санчасьць. Для гэтага існуе адмысловая працэдура: на ранішнім аглядзе той, хто адчуў сябе блага, мусіць запісацца ў спэцыяльную «Кнігу запісу хворых». Але ня факт, што хворы тут жа можа накіроўвацца да доктара. Прыём хворых у войску адбываецца па абедзе а 15-й. Таму, калі вас непакоіць зубны боль ці нейкія мазалі — адным словам, нешта нязначнае, — вы мусіце пачакаць. Тэрміновы агляд хворых адбываецца толькі ў крайніх выпадках, калі адцягваць немагчыма. Калі ж у падразьдзяленьні нейкі аўрал і не хапае людзей, вашы зубы і мазалі могуць пачакаць і дзень-два.

З вайсковай лякарняй у любым выпадку давядзецца неаднаразова сутыкацца падчас плянавых мерапрыемстваў — флюараграфіі, розных прышчэпак (ад грыпу, слупняку). Вакцынацыя падабаецца салдатам — яна дае магчымасьць цягам дня цалкам законна «адкасіць» ад фізычных мерапрыемстваў, асабліва калі ўкол робіцца пад лапатку. Пасьля гэтай працэдуры ня толькі немагчыма падцягвацца на перакладзіне, але і бегаць праблематычна. Апроч таго, у чаканьні сваёй чаргі можна не адну гадзіну правесьці ля санчасьці, забыўшыся на нейкі час на заняткі і казарму. А што можа быць лепш у войску, асабліва ўлетку, як нечакана для сябе апынуцца ў засені дрэваў на траўцы!

У санчасьці таксама ўсё паводле раскладу, але рэжым больш вальнейшы. Раніцай замест абрыдлага «Рота, пад’ём!!!» чуеш прыемны голас дзяжурнай мэдсястры: «Хлопцы, прачынайцеся, хутка ў сталоўку». Тут можна будзе зэбольшага адаспацца, пачытаць літаратуру, напісаць ліст.

Аднак ёсьць і адваротны бок мэдаля. Калі трапіць сюды ў нейкі адказны момант — напрыклад, на час навучаньня ў вучэбцы, — ёсьць імавернасьць адстаць у вучобе ад астатніх. Асабліва даецца ў знакі гэтае адставаньне ў часе выконваньня страявых прыёмаў пасообку, а яшчэ горш у агульным страі. Калегі не абмінуць нагадаць вам пра вашы летуценьні ў санчасьці, наступаючы на пяткі і суправаджаючы гэта злосным шыпеньнем: «Што, размарыла цябе ў санчасьці?» І сапраўды, адарванасьць ад падразьдзяленьня, нават на непрацяглы час, вельмі адчувальная па вартаньні, бо хворых у войску ніхто ня любіць, падазраючы іх у тым, што яны «косяць». Хоць ніхто з салдатаў не адмовіцца на нейкі час залегчы на бальнічны ложак.

## «Глядзі, не пераблытай!»

Бывае і так, што ў санчасьць трапляюць «патрэбныя» людзі — тыя, хто мае карысную цывільную спэцыяльнасьць: зьвілася патрэба адрамантаваць кабінэт ці пакоі для хворых, асабліва напярэдадні нейкай інспэкцыі, — і пачынаюць раптам хварэць маляры, майстры па аздабленьні, тынкоўшчыкі. І хварэюць, не зважаючы на вучэбную праграму, аж пакуль ня зробяць неабходнай працы. Нехта пасьля мае шанец уладкавацца ў вайсковай сталярцы, што таксама дазваляе забыцца на заняткі. Часта такія салдаты ня маюць вялікай ахвоты дый здольнасьцяў да вучобы, таму і выкарыстоўваюць іх больш рацыянальна.

Багата хто з вайсковых урачоў мае свой адмысловы сродак — панацэю ад усіх хвароб. Гэта можа быць звычайная зялёнка ці мазь Вішнеўскага, якімі мажуць усе балячкі, вывіхі, нацёртасьці. Яшчэ да службы ў войску я пачуў гісторыю пра асьпірын: прыходзіць да доктара баец і пачынае скардзіцца на галаўны боль і праблемы са страўнікам. Доктар вымае з шафкі касэту асьпірыну, дзеліць адну таблетку на дзьве часткі і, аддаючы салдату, гаворыць: «Паўтаблеткі ад галавы, палова ад страўніка — глядзі не пераблытай!» У часе службы я з такім не сутыкаўся, тут да праблем страўніка ставіліся больш адказна — хвораму салдату прызначалася асобнае дыетычнае харчаваньне. Кухаркі, раздаючы порцыі, жартам пыталіся: «Хто тут з вас гастрыт?»

У нас валадарыла мазь Вішнеўскага, і я дагэтуль не магу пазбавіцца ад яе паху, бо амаль месяц правёў у санчасьці з распухлай нагой — у першы ж тыдзень службы няўдала саскочыў з другога ярусу і разьвярэдзіў старую траўму. Нага моцна распухла, і я мусіў спалучаць заняткі па страявой зь лекавымі працэдурамі. Калі прынялі прысягу і на нейкі момант напружанасьць з заняткамі спала, я некалькі тыдняў адпачываў. Такія моманты, як нейкія траўмы, хваробы, заўсёды выклікаюць падазрэньні, а бывае, што і на допыт да асабіста выклічуць: а ці не спэцыяльна ты нанёс сабе шкоду, ці, можа, хтосьці нават дапамог? Наглядная сытуацыя: салдат у нарадзе па сталоўцы а чацьвёртай раніцы падымаецца, каб насячы дроў для кухні. Спрасонку прамахваецца і трапляе сякерай сабе па назе. Паралельна зь лячэньнем праводзіцца высьвятленьне акалічнасьцяў, і ніякія нармальныя довады, што папросту хацелася спаць, не дапамагаюць. Ратуе салдата толькі выдатная характарыстыка і відавочнае жаданьне служыць у войску.

Найбольш часта салдаты скардзяцца на мазалі і прастуды. З мазалямі змагаюцца бязьлітасна і досыць балюча: пухір рэжацца скальпэлем і ранка апрацоўваецца перакісам вадароду, ад чаго яна пачынае нават шыпець. Затым усё гэта залепліваецца плястырам. І так да наступнага разу.

## Служба ў мэдвойсках

З нашай мэдслужбай я вялікіх праблем не зазнаў, хоць начмэд, паводле слоў дасьведчаных людзей, па спэцыяльнасьці быў нэўрапатолягі. Запомніліся яго заняткі па вайсковай мэдыцыне, а таксама інструктажы, прысьвечаныя правілам купаньня ў адкрытых вадаёмах і спосабам выратаваньня тапельца, якія праводзіліся вельмі эмацыйна і наглядна, з прыцягненьнем да справы «тапельца». Добразычлівымі і неабыякавымі былі мэдсёстры, а таксама варта згадаць добрым словам стаматоляга — выдатнага спэцыяліста і проста харошага чалавека.

Ёсьць выпадкі, калі менавіта вайсковая мэдыцына выклікае ў былога ўжо салдата цёплыя і ўдзячныя ўспаміны пра армію ўвогуле. Адна з такіх гісторый адбылася яшчэ за саветамі. Трапіў у войска вясковец, які меў зьнявечаны яшчэ ў дзяцінстве твар: конь ударыў яго па твары капытом, ад чаго ніжняя сківіца моцна выступала ўперад. Вайсковы лекар зацікавіўся гэтым выпадкам і прапанаваў салдату апэрацыю ў вайсковым шпіталі, папярэдзіўшы, аднак, што справа гэта досыць рызыкоўная. Хлопец пагадзіўся. З паўгоду ён правёў у шпіталі і перанёс некалькі складаных апэрацый. Але вынік пераўзышоў усе чаканьні, і калі ён вярнуўся дамоў, то яго не адразу пазналі. Асабістае жыцьцё таксама непазнавальна зьмянілася, і цяпер гэты ўжо пажылы дзядзька толькі з прыемнасьцю ўспамінае войска і яго дактароў.

Часам здараецца, што ў войска трапляе малады чалавек з цэлым наборам хвароб, што, аднак, не пазбаўляе яго абавязку служыць. Ён мае пэўныя абмежаваньні па прыдатнасьці да службы і зазвычай трапляе ў больш «лёгкія» часьці, дзе нібыта няма вялікіх фізычных нагрузак. Але ў войску заўсёды даводзіцца зь нечым змагацца, напрыклад, зімой — са сьнегам, а гэтую працу лёгкай аніяк не назавеш. На «часткова прыдатных» у гэтым выпадку не зьвяртаюць увагі. Ну і сапраўды — ці да твару сапраўднаму мужчыну жаліцца на нейкія балячкі, ды яшчэ ў войску! Вось і пачынаюць абвастрацца ўсе гэтыя «дробязі», і ў выніку малады абаронца ці ня ўсю службу абараняецца ад сваіх хвароб, амаль не вылазячы са шпіталяў. Пра такіх жартуюць, што ён служыў у мэдвойсках. Адсюль пытаньне: навошта прызываць у войска такі кантынгент, які пасьля даводзіцца на працягу ўсёй службы лячыць? Пры тым што кожнаму новаму прызыву абавязкова кажуць, што гэтым разам пайшлі служыць найлепшыя зь лепшых.

Як бы там ні было, зычу ўсім, хто служыць, ня мець праблем са здароўем і здаровымі вярнуцца дадому.

Працяг будзе



PHOTO.BYMEDIA.NET

У войску заўсёды даводзіцца зь нечым змагацца.

# Калдуны

Сапраўдныя калдуны ядуць лыжкай, каб не разарваць цеста і не дазволіць выцечы далікатэснаму соку. Сапраўдныя калдуночкі трэба не раскусваць, а толькі раздушваць языкам аб паднябеньне, каб раздаваўся характэрны піск. **Алесь Белы** пра культавую страву беларусаў.



WWW.LITAUEN-INFO.DE

Што рабіць, калі сям'я сабралася позна ўвечары, трэба тэрмінова гатаваць вячэру, а моцы і натхненьня няма? Нехта замовіць па тэлефоне піцу. Старэйшае пакаленьне, выхаванае за саветамі, палезе ў халадзільнік па пачак пяльменяў. Савецкія людзі ганарацца пяльменямі. Украінцам варэнікі самі скочуць у рот; палякі частуюць гасцей «пярогамі». У італьянцаў — равіёлі, ва ўзбэкаў — манты… А беларусы зноў «нічога ня маюць»? А як жа калдуны?

Гэта самая загадкавая наша страва. Ужо сама назва папярэджвае пра гэтую вусьціішную таямнічасьць. Адкуль прыйшлі да нас калдуны? Ёсьць меркаваньне, што з Захаду. На сярэднявечнай лаціне слова «calduna» азначала «цёплыя яшчэ вантробы забітых жывёл», ад «calidus» — «цёплы». То нібыта ў старабеларускую мову гэтае слова трапіла ў XV ст. ці зь нямецкай, ці з чэскай — відаць, ад тых воінаўінтэрнацыяналістаў, якіх Вітаўт дасылаў на дапамогу Жыжку.

## Сапраўдныя ядуць лыжкай

Беларускія татары лічаць, што калдуны ў балотны край прынесьлі яны, і называюць гэтую страву «кундумы». Гатуюць іх (досыць вялікіх памераў) на кожнае сьвята: цеста замешваюць на вадзе і яйках, для начынкі ўжываюць сечаную цяляціну ці ялавічыну з дабаўленьнем прыправ, цыбулі, перцу і солі. Калдуны татары ядуць лыжкай, каб не разарваць цеста і не дазволіць выцечы соку — далікатэсу для гурманаў. Іншы рэцэпт татарскае начынкі — у роўных долях узятыя бараніна, ялавічына-паляндвіца і барані лой.

Калдуны можна варыць, запякаць, смажыць на патэльні, блясе або ў фрыцюры. Тыя ж татары калісьці смажылі іх у бараннім лоі. Усё залежыць ад цеста. Самае простае цеста робяць з мукі, замяшанай на цеплаватай вадзе з дабаўленьнем солі. Але даўней у кожнай самавітай гаспадыні быў свой сакрэт цеста: хто дадаваў яйкі, хто алей, а хто соду. Кажуць, што сапраўдныя «ліцьвінскія» калдуны трэба замешваць не на вадзе, а на соку з цыбулі. Паспрабуйце: вось калі дасца ў знакі горкая доля беларуская! У кожным разе, сапраўднае цеста на калдуны мусіць быць мяккім, элястычным, добра цягнуцца, каб кавалкі яго можна было лёгка фармаваць і склейваць. Як сьлед вымешанае цеста трэба загарнуць у анучку і пакінуць на нейкі час у халадзе, каб «адпачыла». Калі будзеце ляпіць чарговы калдун, пакідайце астатняе цеста накрытым ручніком, каб не высыхала, укладайце сфармаваныя калдуны на пасыпанай мукой паверхні.

## Палескія — смажаць

Фарш можна рабіць з чаго хочаш. Калісьці самымі папулярнымі былі тваражныя фаршы, але былі і мясныя, і рыбныя, і нават фруктовыя — з сушаных вішань, сьліў або чарніц. Так што калдуны могуць быць і цяжкай, асноўнай стравай, а могуць і дэсэртам. Да тварагу дадавалі эстрагон, а калі начынялі белым сырам, дык да яго дадавалі ў роўнай долі насыпка звараную грэчку.

Фарш мусіць быць ані занадта цьвёрды, ані занадта глейкі — найлепш, калі ўдаецца сфармаваць зь яго невялікія «галкі». Не павінен трапляць паміж зьлепленымі краямі цеста, каб потым калдуны не расклеіліся. Варыць найлепш у пляскатым шырокім рандэлку, на малым агні, у вялікай колькасьці добра пасоленай вады, каля пяці хвілін ад моманту ўсплываньня на паверхню. Але некаторыя гатункі калдуноў лепей смажыць. Напрыклад, «палескія» (фарш: на 500 г варанай рыбы 3 філе селядца, 2 яйкі накрута, дзьве лыжкі пятрушкі і адзін жаўток) найлепш смажыць у фрыцюры.

## Калдуны Тышкевіча — «appellation contrôlée»

Літоўцы паспрабавалі прысвоіць сабе гонар вынаходзтва як калдуноў увогуле, так і ў прыватнасьці калдуноў графа Тышкевіча. «Калдунай Цішкявічуса» — гэта трэба такое вычварэньне прыдумаць!

Сорамна, што акадэмікі з прафэсарамі ад веку не цікавіліся Тышкевічавымі калдунамі. Тэма ім, бач, задробная. А гэта ж адна з самых вялікіх загадак беларускай гісторыі — якому з графаў Тышкевічаў належыць гонар вынаходзтва славутых калдуноў? Археолягу Яўстаху або Міхалу, палкоўніку 17-га палка напалеонаўскіх уланаў?

Я веру: прыйдзе дзень, і Вышэйшы гаспадарчы суд, ЮНЭСКА і Міжнародны арбітраж прысудзяць менавіта беларускім *калдунам Тышкевіча* статус «appellation contrôlée» — стравы, кантраляванай паводле месца паходжаньня, як шампанскаму, каньяку і гарэлцы «Сталічная». Але да гэтай нашай Вялікай Перамогі яшчэ досыць далёка.

## Цеста на калдуны

2 шклянкі мукі, гатаваная вада, яйка, соль.
Старанна замяшаць цеста і тонка раскачаць.

## Цеста ліцьвінскае

400 г мукі, 3—4 лыжкі соку цыбулі, 2 яйкі, 2 сырыя жаўткі, соль (на 4 порцыі, прыгатаваньне — 10 хвілін).

Прасеяць муку, зрабіць паглыбленьне, убіць туды яйкі і жаўткі, уліць сок цыбулі і старанна замяшаць цеста (не дадаючы вады!). Накрыць накрыўкай, пакінуць, каб адпачыла (каля 30 хвілін). На пасыпанай мукой дошцы раскачаць цеста, выкраіць круглыя кавалкі, напоўніць згатаваным фаршам, склеіць. Гатаваць партыямі ў падсоленым кіпні.

## Фарш віленскі грыбны

150 г сушаных грыбоў, 1—2 лыжкі цёртай булкі, 200 г вэнджанай шынкі, яйка, 1—2 цыбуліны, лыжка масла, соль, перац (на 4 порцыі, прыгатаваньне — 30—40 хвілін).

Памытыя грыбы вымачыць у невялікай колькасьці вады, згатаваць, адцадзіць і разам з шынкай прапусьціць праз мясарубку. Парэзаную цыбулю падсмажыць у растопленым масьле, зьмяшаць з грыбамі і шынкай, дабавіць солі і перцу на смак, убіць яйка, дабавіць цёртай булкі, сфармаваць масу. Пасьля прыгатаваньня калдуноў падаваць іх, паліўшы растопленым маслам ці лоем. Падобны фарш таксама шырока ўжываецца ў лазанках.

## Тышкевічаўскія калдуны

Соль, перац, 2 лыжкі масла, 140 г сушаных грыбоў, 2 цыбуліны, 200 г тлустай вэнджанай шынкі, 2 яйкі, звараныя ўкрутую, і адно сырое.

Памытыя і вымачаныя грыбы згатаваць. Парэзаную цыбулю падсмажыць на масьле, дабавіць парэзаныя грыбы, крыху пасмажыць разам, перамешваючы, астудзіць. Дабавіць пакрышаныя вараныя яйкі і шынку, заправіць на смак сольлю і перцам, старанна перамяшаць, дадаўшы сырое яйка. Вылепіць маленькія піражкі, варыць каля пяці хвілін на малым агні.

## Падліўка залежыць ад фаршу

Соўс, ці падліўка, які падаюць да калдуноў, залежыць ад фаршу. Да «віленскага» фаршу (шынка і грыбы) пасуе топленае масла або сала, да «рускага» (на 800 г варанай бульбы 200 г белага сыру, дзьве цыбулькі і дзьве лыжкі масла) — густая кіслая сьмятана. Да «грубых» — пасіраваная цыбуля, да далікатных — узьбітыя вяршкі з цынамонам, а нават і фруктовы сыроп.

Хто сказаў, што ў наш уніфікаваны век няма прасторы для творчасьці? Ды адных толькі варыянтаў спалучэньня цеста, фаршу, спосабу прыгатаваньня і соўсу больш, чым каналаў у спадарожнікавай талерцы!

У Польшчы шмат у якіх кнайпах госьцю прапануюць паважную карту «пярогаў»; літоўцы таксама завялі былі сабе «калдуныя», але чамусьці справа ў іх не пайшла. Мусіць, «папярхнуліся» беларускай стравай. Сядзяць цяпер моўчкі па дамах, даявіцца — ад крадзенага не пасыцееш. Добра, пакінем ім іхныя шалтаносы — грэцкія калдуны з тварагом. А вось ужо вушак да вігілійнага баршчу не аддамо.

Хай жа натхняе нас прыклад украінцаў, якія здолелі стварыць нацыянальную індустрыю варэнікаў, што пасьпяхова супрацьстаіць імпэрыялістычнай экспансіі пяльменяў!.. Леташнія драматычныя «аранжавыя» падзеі надалі гэтай высакароднай справе новы імпульс. Цяпер у нацыянальнай фаст-фуд-сетцы «Швыдка», падаючы варэнікі, да вас ня толькі зьвяртаюцца выключна па-ўкраінску, але і старанна тлумачаць, што зьлепленыя рукамі варэнікі — зьява нацыянальнай культуры.

У добрых ліцьвінскіх сем'ях ведаюць, што сапраўдныя калдуны, невялікія, акурат клаліся ў рот, але не раскусваліся, а толькі «раздушваліся» языком аб паднябеньне, выдаючы характэрны піск. Дай божа табе пачуць гэты піск, шаноўны чытачу!



ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

**АЛЕСЬ БЕЛЫ** (нар. у 1968 у Менску) — дасьледчык гісторыі матэрыяльнай культуры. Сябар рэдкалегіі часопісу «Спадчына». Ляўрэат прэміі Беларускага ПЭН-цэнтру імя Ф.Багушэвіча 2001 г.

# Нямецкі папа

апавяданьне

СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ

Бам-бом, бам-бом, бам-бом! — гулі званы над брукам і панад дахамі жылых камяніц, палацаў, храмаў і турэмнымі будынінамі. Гук ляцеў праз вуліцы, як у лябірынтах. Рэха адбівалася ад сьценаў, вокнаў, аканіц, мансардаў, дахаў і комінаў ды скакала, як мячык, сярод камяніц, рухаючыся ўлукаткі, самымі нечаканамі траекторыямі, рыкашэтам.

Імя новага папы Акінчыц пачуў з жывога эфіру польскай радыёстанцыі і адразу пабег у касьцёл. Горад апусьцеў. У каменных будынках побач з касьцёлам забралі сабакі, гуртам абазваўшыся на біцьцё званоў. У былым кляштары, цяпер за сьценкай касьцёлу, дакладней, за высозным мурам, турма строгага рэжыму — тыя, хто забіваў, рабаваў, гвалціў.

Апошняя вечаровая імша не зацягнулася, усе хуценька разышліся па дамах, і толькі тады на ўвесь сьвет абвясьцілі імя новага папы. Habemus Papam! «Папу абралі, папу абралі! — суцэльна, у якойсьці тэнарнай афарбоўцы гучала ў небе бронза. — Новы папа ёсьць ужо! Імя вядома!» Але ўсе засьпяшаліся дахаты, не дачакаўшыся. Панцыры парасонаў, настаўленыя каўняры.

На дыктафоне — шоргат падэшваў самога Акінчыца, віскат гумовых апонаў на турэмным рагу. І праз усё — званы, званы, званы. Толькі сабак у запісе няма, яны выконвалі хорам свой вартаўнічы зьвяглівы сьпеў за таўшчэзным, неадольным пабеленым мурам. Калі ён падбегам сьпяшаўся трапіць у касьцёл, зайграла музычка, Акінчыц атрымаў SMS: he certainly looks like a Pope. Акінчыцу трэба зрабіць рэпартаж для радыё, запісаць галасы ксяндза і вернікаў.

У Ватыкане падаў дождж і сьвяціла сонца. Тут надвор'е было падобнае. Зь неба ляцелі рэдкія дажджавыя кроплі, ёдкія, бо стала халаднець. З-за рага, як поўху, кідаў у твар вецер наводліў жмені халодных кропляў і нават калючага жвіру. Касьцёл ён убачыў здалёк — у канцы вуліцы, як у канцы калідору. Званы загучалі, калі ён ужо быў за якіх дзьвесьце крокаў.

Калісьці Акінчыц прачытаў у «Нашай Ніве» аповед пра касьцельна-турэмны квартал, цяпер ён яго пазнаў. Імя аўтара было чамусьці нямецкім. У былых кельлях вязьні марылі пра бутэрброд з галяндзкім сырам і каву са згушчонкай, а на вышках змагаліся са сном вартавыя-чуркі. У апавяданьні былі яшчэ навагодні салют ды сьвяточная музыка касьцельных званоў, толькі сабак хіба не было. Відавочна: апавяданьне было надрукавана пад нямецкім псэўданімам, тады сам Акінчыц захапляўся ўсім нямецкім — кавай, півам, віном, машынамі, нават шакалядам. А ў «Люфтганзу» быў папросту закаханы.

Бабулькі сьпяшаліся да свайго вязаньня, да коцікаў, якім трэба даць крывянкі ці лівэркі або нават падсыпаць кіці-кету. Дахаты, да сваіх пэнсіянэрскіх клопатаў і страхаў, ад якіх ратуе толькі музыка і сьпеў храму. Вязаньне, коцікі, крыцыфікс на сэрванце, К+М+В на дзьвярах, манная каша на пліце. На сьцяне фатаграфія ці некалькі. Жаніх, брат ці бацька ў форме польскага ўлана. А таксама чакаюць пакаёвыя кветкі, якія трэба не забывацца паліваць. Катоў запрашаюць да касьцёлу толькі раз на год — разам з сабачкамі ды іншымі хатнімі зьвяркамі, у дзень заступніка братоў нашых меншых, каб папырскаць сьвятой вадою.

Арханёлы на шпіцах касьцельных званіц загулі ў трубы свае: «Новага папу атрымалі, новага папу! Радуйцеся, парафіяне!..» Яны дзьмулі ў нашараваныя бліскучыя трубы і пакручваліся ўлева-ўправа. Арганы зарыпелі сваім раматусам, спрабуючы, паступова аднаўляючы ў памяці, прыгадаць ухвальныя гімны, якія выконваюцца з гэткай выключнай урачыстай падзеі. Яны паўтаралі моўчкі на памяць уступы традыцыйных імшалаў, сьпеваў, якія выконвалі ў нядзелі і штодня.

Дробна затрымцелі кандэлябры, і асабліва тая вялізная груваcткая, але пекная, падвешаная да галоўнага — высокага і вялікага — купалу. Яна зьвісала на такім доўгім дроце, што вернікі на набажэнстве калі глядзелі ўгару, то маглі бачыць, як кандэлябра круціцца туды-сюды, па некалькі абаротаў, дэманструючы людзям нейкае падабенства да гіганцкагаківача Фуко. Нібы паветраны валатоўскі ваўчок.

«Гораду і ваколіцам». Сьпярша абвяшчалі жыхарам суседніх вуліц — караля Баляслава Рэмшы, Замкавай, Божаслава — сярэднявечнага кашталяна замку, Сьвятога Губэрта, Дамініканскай, а таксама розных савецкіх з імёнамі рэвалюцыйных катаў ды ахвяр. Ад навакольных кварталаў да Фарштату ды ўсяго іншага гораду за шырокай ракой. Сын Марыі ды Язэпа абраны нашым новым папам!.. У турме больш за ўсіх слухалі званы, асабліва апошнімі днямі, калі хавалі старога папу і выбіралі новага. Званы гучалі ў камэрах, заглушаючы сабачы брэх знадворку. Вязьні і ксяндзы слухалі званы пароўну.

Навіна атрымалася запозьненай. Кардыналы гатовыя былі абвясьціць яе пляцу Сьвятога Пятра, усяму першаму Рыму і астатняму сьвету значна раней, значна. Колькі эмоцый, мільёны слоў радыё- і тэлекамэнтатараў, тысячы гадзін сусьветнага эфірнага часу, які каштуе вельмі-вельмі дорага, бо рэкляма чакала, столькі здагадак — калі ўсё было ўжо вядома, прынамсі, некаторым… столькі чаканьня…

Усё праз гэтую сыкстынскую печку. Печка-галяндка, якой даўно не карысталіся. Праўда, яе агледзелі, каб не было бомбы. На дах залезьлі, нават зьнялі мэталёвы комін, нашаравалі яго, дымаход таксама агледзелі пільна і падрыхтавалі, само сабой. Але працавалі зусім не камінары, а супрацоўнікі бясьпекі ў камбінэзонах камунальнай службы. Усё стала больш празаічна, няма былой тэатральнасьці.

Разам з кардыналамі ў капліцы замкнулі абслугу, лекараў, але толькі не апальшчыка. Ну, здавалася б, што складанага: ёсьць крамныя навошчаныя пруткі, папяровыя пакеты з вугалем, ёсьць адмысловыя вялікія запалкі? Але ўсе страцілі ўмельства, будзённыя навыкі былых часоў. Ламалі навошчаны распал, запалкі выпадалі з рук, варушылі качаргой, дзьмухалі — агню, сапраўднага, роўнага, упэўненага агню не атрымлівалася, толькі кволае падабенства — адвядзі вочы на хвілю, і ўсё згасьне. Няма дыму без агню, а агонь не распальваўся, нібыта каб прадоўжыць задавальненьне ад трымценьня тых, хто чакаў, калі нарэшце абвесьцяць імя, якога прагнулі пачуць тысячы на пляцы Сьвятога Пятра і мільёны — у сьвеце.

Кардыналы зьніякавелі, яны нэрваваліся, што спазьняюцца. Што падумае пан Бог пра іхнюю марудлівасьць і няздатнасьць у некаторых справах? Ім зрабілася няёмка нават аднаму перад адным. Ня будзеш жа тлумачыць іншым, што дома ня маеш печкі ці каміну, а калі маеш, дык распальваеш ня сам. Усё гэта недарэчна атрымліваецца, але рытуал, традыцыі… У пэўным сэнсе сёньня гэта выглядае як правілы гульні, якіх нельга парушаць, як сцэнар для спэктаклю, у якім не прадугледжваецца імправізацыі.

Дымы над горадам, утульныя шлейфы ў неба, якія сьведчаць пра цяпло ў дамах, пра згатаваную ежу, пра кіпень у чайніку для гарбаты, пра сьпечаны гарачы хлеб. Цяпер дымы засталіся толькі ў падручніках з выявамі старых гравюр. Рамесьнікі на Падоле — кушняры, шаўцы, пекары; дым над дахамі. Каралеўскі падворак на месцы, дзе пазьней паставілі палац; дым з высокіх комінаў.

Коміны на старасьвецкай камяніцы біскупскай курыі ўвечары і ўначы асьвятляюцца, нібы вежачкі на даху. Камінар сёньня хіба жыве ці папросту працуе ў турме. Толькі там яшчэ дзейнічаюць коміны, і зь іх часам узьнімаецца белы дым… Гэтая прафэсія амаль вымерла, як занятак майстра, які рамантуе мэханічныя друкаркі.

Штосьці даўно ён ня бачыў камінара ў горадзе, толькі падумалася Акінчыцу, але ён сябе адразу перапыніў: а ці бачыў яго ўвогуле? Ці шмат людзей у нас сёньня напраўду бачылі жывога камінара? Мабыць, у нашым горадзе ніхто ўвогуле яго не сустракаў, можа, толькі ўяўленьне мае са «скрынкі».

Сам Акінчыц калісьці бачыў камінара насамрэч, прынамсі, гэты першы выпадак у жыцьці ён запомніў назаўсёды. Гэта было, дарэчы, у Нямеччыне, у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Акінчыц быў школьнікам, а нямецкі камінар — даўгалыгім маладзёнам з роварам у руках. У яго быў выгляд і прылады сапраўднага чысьцільшчыка комінаў — чорны цыліндар на галаве, чорнае трыко і вадалазка, чорныя чаравікі і чорны ровар з прытарнаванымі шчоткамі, запэцканымі ў сажы. Акінчыц стаяў і глядзеў на яго моўчкі, пакуль той ня сеў на ровар і, зірнуўшы з усьмешкай на школьніка Акінчыца, не паехаў сваёй дарогай.

У Акінчыца на сьцяне таксама расьпяцьце і К+М+В на дзьвярах.

Памятны сюжэт на «Euronews» пад рубрыкай «No comment»: у вакне прамоў цяперашні нябожчык-папа і дзеці — дзяўчынка і хлопчык, якія трымаюць па беламу голубу. Выпусьцілі — галубы заляцелі ў пакой. Нямоглы нават звонку папа ўзяў аднаго, які сеў на падваконьне, падкінуў, як здолеў, голуб заляцеў у пакой. Потым абодва апынуліся на падваконьні, папа іх асьвяціў знакам крыжа, і яны паляцелі… Папа быў добрым чалавекам, яго ўсьмешка нейкая хітравата-сарамлівая, але прывабная.

А яшчэ ён перакладаў голас папы для радыёэфіру. Цяжкасьці перакладу. Ён гаварыў на італійскай, якой Акінчыц не разумеў, запіс атрымаўся кепскі, але ў Акінчыца быў тэкст, праўда, на іншай мове, які трэба было зноўку перакласьці, — падвойны пераклад. Дыкцыя ўжо была парушана. Цяжкасьць была і ў тым, што Акінчыц бачыў недакладнасьці, што датычылі сьвятарскай мовы, але ня мог іх выпраўляць адвольна, толькі зважаючы на памяць аб касьцельных казанях, якіх даўнавата ня слухаў, ня чуў. Так-так, ён перакладаў голас папы, гаварыў, можна сказаць, ягоным голасам. Несамавітае здарэньне, незвычайны выпадак. Прыгода, падобная да выкананьня тэатральнай ролі, калі ты ня маеш дачыненьня да тэатру і акторства.

Акінчыц патрымаў у руках бутлю vino de mesa, але выпіў лямпку каньяку. «За Ратцынгера», — вымавіў ён сам сабе, пакруціўшы кілішак, у якім алейны след напою расьцякаўся па сьценках… На каленях Акінчыца сядзеў яго кот. «За Ратцынгера», — паўтарыў ён, і ў гэтым прозьвішчы прагучала штосьці сярэдневечна-жалезнае, штось тэўтонскае. І павеяла тымі яшчэ першымі місіянэрамі, якія хрысьцілі, каб стаў каралём, Міндоўга ў Навагрудку. Ратцынгер. Дальбог, гучыць як «Вялікі магістар рыцарскага ордэну».

Тамака быў таксама і старэнькі кардынал з тутэйшых краёў, але ў Сыкстынскую капліцу яму ўваход быў забаронены. Кардынал, якому не дазволена галасаваць, бо занадта стары. Можна і патрэбна адно маліцца за ўдалае заканчэньне. Цікава — за каго б ён аддаў свой голас, калі б апынуўся сярод канкляву? Што, кот, ты мяне слухаеш так уважліва? Табе цікава? Так, цікава, а ці кожны ксёндз марыць у глыбках душы стаць папам, як пісьменьнікі мараць пра Нобэля? Ты ня ведаеш? Так, ты ня ведаеш, я таксама.

Ты хацеў бы ў тым Ватыкане пажыць? Ня знаеш? Я таксама ня ведаю. Хіба што папскім гвардзейцам пабыць. Гэта і не замежны легіён, і не тэатральная масоўка зусім. Калісьці я марыў апынуцца ў рыцарскіх латах ці адзецца сярэднявечным жаўнерам. Можа, і цікава было б у кірасе з алебардай у вольны час хадзіць у звальненьне ў Рым, езьдзіць на мора, у Вэнэцыю, спыніцца там на некалькі дзён і пісаць, паглядзець, як там пачнуць мэтро падводнае будаваць. Цябе я таксама вазьму з сабой, калі надумаю, ня бойся.

Але, мабыць, я не адпавядаю іхнім вымогам. Тады хіба папрасіцца на ватыканскае радыё? Як ты думаеш? Ніяк?

Коцік у папы таксама мусіць быць, ты ня думаеш? Увогуле, каты ватыканскія мусяць існаваць. Павінен жа нехта мышэй лавіць у базыліцы Сьвятога Пятра?.. Калісьці Акінчыц глядзеў фільм пра рымскіх катоў, якія жывуць у старажытных развалінах Калізэю. У папы таксама абавязкова павінны быць каты, цэлая гвардыя катоў. Кашэчая ахова харчовых прыпасаў ад мышэй.

Дакладная прымета, што ў кватэрцы стала халадней, — кот, як малое дзіця, ня злазіў з каленак, калі Акінчыц пісаў, залазіў да яго на рукі, калі ён уставаў, і яны так разам хадзілі, каб запарыць кавы, узяць кніжку, уключыць сьвятло. Асабліва падабаўся кату Акінчыцаў швэдар — нібы кальчуга, за якую можна было трывала ўчапіцца кіпцюрамі.

Кот забраўся да яго пад коўдру і ўладкаваўся, як яму было ўтульней. Рука Акінчыца звыкла пачала перабіраць поўсьць, крыху казычучы футранога прыяцеля. Бог стварыў катоў, каб людзям было весялей жыць, паўтараў сабе ён, пакрысе засынаючы.

Сьніў Акінчыц, як у нейкім нямецкім мястэчку, накшталт таго, дзе яны калісьці жылі з бацькамі ў ГДР, ён каштуе каву па-кардынальску і папскае печыва, а гаспадар гаштэту бясплатна частуе яго кактэйлем «Ратцынгер» з каньяком: ну і як — ці смакуе? Калі яны трапілі ў ГДР, яго перш за ўсё ўразіў менавіта смак печыва, якое адрозьнівалася ад шахматнага і цалиннага, як торт ад батона. Згадка пра гэта нейк мімаходзь узьнікла ў сьпячай Акінчыцавай сьвядомасьці. Потым адбылося мікшаваньне кадраў, ці Акінчыц папросту часова праваліўся ў прорву сну бязь відэапэрагу. У чорную нетру, дзе ў глыбіні няма сьвятла, як у апараметнай пячоры, да якой з паверхні кіруе доўгі лябірынт. Нейкі старэнькі ў сьвятарскай шапце зазіраў яму ў вочы і пытаўся: «Ці даўно ты быў на споведзі?» І Акінчыц пачырванеў у сьне.

Назаўтра ён даведаўся, што новы папа з вулічнымі катамі пасяброўску. Яны за ім зграямі ходзяць. Асабліва тыя, што жывуць за нямецкім касьцёлам. Добра, што не сярэдні вякі, падумалася Акінчыцу, калі за такое сяброўства абвінавачвалі ў чарадзействе.

*20—23 красавіка 2005 г.*



**СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ** — празаік, журналіст радыё «Свабода». Выдаў тры кнігі прозы. Жыве ў Горадні.

## Сяргей Балахонаў

БЕЛАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

Белы сьвет
Белы дзень
Белы сьнег
Квецень белая дрэваў вішнёвых
Я чакаў
Я шукаў
Шпарка бег
Памыляўся я ў справах і словах
Белы сон
Белы час
Белы твар
Цела белае першай любові
Я дайшоў
Я знайшоў
Колер мар
Я сягоньня да волі гатовы

Час надышоў і пачуцьці сасьпелі
Колер маёй рэвалюцыі белы
Час надышоў і пачуцьці сасьпелі
Колер маёй рэвалюцыі белы

Белы Бог
Белы хлеб
Белы сьпеў
Крылы белыя велічных птахаў
Я кахаў
Я трываў
Я пасьпеў
Аж дарэшты пазбавіцца страху
Белы рух
Белы шыхт
Белы плён
Беларускіх вачэй прасьвятленьне
Гэты дзень
Гэты час
Гэты звон
Вызваленьне ідзе. Вызваленьне

Час надышоў і пачуцьці сасьпелі
Колер маёй рэвалюцыі белы
Час надышоў і пачуцьці сасьпелі
Колер маёй рэвалюцыі белы

## Алесь Кушнер

КАХАНАЙ ПРЫСЬВЯЧАЮ

Заплюшчыў вочы на імгненьне.
Ізноў вяртае памяць мне
То красавіцкае памкненьне,
Што прынясло мне ў дар цябе.

Стаяла ты у промнях сонца
Ля уваходу у мэтро,
Вачыма — зоркі дзьве зялёныя,
Якіх я не забуду ўжо.

Ты мне адразу спадабалася,
Твой выгляд непаўторны быў,
І я адчуў у самым сэрцы,
Што жыць мне нельга безь цябе.

Гады імгненна пралятаюць,
Зьмяняючы нам і наўкола ўсё,
Але ня згубім мы каханьня,
Нідзе, ніколі, ні за што!

## Аўген Зубовіч

МОВА

Магутны Божа, мілы мой!
О, зьлітуйся зь Літвы сваёй!
Дай не памерці краю, слову,
Ўзрадзі вялікай нашу мову.
Табой у стагодзьдзях мы пісалі,
Табой пачуцьці абуджалі,
І ты адна вяла ў бой,
Ад сну ратуючы сабой.
Цябе любілі каралі,
І гаварылі «на зямлі».
Напеўнай самаю гучыш.
Чаму ў народзе ты маўчыш?
Чаму ж цябе забыў народ,
Закінуў ужо колькі год?
Магутны Божа, мілы мой!
О, з мовы зьлітуйся маёй!

## Сяргей Макарэвіч

ПАМЯЦІ ЎЛАДЗІМЕРА ДУБОЎКІ

У сьпіс ён патрапіў апошнім з прысудных,
А выйсьці ня здолеў першым.
Шмат гадоў ён адбыў пакутных
У лягерах, адкуль выйшаў бязгрэшным.

Адкуль выйшаў бязгрэшным, нявінным,
Дзе патрацію сваю маладосьць,
Дзе на сьвет ён глядзеў дзіўным
Позіркам праз краты ўноч.

Яго Пушкіным звалі ў вочы,
Ды прарочылі жыць у вяках.
А між тым ён сяньня ў змрочы:
Пазабыты... Успамінаецца толькі ў снах.

Дык шануйце, браты, нашых продкаў!
Вы нясіце нашчадкам ўспамін.
Памятайце: Ўладзімер Дубоўка
У гісторыі быў не адзін!

## Юлія Альшэўская

Я СЬНІЛА СОН...
(К.Каліноўскаму)

Я сьніла сон, што ты жывы
І твае сэрца зноў гарыць,
Гарыць свабодаю, Радзімай,
Палае прагай барацьбы.
Ўжо больш стагодзьдзя прамінула,
А ты ня можаш дараваць
Ні таго часу, ні той волі,
Ні той зямлі пад зорным сьцягам.
Блакіт нябёс, дубровы, нівы
Яшчэ дагэтуль у вачох
І, мабыць, зь іх ужо ня зьнікнуць,
Бо стаў свабодны ты ад часу.
Бо з нараджэньня ты ў душы
Насіў і сэрца Беларусі,
Бо з нараджэньня яе голас
Ты чуў, і нават пад прымусам;
Ад нараджэньня і да сьмерці...
Дапамаглі табе памерці,
Але, здаецца, ты ўсё ведаў,
І іншы шлях ты не шукаў,
Бо ён адзіны да надзеі —
Шлях барацьбы, шлях да канца.
Навошта ж зараз ты прыйшоў?
Хоць і дарэмна запытала:
Глядзіш на край — вось і адказ.
Туга ў душы апанавала.
...
Сон скончыўся, а думка — не.
Дык вось каго нам не хапае...

## Вольга Марозава

* * *
Серад ціхенькай ночы
Крыкі з сэрца на волю лезьлі.
Ты заўважыў: замерзьлі вочы.
Я сказала: душа замерзла.

## Мікола Яўмененка

ЗІМА

У сьнежні зямля пакрываецца сьнегам
Халодным, які не кляні і ня пудзь!
Бо сьнежань — пачатак, сапраўдны калега
Зімы ў Беларусі. Пра восень забудзь!
У студзені глеба марозам і ветрам
Астуджваецца да благіх велічынь.
Хрышчэнскія сьцюжы, пранікшыя ў нетры
Зямлі, нішчаць корані дрэў уначы.

У лютым марозы слабеюць, затое
Лютуюць завеі й сугробы растуць,
Адлігі здараюцца, й дзецям праз тое
У хаце самотна, на вуліцу йдуць
Згуляць у вайну, трапна сьнежкай пацэліць
Бяскрыўднай у сябараў лепшых сваіх.
Яны таго ж самага, мусіць, хацелі
Й жадалі зьляпіць бабу сьнежную ў міг.

Улетку, увосень і нават вясною
Падобных прыгодаў для іх, дзетвары,
Няма, а таму ні з табой, ні са мною
Ня будзе іх да зімовай пары.



WWW.WORLDPRESSPHOTO.NL

**Баптыстка гуляе ў баскетбол. Агаё, ЗША. Фота Крысан Джонсан. 2-е месца сусьветнага фотаконкурсу World Press Photo 2005 ў катэгорыі «Паўсядзённае жыццё».**

## Мікалай Ільючык

БОЛЬ І ГОНАР

Шапаціць кволым лісьцем бяроза,
На граніцы халоднай чырвоныя ружы.
А у памяці боль і задушваюць сьлёзы,
Грудзі шчэміць туга і вярэдзіць душу.

Сэрца маці ніколі ня будзе ў спакоі.
Плач і енк, сьлёзы выелі вочы.
Дні пад хмарамі, чорныя мроі,
Вечны сум і бясконцыя ночы.

Гадавала і песьціла. Марыла. Сьніла.
Што сын вырасьце — ўцеха на старасьць.
Цынкаваная бляха жыцьцё скіравала
Ад дзяцінства адразу ў вечнасьць.

А зязюля куе, лічыць зноўку гадочкі,
Чаму ж мала ты ім налічыла?
Не пасьпелі займець ні сыноў, ані дочак —
Жыцьці зьмяла вайна і ушчэнт разбурыла.

Засталіся заўжды маладымі сыны.
Вас чакаюць заўсёды — прыйдзіце да нас,
У сяброў успаміны, у матчыны сны,
Добрым позіркам зь неба зірніце на нас.

Боль і гонар спавіты ў адзіны сувой
За тых хлопцаў, што ў пекла загады вялі.
А навошта? За што? Хто парушыў спакой?
І дзе праўда вайны на аўганскай зямлі?

Узгадайма усіх, хто пайшоў на спакой
Да нябёсаў у «чорным цюльпане»
І хто выжыў, скалечаны целам, душой, —
Усім героям павага, пашана.

## Іосіф Масян

* * *
Зноўку ляжа на плечы
Залаты лістапад...
І сумуе аб нечым
Апусьцелы наш сад.
Прасьлязяцца нябёсы
Ўжо ня летнім дажджом.
Як і ў кожную восень,
Лес палае кастром.
Хай ад гэтай сустрэчы
Сьветлым будзе пагляд.
Зноўку ляжа на плечы
Залаты лістапад.

## Алесь Сушчэўскі

«Я»

Я шукаю сваё «Я». «Я» шукаю.
«Я» мае мяне сабой праглынае.
Ува мне маіх нябачных «Я» — мноства.
Я за «Я» свае гатовы на помсту.
Не магу я зразумець сябе дакладна.
І таму не хачу ў размове прыватнай
Інтарэсы свае і чаканьні ад «Яў» акрэсьліць,
Са сваімі «Ямі» размову правесьці.
Але разам ува мне мае «Я» не тусуюцца,
У агульнага мяне не гуртуюцца.
А мне хочацца іх разам убачыць
І свае «Ям» мэты тлумачыць.
...Ну, а можа, калі «Я» мяне ўсе спаткаюць,
то мой розум «ніЯкі» зусім даканаюць...
А пакуль я зь «Я» сваімі сябрую,
У такі вось вершык шыхтую.

## Алесь Губін

* * *
На папяровых адзеньні
Чапляю гузікі дрымоты
І зораў-літараў падзеньне
Не выклікае мар ахвоты.

Пачуцьцяў дробныя імгненьні
Штыхі сумневу. Кволасьць цела,
Муры задушнага скляпеньня
І храпы вуліц звар'яцелых.

Мадэрнавыя героі,
Усэкспіленыя людзі,
Ня вам стаяць перад гарою
Валадара жыцьця і сьмерці.

Вайна! Даволі спаць, суседзі!
Ты чуеш?.. Вецер зь пекла золкі.
Скруці драпежнага вядзьмедзя,
Скачы да ранішняе зоркі.

Трапяткіх сэрцаў заміраньне,
Ў грудзёх зацішай асалода.
Доўгачаканае вяртаньне
Да ўпадабанае свабоды.

У места лашчыцца надзея,
Сьвятло праспэктаў залатое.
Вякоў няспынная падзея,
Ерусалімскіх брамаў мроя.

Па вокнах танчыць неба крок,
Чытаю промнямі пасланьне:
«Ты жыў ня выпадкам — знарок,
Трываў і верыў у змаганьне».

## Валеры Барташэвіч

«К свабодзе годнасьці і званьню
Мы працярэбім сабе сьлед,
І будзе ўнукаў панаваньне
Там, дзе сягоньня плача дзед».
*Янка Купала*

Аб якой Беларусі марыў Янка Купала?
Панаваньне унукаў? Ці надыдзе калі?
Па-над краем навісла толькі цемры навала,
Толькі навалач правіць на пакутнай зямлі.
Зьдзірванелы абшар, курганы, камяніцы,
Адзічэлі палі, у карчах сенажаць,
Толькі рэха Чарнобылю гоніць грамніцы,
Апусьцеўшыя вёскі сіратліва стаяць.
Ці абудзіцца люд хоць на долю імгненьня?
Ці сумленьне таксама, як дзірван зарасло?
Але чую ў адказ, як зь цяжкога пахмельля, —
«Ўсё цудоўна. Галоўна, вайны б не было».

## Андрусь Храпавіцкі

ПАКУЛЬ НАДЗЕЯ ЁСЬЦЬ...

Тэрмомэтар паказвае крыху вышэй нуля,
Кастрычнік разьвітаўся з хэлоўінскай усьмешкай,
Паціху набліжаецца, паўзе да нас зіма
Зьмяёй па ўмерзлых бульбяных пасьпешках.
На даляглядзе сонца спускаецца у твань.
Іду наперад, па калена ў балаціне,
Міраж надзеі ў сэрцы — а можа, гэта здань,
І будзе толькі чорны змрок адзіны.
Ні чалавека, ні сьвятла здалёк —
Бяскрайняя амшара бы правярае нэрвы,
Як трапіў я сюды? Ці, можа, гэта зрок
Падманвае мяне і я сяджу ў кватэры?
Працёршы вочы, бачу той жа край,
Бязьмежнае бязьлюднае балота.
Пад швэдрам майка зь лягатыпам «Выбірай!»,
Ды выбару няма — паўсюль адна пустота.
Дык, можа, не ісьці? Мо легчы і чакаць,
Пакуль жыцьцё, як дзень, ня згасьне,
Ды вецер гойдае кусты, бы хоча мне сказаць,
Што класьціся на дол яшчэ зачасна.
Калі надзея ёсьць, пакуль хапае сіл,
Трэба ісьці наперад, варушысь балота —
Калісьці і яно, змагар, на твой капыл
Адкіне маску вечнай адзіноты.
Галоўнае паверыць, галоўнае стрываць
Часы, калі здаецца, што выйсьця ўжо ня будзе,
А тых, хто на каленях, пара пераканаць:
Вы не расьліны і ня быдла — вы, спадарства, людзі!

# Горад з попелу

Пампэі, горад-прывід з каменю, попелу і сонца, горад-напамін, што ўсё на сьвеце апошні раз. Падарожнае эсэ **Франца Сіўка**.

Трапіць у Італію і ня ўбачыць Пампэі — тое самае, што не спаткацца ў вечным горадзе з папам. Ні першае, ні другой нашай прытомленай лекцыямі групе, на шчасьце, не пагражала. Больш за тое, так сталася, што з ласкі нашых апекуноў абедзьве падзеі меліся адбыцца ў адзін дзень, зь невялікім перапынкам. Ажно занадта, ды хто зазірае ў зубы доранаму каню?

Гэтая досьвітная хвіліна пачатку вандроўкі да жаданага! Яшчэ драбнаваты вясковы спадкаемца насельнікаў колішняй імпэрыі ледзь даў рады раскласьці свой сялянскі тавар у намёце збоч уваходу на тэрыторыю нашага часовага жытла і магнолія пры вокнах страўні не пасьпела як сьлед атрэсьці кроплі ранішняе імжы, як мы, абцяжараныя пакункамі «сухога» харчу ды тэчкамі з «горшым» (пампэйская лава занадта ўедлівая, папярэдзіў гід) абуткам, пасьпяхова ўнікнуўшы агромністых шышак паўднёвае хвоі, што раз-пораз падаюць з дрэў на пляц, вырушаем аўтобусам у няблізкі шлях.

Італьянская дарога — момант спраўджваньня ісьцін з падручніка даўняе гісторыі.

Белавата-шэрым прывідам эпохі брутальнае распусты вымкнецца з хмызу пры шашы і схаваецца зноў у яго чэпкіх абдоймах выкінуты наўздагон нядобрай памяці ўззлаванымі месьцічамі па-за мяжу гораду саркафаг Нэрона.

Пляцоўка з шыхтамі элеганцкіх падробак — скульптурных выяў часоў росквіту антыкі — мільгне перад вачамі і асядзе глыбока ў глуздах пацьвярджэньнем растыражаванага зь лёгкае рукі спадара Расэліні міту аб адкрытасьці Вечнага гораду.

Апіеў бальшак, па якім увайшоў у Рым апостал Пётар, узрушыць і пакіне ў разгубленасьці ад здагадкі, што ўсё гэтак блізка, амаль побач, у суседзтве.

Утульныя, больш падобныя да казачных гарадкі ды мястэчкі выплывуць насустрач аўтобусу з просіні надгор'я і растаюць па-за часам, ускалыхнуўшы душу вярэдліва-пакутлівым пачуцьцём (даруй, божа!) зайздрасьці.

Чысьцюткія штучныя ставы ды басэйны, падманлівае ўвасабленьне экалягічнага раю, пацешаць вока хвіліну-другую і, нібыта не жадаючы браць удзел у бессаромным ашуканстве, саступяць месца за акном брудна-жоўтым стужкам рэчак і раўчукоў.

Адметная рыса ранішняга апэнінскага краявіду — бязьлюдзьдзе на тле ўпарадкаваных, неверагодна акуратных (і калі пасьпяваюць людзі ўрабляць?) палеткаў.

Чародка козаў пасярод нэапалітанскага краявіду — яскравы напамін, адкуль яно ўсё.

Завеса марыва над затокаю, такога густога, што, колькі ні ўзірайся, так і ня ўгледзіш уславўленага безьліччу пёраў ды пэндзляў зваблівага аквамарыну.

Бясконцы, як размовы беларусаў пра лёс роднае мовы, Геркулянум зь відам на Вэзувій — сымбаль заўсёднае рызыкі і наканаванасьці.

Урэшце, Пампэі, горад-прывід з каменю, попелу і сонца, горад-напамін, што ўсё на сьвеце апошні раз.

Шлях ад Марскоe брамы да ўскраіннай забудовы Пампэі — прагулянка ў вечнасьць працяглаьсцю ў тры-чатыры гадзіны. Водаправодчык-вынаходнік, архітэктар, пекар ці проста аматар карцінак фрывольнага зьместу — кожны знойдзе сярод руінаў сваё, тое, што абраў за прыярытэт на шляху ў кудысьці.

У Пампэі вечнасьць — рэч цалкам датыкальная. Мазаікі і фрэскі, узрост якіх сягае пад амаль два дзясяткі стагодзьдзяў, мармуровыя балеі, што помняць цяпло сьцегнікоў і сьпін старажытных аматараў камфортнага купаньня, белыя каменьчыкі ў бруку, што сьвяцілі па начах не аднаму пакаленьню палкіх мясцовых донжуанаў падчас шпацыраў да ложка каханкі, малюнкі з выявамі сабак перад уваходам у жытло, ахайна абчасаныя плескачы пасярод вулкі — праезд забаронены! — усё можна пакратаць, памацаць, агледзець з усіх бакоў.

І — лава, лава, лава… Яе так шмат усюды, што яна яшчэ доўга па вандроўцы будзе нагадваць пра сябе шараватым налётам на чаравіках. Попел, пасланы Богам (існуе і такая вэрсія) жыхарам дваццацітысячнага гораду дзеля пакараньня за легкадумнасьць і парушэньне Яго запаветаў.

Трынаццаць зьлепкаў целаў патрыцыяў і іх рабоў, атрыманых у выніку маніпуляцый рэстаўратараў з гіпсам і пустотамі, што ўтварыліся зь цягам часу ў лаве на месцы тых целаў праз стагодзьдзі пасьля таго, як яна накрыла Пампэі, — дакладная ілюстрацыя катастрофы лета 79 г. н.э. і адначасова — напамін аб хуткаплыннасьці жыцьця і нікчэмнасьці людзкіх жарсьцяў ды таго, што мянуецца грамадзкім статусам чалавека.

Пампэі — мудры дарадца, што дапамагае кожнаму, хто меў шчасьце дакрануцца да яго жудаснай мінуўшчыны, хоць на нейкае імгненьне пазбыцца ўсяго таго дробязнага і неістотнага, што перашкаджае жыць.

Пампэі ўзрушаюць і — узвышаюць. Гнятуць і разам з тым — ачышчаюць, высьвечваючы сапраўдны, а ня ўяўны кошт слова, рэчы, учынку.

Пампэі — узор паважлівага стаўленьня люду паспалітага і яго правадыроў да ўласнае этнакультурнае спадчыны. Схаваны ад вока чалавечага цягам больш як паўтары тысячы гадоў пад покрывам сьмерці тоўшчаю пяцьшэсьць мэтраў, рэстаўраваны, наколькі гэта было магчыма, горад стаўся ня толькі ілюстрацыяй прыроднага катаклізму (каго сёньня ім зьдзівіш?), але і сьведчаньнем памкненьня народу да захаваньня сваёй гістарычнай памяці.

Зрэшты, Пампэі — гэта ня толькі руіны старажытных мУроў. Ледзь пакінуўшы царства сьмерці, акурат трапіш у горад сучасны, што раскінуўся побач, — ажыўлены, шматлюдны, заняты сваімі штодзённымі клопатамі. Адзін з адметных цэнтраў рэлігійнага жыцьця краіны.

Як Рым — горад вечны, так Пампэі — горад вольны. Вольны перадусім праз наяўнасьць невымернае трагедыі — чыньніка самадастатковасьці, праз адсутнасьць неабходнасьці дбаньня аб дні заўтрашнім — складніка свабоды найвышэйшай, даступнай адно жабракам ды вандроўным паэтам.

Горад-абярэг, што, вандруючы ў аднойчы прыручаным часе, засмучаны тваім духоўным занядбаньнем і празьмернаю прыхільнасьцю да зямных спакусаў, не-не ды і сыпне ў вочы дзеля напаміну пра існае жменю ўедлівага вэзувійскага попелу.



**Пампэйскія фрэскі ўразілі сваёй пачуцьцёвасьцю нават знаўцаў мастацтва антычнасьці.**

АДАМ ГЛЁБУС



## Сучасьнікі

### 2005. Дайнека і будоўля новай царквы

Чаго мне моцна не хапае ў сучасным выяўленчым мастацтве? Карціны. Вялікай, шматфігурнай, манумэнтальнай… Жывапісцы займаюцца салёнымі мёртванацюртамі, паліткарнымі карыкатурамі за гранты і катэджнымі паўпараднымі паўпартрэтамі. Карціна сьвету і сьвет у карціне ніяк не выяўляецца. Ці выяўляецца ня так, як мусіў бы выяўляцца. Таму і прыдумалася палатно «На будоўлі новай царквы». Рыштаваньні — залатыя перакрыжаваньні з дошак, муры — цеплакроўная цэгла, будаўнікі з суворымі тварамі, будаўніцы з блакітнымі вачыма. Падобнае палатно напісаў Аляксандар Дайнека. Ягонае «На будоўлі новых цэхаў» (1926) адлюстравала энтузіязм пабудовы новай гіпэрімпэрыі. Цяпер, калі на руінах той зьняслаўленай імпэрыі ідзе адраджэньне хрысьціянскай царквы, моладзь захоплена новым будаўнічым энтузіязмам. Ва ўсе часы будоўля захапляла масавую сьвядомасьць, за выключэньнем прыпадкаў ваяўнічага вар'яцтва, калі на месца дойліда заскоквае вайсковец-руйнавальнік і пад верашчаньне клікушаў нішчыць, раўнуе зь зямлёю набудаванае. Толькі я ня буду маляваць на вялікім палатне будоўлю новай царквы; і не таму, што мне замінаюць вайскоўцы-клікушы ды сьвятары-цемрашалы, а таму, што, набудаваўшы процьму цэркваў, суворыя будаўнікі і блакітнавокія будаўніцы азірнуцца на збудаванае і ўбачаць замест сабораў пустыя бязьлюдныя памяшканьні.

*24.03.2005, 12:39*

### 2005. Саўка і 25 Сакавіка

За што люблю несанкцыянаваныя мітынгі? Заўсёды там шмат выпадковых сустрэч і здарэньняў. Ніколі ня ведаеш, як што павернецца і разгорнецца, дзе апынешся і як выкараскаешся зь нерэглямэнтаваных варункаў… Мэта, зразумела, ясная — сьветлая будучыня бацькаўшчыны. 25.03.2005 разьлічваць на перамены і перамогу не выпадала, але выйсьці на вуліцу і стаць пад бел-чырвона-белым сьцягам — раскоша, у якой я зноў ня змог сабе адмовіць. Я ж ня з тых, у каго мазгі заплылі мяшчанскім тлушчам і хто здатны толькі на размазваньне сваіх псэўдапатрыятычных і нібыта-канструктыўных думак па маніторах, на тэлеэкранах ды папяровых аркушыках. Люблю дзеяньні, рэагаваньні, учынкі. З 1985 году я не ўяўляю свайго жыцьця без самаправеркі на мітынгах і ў шэсьцях. Для мяне вельмі важна, што я на баку слабейшых, сярод зьняважаных і прыніжаных, сярод абураных і нераўнадушных, сярод тых, хто мае веру. Бязь веры ў беларушчыну, у беларускую ідэю і беларускую справу я сябе таксама не ўяўляю. Таму не ўпадаю ў ступар, калі праваахоўнік, запакаваны ў чорную форму, хапае мяне за куртку. Ірвуся! І адступаю, я саступаю, каб сабрацца з духам і выйсьці зноў, зноў і зноў… Бязь веры гэта зрабіць немагчыма.

25.03.2005 я не пасьпеў нават выйсьці з падземнага пераходу, а цэнтурыёны ў чорных шаломах ужо напалі на мітынгоўцаў. З натоўпнага гудзеньня на якое імгненьне вырваўся крык будаўніка Клімава. Па прыступках у падземныя нетры пабеглі людзі, сярод якіх мільгануў твар рок-крытыка Мартыненкі. Побач са мною апынуўся філёляг Саўка. Ён выглядаў урачыста і груваства, як саліст з італьянскай опэры, пра што я і сказаў філёлягу-традыцыяналісту. Саўка ў адказ: «Ты напішы пра тое, што я на мітынгу добра выглядаў!» Як для мяне, дык усе беларусы апошнія 20 гадоў годна выглядаюць толькі на мітынгах і ў шэсьцях.

*26.03.2005, 13:17*

# Прага адрэналіну

При канцы тыдня для аматараў спорту пачнецца сапраўднае сьвята. У суботу, 30 красавіка, у Аўстрыі стартуе чэмпіянат сьвету па хакеі. 16 камандаў разьбіты на чатыры падгрупы. У жывым этэры гульні на агульнадаступных каналах будуць паказваць каналы БТ і ТВЦ. Зборная Беларусі трапіла ў падгрупу «А». Сёй-той ужо пасьпяшаўся назваць яе групай сьмерці, што, праўда, недалёка ад ісьціны.

У суперніку беларусам на першым этапе дасталіся чэмпіён сьвету-2002 зборная Славакія (матч зь імі 30 красавіка), зборная Расеі, што тыднем раней выйграла Кубак Эўратуру, ды гаспадары чэмпіянату аўстрыйцы. Дома, як вядома, і сьцены дапамагаюць.

У беларускага заўзятара цікавасьць да сусьветнага першынства падагрэтая і тым, што ў Вену павёз зборную замежны спэцыяліст, трэнэр «Вашынгтон Кэпіталз» Глен Хэнлан. Прызначэньне Хэнлана 11 сакавіка на пост №1 выклікала шмат нараканьняў як сярод заўзятараў, так і сярод хакеістаў. Казалі, што, можа, ня варта мяняць коней на пераправе, а лепш даць магчымасьць дапрацаваць да канца сэзона Міхаілу Захараву. Але хакейнае кіраўніцтва сказала важкае слова — і кропка. Захарава адправілі ў адстаўку. Гадаць, наколькі гэта правільны альбо памылковы крок, — справа марная. Усё стане ясна праз два тыдні, па сканчэньні першынства. Вось толькі таварыскія матчы беларусы правялі найгоршым чынам.

Адзначым таксама, што Хэнлан прыехаў у нашу хакейную парафію са сваімі звычкамі. Кардынальным чынам памяняў сыстэму трэніровак, адмовіўся ад паслуг аднаго зь лідэраў нацыянальнай дружыны Аляксея Калюжнага і вярнуў у зборную галкіпэра Андрэя Мезіна, які ня раз выручаў на сусьветных чэмпіянатах. Паразумецца зь Міхаілам Захаравым Мезіну было вельмі цяжка.

Праўда, колькі дзён таму лыжку дзёгцю ў беларускую бочку зь мёдам дабавіў усходні сусед — Расея. Кіраўніцтва піцерскага СКА, за які мінулы сэзон выступаў Мезін, намякнула, што налета беларусу давядзецца шукаць новае месца працы. Псыхалягічная вайна з супернікамі па падгрупе ў расейцаў ужо пачалася. Беларускаму галкіпэру, абараняючы вароты, давядзецца ў галаве яшчэ трымаць розныя варыянты працаўладкаваньня ў будучым сэзоне. Пры лакаўце ў НХЛ і лішку хакейнай працоўнай сілы на эўрапейскіх рынках зрабіць гэта будзе складана. Хіба толькі даказаць сваю прафэсійнасьць удалай гульнёй на чэмпіянаце сьвету, а заадно ў вочнай спрэчцы са зборнай Расеі (4 траўня) адпомсьціць за такую псыхалягічную атаку.

А яшчэ хочацца ад будучага сусьветнага першынства адрэналіну. Такіх перажываньняў, якія былі ў 1996 г., калі зборная ў галяндзкім Эйндховэне першы раз паспрабавала прабіцца ў сусьветную эліту. Ці паўтарэньня Зімовай алімпіяды-1998. Калі замест таго, каб ісьці на вучобу, зь сябрамі раніцай глядзелі трансьляцыі зь Японіі, перажываючы за беларускую зборную, якая тады прабілася ў васьмёрку наймацнейшых зборных сьвету. Тады гэта быў супэрпосьпех айчыннага хакею, які яднаў нацыю.

Вось гэтага самага і чакаеш ад сусьветнага першынства ў Аўстрыі. Каб наша зборная ня проста захавала/страціла месца ў эліце. Вандраваньне паміж вышэйшым і першым дывізіёнамі цалкам надакучыла. Хочацца прыгожай, годнай гульні. І каб кожны вечар, калі будуць гуляць беларусы, чакаўся зь нецярпеньнем. Лепей жа, каб пра нашу краіну ў сьвеце ведалі са станоўчага боку, бо ненармальна, калі аб ёй мяркуюць з дакладу Севярына, выступу Райс ці скандальных ляпаў прэзыдэнта.

Апошнія гады (хіба за выняткам Кубку Дэвіса) у нас не было значных посьпехаў у спорце. А так хочацца пабываць хоць на хвіліну ў скуры сярэднестатыстычнага славака ці латыша. І адчуць, што адчуваў жыхар Брацiславы ў траўні 2002 г., калі зборная Славакіі стала чэмпіёнам сьвету, ці хаця б рыжанін у чэрвені 2004 г., пасьля гераічнага матчу зборнай Латвіі са зборнай Нямеччыны (0:0).

**Алег Раявец**

Каб прадоўжыць змаганьне за пуцёўку ў плэй-оф, беларусам трэба не заняць апошняе месца ў сваёй падгрупе «А». Тады найлепшыя тры каманды падгрупы аб'ядноюцца з трыма камандамі падгрупы «Д» (Чэхія, Нямеччына, Швайцарыя, Казахстан). Матчы па вызначэньні чатырох чвэрцьфіналістаў пройдуць з 6 па 10 траўня.

У адваротным выпадку беларусам з трыма такімі ж няўдачнікамі давядзецца змагацца за захаваньне месца ў эліце. Матчы таксама 6—10 траўня. Выбываюць з найвышэйшага дывізіёну дзьве каманды.

## СЬЦІСЛА

### Бяз нашых

Жаночая зборная Беларусі па тэнісе ня здолела заваяваць пуцёўкі ў плэй-оф Сусьветнай групы Кубку фэдэрацый (аналяг мужчынскага Кубку Дэвіса). На мінулым тыдні ў Турцыі праходзілі матчы эўра-афрыканскай зоны. Напачатку для беларусак усё складвалася вельмі добра. Яны выйгралі першую кваліфікацыю, абышоўшы зборныя Грэцыі, Ізраілю і Ўкраіны. Аднак вырашальны стыкавы матч эўра-афрыканскай зоны са зборнай Славеніі стаў непераадольным бар'ерам. Беларускі саступілі зь лікам 1:2. Наступная спроба праз год.

### Сафійскае жніво

Беларуская зборная вярнулася з чэмпіянату Эўропы па цяжкай атлетыцы, заваяваўшы 12 мэдалёў (пяць залатых, два сярэбраныя і пяць бронзавых). Настасься Новікава (вагавая катэгорыя да 53 кг) заваявала залаты мэдаль у мнагабор'і і «малое золата» ў штурхку. Руслан Новікаў — у мнагабор'і і рыўку. Павал Гаркавы — у рыўку. Болей за беларусаў мэдалёў заваявалі зборныя Расеі, Турцыі, Баўгарыі, Украіны.

### Баскетбольны фінал

Для айчыннага баскетболу характэрнае супрацьстаяньне Горадня—Менск. У фінале мужчынскага першынства Беларусі сустрэнуцца «Горадня-93» і сталічны «Віталюр». Спартоўцы з гораду над Нёманам перайгралі ў паўфінале віцебскі «Лякаматыў-КіС» (зь лікам 3:0), а менчукі — асіповіцкую АЗАА (3:1). Фіналы пачынаюцца гульнямі ў Менску 29—30 красавіка ў спартовай залі «Гарызонт». У пятніцу пачатак а 18-й, у суботу а 12-й. Потым каманды пераедуць у Горадню. Як і ў паўфінале, тут сэрыя да трох перамог.

### БГК — чэмпіён

Берасьцейскі гандбольны клюб імя Мяшкова другі раз запар стаў чэмпіёнам Беларусі па гандболе. Выхаванцы Ўладзімера Саўкі зрабілі гэта датэрмінова, падчас матчаў пятага туру першынства краіны, што праходзілі ў мінулы ўікэнд у сталіцы. Адрыў берасьцейцаў ад найбліжэйшых канкурэнтаў — сталічнага СКА — цяпер складае 12 пунктаў, і яны недасягальныя.

### Іланаак, што значыць «сябар»

Аргкамітэт Зімовае Алімпіяды-2010 ухваліў сваю эмблему. Чалавечак па імені «Іланаак», што на мове эскімосаў Канады азначае «сябар», быў выбраны з 1600 эскізаў. Чалавечак складаецца зь пяці камянёў «алімпійскіх колераў». Разам з сымбалем пяці кантынэнтаў гэта й сымбаль Брытанскай Калюмбіі. Зялёны і сіні колеры сымбалізуюць лясы Брытанскай Калюмбіі, горы і выспы; чырвоны колер — кляновы ліст, залаты — сонца.

Кампанія «Rivera Design Group», што распрацавала эскіз-пераможцу, атрымала прыз у 25 тыс. даляраў і два білеты на адкрыцьцё Алімпіяды.

### Дэрбі па-шатляндзку

Трох мужчынаў і жанчыну арыштавалі ў нядзелю пасьля бойкі паміж фанатамі шатляндзкіх футбольных клюбаў «Сэлтык» і «Глазга Рэйнджарс». Бойка пачалася на пароме, што кіраваўся з Глазга ў Бэлфаст (Паўночная Ірляндыя), і ў ёй узялі ўдзел 100 з 350 пасажыраў. Члены экіпажу паспрабавалі разьняць фанатаў, але атрымалі кухталёў. Бойка працягнулася на вуліцах Бэлфасту. Дасталося паліцэйскаму і некалькім машынам. А ў супэрдэрбі перамог «Сэлтык» — 2:1.

**Падрыхтаваў АР**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**22—24 красавіка ў Менску прайшоў турнір па мастацкай гімнастыцы — «Гран-пры BelSwissBank». У шматбор'і перамагла прадстаўніца Ўкраіны Ганна Бяссонава. Беларуска Інна Жукава заняла другое месца ў шматбор'і і ў практыкаваньнях са скакалкай.**

ЦАЦКА




## Гульні дзяцей вызначаюць іхную будучыню

Істотны ўклад у разьвіцьцё дзіцячай эканамічнай адукацыі, у пасьпяховую будучыню дзяцей унесьлі беларускія вытворцы: днямі ў дзіцячыя крамы і кнігарні паступіла новая гульня «Гермэс і кампанія». Праз захапляльны занятак дзеці даведваюцца аб усіх сфэрах эканамічнай дзейнасьці: у гульні яны здабываюць сыравіну, вырошчваюць сельгаспрадукцыю, вырабляюць і прадаюць прамысловае абсталяваньне і тавары народнага спажываньня, спазнаюць розныя гістарычныя факты. Гуляць у яе можна як у малодшым, так і (за кошт укладзенага блёку пашырэньня) у старшым школьным узросьце.

Сярод мноства дзіцячых эканамічных гульняў адзінкі даюць пазнавальны эфэкт, таму выбраць гульню цяжэй, чым кнігу. Гульня дае вельмі глыбокае засваеньне ведаў і навыкаў, а што менавіта — карыснае ці, наадварот, шкоднае, зьвязанае з жыцьцём ці надуманае — атрымае дзіця? Гэтае пытаньне, а таксама жаданьне пашырыць веды хлопчыкаў і дзяўчынак вечарамі і ў дажджлівыя дні, апроч кампутарных гульняў і прагляду тэлевізара, сталіся імпульсам да стварэньня настольнай гульні «Гермэс і кампанія».

У ходзе вывучэньня праблемы пасьпяховасьці ў школе было выяўлена, што дзіця лепш і з большай цікавасьцю займаецца школьнымі прадметамі, калі бачыць ужытковасьць гэтых ведаў у сваім жыцьці. А менавіта ж эканоміка — ці гэта гульня, ці маляўнічая кніга, раённы гурток ці школьны факультатыў — здольна паказаць дзіцяці прыкладны характар і важнасьць для яго будучыні прадметаў школьнай праграмы, павысіўшы тым самым яго цікавасьць да прадметаў і пасьпяховасьць па іх. Прасьцей захапіць дзіця менавіта гульнёй.

Імітацыя ў гульні «Гермэс і кампанія» рэальных падзей на прадпрыемствах і ў эканоміцы краіны робіць яе захапляльным заняткам. Яна дазваляе дзецям даведацца пра многія прафэсіі, прайграць шматлікія сытуацыі, адчуць рызыкі, высьветліць прыроду дабаўленай вартасьці і прадпрымальніцкага прыбытку, сутнасьць падаткаў і дзяржаўнага кіраваньня. Гульня выпрацоўвае навыкі зносін і пошуку рашэньняў. Гэта дапаможа ў самавызначэньні дзіцяці ў будучыні.

Хлапчукі і дзяўчынкі пашыраць кола сваіх сёньняшніх заняткаў і лепш спазнаюць акаляючы іх сьвет, знойдуць цікавыя формы зносін зь сябрамі і бацькамі. Да таго ж паводле гульні ў сталіцы і абласных гарадах плянуюцца разнастайныя мерапрыемствы, дзе дзеці змогуць пагуляць разам з такімі ж захопленымі пагодкамі, — такое знаёмства будзе карысна і цяпер, і ў дарослым жыцьці.

Ва ўсе рэгіёны Беларусі кур'ерамі і поштай гульню дастаўляе інтэрнэт-крама «Rodina.by» (тэл. 8-029-661-85-44). Таксама пытайцеся яе ў крамах. Сайт і дадатковая інфармацыя пра гульню па адрасе: http://germesik.at.tut.by.

# Геній, блазан, ліхадзей

Японскія паліцыянты выпусьцілі 62-гадовага Робэрта Фішэра з турмы, дзе ён адседзеў каля году. Экс-чэмпіён сьвету па шахматах пасьпяхова дабраўся да Ісьляндыі — краіны, альтынг якой адмыслова прагаласаваў за наданьне яму грамадзянства. Шахматы — важная частка традыцыйнай культуры нашчадкаў вікінгаў, да таго ж славуты матч 1972 г. паміж Фішэрам і Спаскім праходзіў менавіта ў Рэйк'явіку. Амэрыканцы, што настойвалі на экстрадыцыі бунтоўнага барадача, асталіся з носам. Тым ня менш, падазрэньні зь яго ня зьнятыя: занадта ўжо дэманстратыўна парушаў ён маральныя і юрыдычныя нормы, прынятыя ня толькі на яго былой радзіме.

Міжнародная мітусьня вакол Фішэра ўзьняла адвечныя пытаньні: ці сумяшчальныя геній і ліхадзейства? Ці льга ўсё дараваць чалавеку, які папулярызаваў шахматы, як ніхто іншы? Апроч таго, якую ацэнку можна даць амэрыканскім спэцслужбам, якія калісьці памясьцілі «пад каўпак» маці будучага генія? Магчыма, карані пэўных учынкаў Робэрта Дж. Фішэра тояцца якраз у траўме, перажытай у дзяцінстве, падчас макартысцкага «паляваньня на ведзьмаў»…

Як бы рэагавалі нашы людзі шахмат, калі б Фішэр пераехаў у Беларусь — самую антыамэрыканскую краіну рэгіёну? Вось некаторыя меркаваньні.

Уладзімер Літвін і Станіслаў Альховік, аматары шахмат са Слоніму:

— Па праўдзе, куды глядзела наша кіраўніцтва? Фішэру трэба было надаць беларускае грамадзянства, і ў нашым шахматным жыцьці справы пайшлі б угору! У Ісьляндыі і так замнога гросмайстраў — цэлы тузін на дзьвесьце тысяч чалавек, а ў Беларусі моцных шахматыстаў мала.

Сяргей Карчыцкі, чэмпіён краіны па сёгі:

— Думаю, што Ісьляндыя мела рацыю, запрасіўшы Фішэра да сябе. Што да яго пераезду ў Беларусь — гэта было б цікава…

Уладзімер Гінзбург, выканаўчы дырэктар Беларускай фэдэрацыі шахмат:

— Фішэр — таленавіты, але, падобна, хворы чалавек. Такому трэба забясьпечыць нармальныя ўмовы для жыцьця. Ну няхай бы ён жыў у Менску, выступаў на першай дошцы за наш клюб «Вясьнянка»…

Тацяна Бондар, майстарка ФІДЭ, віцэ-чэмпіёнка Беларусі:

— Думаю, ён сам бы да нас не прыехаў.




Бальшыня апытаных, як і чакалася, пагадзіліся б на іміграцыю Фішэра ў Беларусь. Варыянт не выглядае абсурдным: чым шахматыст горшы ад хакейнага трэнэра Глена Хэнлана? Дый за распальваньне міжнацыянальнай варожасьці ў сучаснай Беларусі амаль не перасьледуюць. Кажуць, швайцарскі гісторык-рэвізіяніст Юрген Граф, асуджаны ў сваёй краіне, знайшоў сабе прытулак у Менску.

**ВР**

ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ



**15…Фd8-c8**: такім быў выбар чытачоў. Наймацнейшая фігура прыстасаваная да аховы слабой пешкі. Чамусьці ніхто не запрапанаваў 15...Cd3, што вяло б да авантурных ускладненьняў. Зараз слон ня хутка дабярэцца да белай туры: добра падумаўшы, гросмайстар распачаў наступ у цэнтры (16. e3-e4). Рэакцыі чытачоў чакаем да панядзелка, 19:00. E-mail: nn@promedia.by SMS: 754-04-53. Он-лайн: byChess.narod.ru.

## Як бы вы згулялі?

**Б.Спаскі — Р.Фішэр, Рэйк'явік, 1972. Ход чорных.**



Адказ

1...Ca4! і белыя здаліся (2. Фa4 Фe4 –+).

ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

## Пятніца, 29 красавіка

**«Лад», 22.20**
«Кардэбалет».
ЗША, 1985, рэж. Рычард Атэнбара.

Мюзыкл.

Рэжысэр адбірае прэтэндэнтаў у кардэбалет для брадвэйскага шоў. Калі застаецца шаснаццаць, рэжысэр прымушае актораў распавесьці пра сябе.

Фільм — кінавэрсія знакамітага мюзыклу. Паставіў фільм кінаклясык Рычард Атэнбара («Чаплін»). Галоўную ролю выконвае Майкл Дуглас («Трафік»).

Карціна намінаваная на «Оскар» за найлепшую музыку, песьню, гук і найлепшы мантаж. Р.Атэнбара намінаваны на «Залаты глёбус».

**СТВ, 23.30**
«Жарсьці Хрыстовы».
ЗША, 2004, рэж. Мэл Гібсан.



Біблейскі пэплюм.

Найпасьпяховае «хрыстапрадаўства» апошніх часоў. Кананічная гісторыя Хрыстовых жарсьцяў пастаўлена М.Гібсанам як камэрцыйны твор на масавую спажыву. Гістарычныя касьцюмы, біблейскія дэкарацыі, а героі размаўляюць па-арамэйску і на латыні. Акторы мусяць намякаць на апосталаў, Марыю і самога Хрыста, але ўяўляюць сабой сьцёртыя шыльдачкі ў «Макдональдсе». Прыкра, што ў гэтай карціне адсутнічае тое, што знаўцы называюць трансцэндэнтальным стылем, — які й мусіць сьведчыць пра боскае, таямнічае. Але такі стыль — надзвычай рэдкая зьява ў кіно; Гібсан абышоўся распродажам.

На гэтым распродажы вольна пачуваюць сябе дохлы асёл (для Юды) і бясполая дачка Адрыяна Чэлентана ў ролі д'ябла: лысы твар, раздушаная зьмяя і круглыя вочы ўпрыгожылі б любы фільм жахаў. На Джыма Кэвізэла (у карціне быццам бы Хрыстос) вылілі гекатоны чырвонай фарбы й заклеілі адно вока (каб гледачы не заўважылі, што ў вачах «Граф Монтэ Крыста» і кар'ера баскетбаліста).

Шкада, што сёньня не гандлююць сьвятымі рэліквіямі й індульгенцыямі, — Гібсан наладзіў бы файны бізнэс.

## Субота, 30 красавіка

**«Лад»**, 17.55
«Запрашаем, ці Пабочным уваход забаронены».
Расея, 1964, рэж. Элем Клімаў.

Камэдыя.

Гісторыя пра піянерскі лягер зь непаслухмяным Косьцем Іначкіным (Віктар Касых) і кепскім дырэктарам Дыніным (Яўген Еўсьцігнееў) была забаронена як антысавецкая і антыхрушчоўская.

Кантроль, падпольле ды іншадумства, стукацтва, дурасьць і супярэчнасьць лёзунгаў — усе прыметы савецкага жыцьця зь вясёлаю непасрэднасьцю знайшлі сабе месца ў піянерскім лягеры ад Э.Клімава.

Карціна сьветлая і пацешная, атрутная — і чалавечная.

**АНТ, 21.00**
«Свае».
Расея, 2004, рэж. Дзьмітры Месхіеў.

Ваенная драма.

Тры ўцекачы-ваеннапалонныя хаваюцца ў вясковага старасты (Багдан Ступка), бацькі аднаго зь іх, антысаветчыка. Сын старога закаханы ў суседзкую дзяўчыну, але да яе заляцаецца й паліцай.

Свае страляюць у сваіх.

Для расейскага кіно падобны расклад зьяўляецца навіною.

Фільм параўноўвалі з «Акупацыяй» Андрэя Кудзіненкі.

На Маскоўскім кінафэстывалі прызы за найлепшы фільм, рэжысуру й мужчынскую ролю (Б.Ступка).

Шматлікі намінант і прызэр «Нікі».

**СТВ, 22.45**
«Андрэй Рублёў».
Расея, 1966, рэж. Андрэй Таркоўскі.

Гісторыка-рэлігійная драма.

Шэдэўр пра расейскага мастака Андрэя Рублёва (Анатоль Саланіцын). Рэжысэра цікавіць глыбіннае духоўнае жыцьцё героя, маральны подзьвіг і сьвятасьць. У стасунках паміж сярэднявечнымі героямі праяўляецца характэрнае для сучаснасьці проціпастаўленьне — улада, інтэлігенцыя і народ.

Фільм выклікаў шок, абвінавачаньні ў жорсткасьці й «антырасейскасьці».

Але «Андрэй Рублёў» — адна з самых лепшых праяў рускага генія.

## Нядзеля, 1 траўня

**«Лад», 16.55**
«Прыкуты».
Беларусь—Расея, 2002, рэж. Валеры Рыбараў.

Мэлядрама.

Бязладная і кепская карціна, пасьля якой расейскія крытыкі казалі: «На беларускім кіно можна паставіць крыж» (памыліліся: здымаць можна й горш). Але фільм надзвычай цікавы псыхааналітыкам, культуролягам і ўсім аматарам кінахалтуры, дзе самыя трагічныя сцэны выглядаюць пацешна.

Герой фільму Павал (Уладзімер Гасьцюхін) — былы аўганец, які ня можа прыстасавацца да дня сёньняшняга, жыве самотна й ваўкавата. Побач зь ім зьяўляецца маладая дзяўчына Ганна (Ала Клюка). Напрыканцы фільму героя чакае прасьвятленьне й адкрыцьцё.

Карціна «бяздомная» (беларуска-расейскай вытворчасьці), так што шматабяцальныя намёкі на інцэст у фільме можна лічыць нечаканай і ненаўмыснай мэтафарай беларуска-расейскіх стасункаў. Абавязкова дачакайцеся апошняй сцэны, калі герой прыкоўвае сябе кайданкамі да агароджы беларускай царквы і ні з пушчы ні з поля заяўляе, што вярнуўся дадому. Такая раптоўная і глыбокая «духоўнасьць» знаходзіць ганаровае месца на кінасьметніцы.

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

**Выстава Куліка**

У сядзібе Партыі БНФ (вул.Варвашэні, 8) працуе выстава выдатнага беларускага мастака Яўгена Куліка (1938—2002). Экспануюцца каля дваццаці графічных лістоў мастака.

**СМІ ў Беларусі**

З **3 да 6 траўня** ў выстаўным павільёне НВЦ «Белэкспа», што на Я.Купалы, 27 пройдзе выстава «СМІ ў Беларусі».

**Культурная спадчына Беларусі**

Да **1 чэрвеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (вул.Чырвонаармейская, 9, галоўны корпус, 3 паверх) працуе выстава «Культурная спадчына Беларусі». На выстаўцы прадстаўлена пад 100 дакумэнтаў, у тым ліку кнігі, паштоўкі, энцыкляпэдыі...

**Анталёгія расейскага жывапісу XVIII—XX ст.**

**Да 3 ліпеня** ў Нацыянальным мастацкім музэі (вул.Леніна, 20) працуе выстава «Анталёгія расейскага жывапісу XVIII—XX ст.». 55 твораў з Маскоўскага музэю-сядзібы Астанкіна, Тульскага музэю выяўленчага мастацтва, Яраслаўскага мастацкага музэю і Рыбінскага гісторыка-архітэктурнага музэю-запаведніка. Квіткі: 1 500 руб.

**Хата — мой сусьвет**

**Да 1 чэрвеня** ў Музэі гісторыі беларускай літаратуры (вул. Багдановіча, 15) працуе выстава «Хата — мой сусьвет».

**Утульнасьць дому**

**Да 29 траўня** ў Менскім абласным цэнтры народнай творчасьці (вул.Гікалы, 4) працуе выстава лозапляценьня «Утульнасьць вашага дому». На выставе прадстаўлены працы з Наваполацку, Браслава, Гомелю.

**Твар чалавека**

У «М-Галерэі» Інстытуту Гётэ ў Менску (вул.Фрунзэ, 5) **да 30 траўня** працуе фатавыстаўка Ўладзімера Скамарошчанкі «Твар чалавека». Уваход вольны.

## СПАБОРНІЦТВЫ

**Чэмпіянат і першынство Беларусі па бодыбілдынгу і фітнэсе**

**30 красавіка — 1 траўня** ў менскім Палацы спорту (пр.Машэрава, 4) адбудуцца чэмпіянат і першынство Беларусі па бодыбілдынгу і фітнэсе. Пачатак а 18-й.

## ІМПРЭЗЫ

**Вечарына ў гонар Масарыка**

**29 красавіка** а 18-й у Доме літаратара ў чытальнай залі адбудзецца вечарына «Да 155-й гадавіны першага прэзыдэнта Чэхаславаччыны Томаша Масарыка». Ладзяць клюб «Спадчына» і Чэская амбасада. Будуць экспанавацца новыя творы беларускіх мастакоў.

**Заходнепалескае навуковае таварыства**

Паседжаньне Заходнепалескага навуковага таварыства адбудзецца ў пятніцу, 29 красавіка ў 18.30 па адрасе вул.Казлова, 7—101. Іван Лучыц-Федарэц выступіць з дакладам «Эмалёгія некаторых словаў», Юры Чарнякевіч — з дакладам «Павер'і, зьвязаныя з будаўніцтвам».

**Француская камэрная музыка**

**29 красавіка** ў вялікай залі Беларускай акадэміі музыкі (вул. Інтэрнацыянальная, 30) адбудзецца канцэрт француской камэрнай музыкі. Упершыню ў нашай краіне будзе выканаы твор Аліўе Мэсіяна «Квартэт на канец часу» (гэты твор быў напісаны ў 1941 г. у канцлягеры і там жа выкананы), а таксама музыка Клёда Дэбюсі і Марыса Равэля. Выканаўцы: Кацярына Архіпава, Натальля Малышава, Натальля Папова і Аляксей Яськельчык. Пачатак а 19-й гадзіне. Уваход вольны.

**Фэстываль аўтарскай песьні**

**29 красавіка** ў ДК МТЗ (вул. Даўгабродзкая, 24) пройдзе Фэстываль аўтарскай песьні з удзелам бардаў зь Менску, Масквы і Санкт-Пецярбургу. Пачатак а 19-й. Квіткі: 8 000—12 000.

**Тодар**

**3 траўня** ў Доме літаратара (вул. Фрунзэ, 5) адбудзецца вялікі сольны канцэрт Зьмітра Вайцюшкевіча з прэзэнтацыяй новай праграмы. У праграме новыя і любімыя песьні, кампазыцыі з супольных музычных праектаў «Народны альбом», «Я нарадзіўся тут», «Сьвяты вечар» і інш. Пачатак а 19-й. Квіткі: 8 000—12 000.

**Песьні з-над Нёмна й Дзьвіны**

**5 траўня** ў Музэі тэатра і музыкі (Музычны зав., 5) адбудзецца прэзэнтацыя альбома Станіслава Манюшкі «Песьні з-над Нёмна й Дзьвіны», прысьвечаная дню нараджэньня кампазытара. Уваход вольны. Т.: 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74.

**Століншчына**

**6 траўня** ў Доме літаратара (Фрунзэ, 5) адбудзецца сольны канцэрт Івана Кірчука з прэзэнтацыяй этнаграфічнага альбому «Століншчына». Удзельнічаюць этнаграфічныя калектывы Століншчыны. Пачатак а 19-й. Квіткі: 8 000 — 12 000.

**Рэлігія**

Брацтва «Каны» запрашае мужоў і жонак, якія прагнуць ўмацаваць свой шлюб праз дыялёг, прабачэньне і малітву, на азнаямляльную сустрэчу. Экумэнічнае брацтва «Каны» складаецца зь сем'яў, паклікаых да будаваньня адзінства — асобы, сям'і, Царквы і грамадзтва.

Сустрэча адбудзецца **21—22 траўня** ў Менску з удзелам нашых братоў і сясьцёр супольнасьці «Chemin Neuf» («Новая Дарога»), з блаславеньня апостальскага візытатара Беларускай грэка-каталіцкай царквы архімандрыта Сяргея Гаека. Даведкі праз тэл.: (0162) 28-08-49, 8-029-661-55-19 ці e-mail: panasevich@brest.by.

## ТЭАТРЫ

**Опэра**

**4** (ср) — «Вясельле Фігара».
**5** (чц) — «Чароўная флейта».
**6** (пт) — канцэрт «Памяць сэрца».

**Балет**

**29** (пт) — «Лебядзінае возера».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**3** (аўт) — «Парадоксы жарсьці».
**4** (ср) — «Адэль».
**5** (чц) — «Містэр Розыгрыш».
**6** (пт) — «Палёты з анёлам».
**7** (сб) — «Кабала сьвятош».
**8** (ндз) — «Трыбунал».

**Купалаўскі тэатар**

**28** (чц) — «Тутэйшыя».
**30** (сб) — «Каханьне ў стылі барока».

**Тэатар Горкага**

**28** (чц) — «На Залатым возеры».
**29** (пт) — «Суцяшальнік удоў».
**30** (сб) — «Зьвеставаньне Марыі».

**Музычны тэатар**

**28** (чц) — «Галяктыка каханьня».
**29** (пт) — «Прынцэса цырку».
**30** (ндз) — «Марыца».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Экстрым** (634—57—23)
**7** (сб), 21.00 — «Depeche Mode вечарына».

**Bronx** (288—10—61, gsm velcom: 103 і 105)
**28** (чц), 22.00 — dj Genys, Хайле Тумс.
**29** (пт), 22.30 — жывая музыка: «Блюз Стрыт» / dj Mitya.
**30** (сб), 22.00 — dj Smirnoff (Масква), dj Arsenti Tchouprina.
**1** (ндз), 17.00 — нядзельны кінасалон.

**Белая вежа** (284—69—22, 239—16—00)
**28** (чц), 23.00 — «White Tower Party»: dj Grizzly, dj Top.
**29** (пт), 23.00 —dj Arsenti Tchouprina, dj Конь, dj Uma, dj D-Jane Uma Junior.
**30** (сб), 22.00 — жывая музыка: «Acoustic Band» / dj Mihel, dj Dee.
**1** (ндз), 23.00 — «Gold Party»: dj Alex: гіты 1960—1990-х.

**Ізюм** (206—66—18)
**28** (чц), 23.00 — «Royalty R`N`B»: dj Induss.
**29** (пт), 23.00 — «Person Party»: Cedric Piret (Belgium), dj Lexa.
**30** (сб), 23.00 — «Fusion Dance»: dj Lexa.
**1** (ндз), 19.00 — «Pretty Sunday».

**Бліндаж** (219—00—10)
**28** (чц), 23.00 — dj Egor.
**29** (пт), 23.00 — dj Bergamo, dj Max Laitov.
**30** (сб), 23.00 — dj Grizzly, dj Max Laitov.
**1** (ндз), 23.00 — dj Egor, dj Лайтаў.

**Madison** (219—00—10)
**29** (пт), 23.00 — dj Andrei Panin (Масква).
**1** (ндз), 23.00 — dj Grizzly.

**X-Ray** (223—93—55)
**29** (пт), 22.00 — dj Grey.
**30** (сб), 23.00 — dj Bergamo.

**Presto** (232—54—49, 232—15—79)
**30** (сб), 23.00 — dj Vitalik Ultra, dj Top, dj Grizzly, dj Bergamo, dj Lemon.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Ад 180 і вышэй» (прэм'ера): **29** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **30, 1** (сб, ндз) 14.30, 16.30, 20.50.
«Знаёмства з Факерамі»: **29** (пт) 16.10, 20.50.
«Чырвонае неба»: **29—1** (пт—ндз) 18.30.
«Уцёкі»*** (прэм'ера): **30, 1** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Сахара» (2с): **29** (пт) 13.30, 16.00 (іл), 18.30 (іл), 21.00; **30, 1** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Жаніх напракат»: **29, 1** (пт, ндз) 21.00; **30** (пт) 17.00 (іл), 19.00.
«Званок-2»***: **29, 1** (пт, ндз) 17.00 (іл), 19.00; **30** (ндз) 21.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Ад 180 і вышэй» (прэм'ера): **29** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **30, 1** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00.
«Уцёкі»*** (прэм'ера): **30, 1** (сб, ндз) 21.00.

**«Масква»** (203-14-48)
«Ад 180 і вышэй» (прэм'ера): **29** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **30, 1** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00.
«Уцёкі»*** (прэм'ера): **30, 1** (сб, ндз) 18.50, 21.10.

**«Мір»** (288-22-33)
«Сахара» (2с): **29** (пт) 16.00, 18.20, 20.40; **30, 1** (сб, ндз) 13.40 (іл), 16.00, 18.20, 20.40.
«Званок-2»***: **29—1** (пт—ндз) 17.00, 21.10.
«Трое ў каноэ»: **29—1** (пт—ндз) 19.00.

**«Перамога»** (203-77-66)
«Сахара» (2с): **29** (пт) 14.00, 16.30, 21.00; **30** (сб) 14.00 (іл), 16.30, 21.00; **1** (ндз) 16.30, 21.00.
«Тэатар»***: **29, 30** (пт, сб) 19.00; **1** (ндз) 14.00 (іл), 19.00.
«Іх паклікала неба» (д/ф, да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **1** (ндз) 14.00.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Прафэсіяналы»: **29—1** (пт—ндз) 17.00, 21.00.
«Другі бок пасьцелі»***: **29—1** (пт—ндз) 19.00.
«Вам — заданьне»: **29—1** (пт—ндз) 15.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Правілы здыманьня: Хітчаў мэтад»: **29** (пт) 11.00, 13.30, 15.50, 21.00; **30** (сб) 11.00 (іл), 13.30, 16.00, 21.00; **1** (ндз) 11.00 (іл), 13.30, 16.00, 18.30, 21.00.
«Мужчынскія сэрцы» (тыдзень францускага кіно): **29** (пт) 18.30.
«Сямейнае падабенства» (тыдзень францускага кіно): **30** (сб) 18.30 (на францускай мове).

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## КІНО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**«Аўрора»**
«Пінокіё-3000»: **29** (пт) 14.30; **30, 1** (сб, ндз) 12.00.

**«Берасьце»**
«Пітэр Пэн у Нідзеляндыі»: **30, 1** (сб, ндз) 11.30.

**«Дружба»**
«Два браты»: **29** (пт) 12.00; **30, 1** (сб, ндз) 11.00.
«Бальная сукенка»: **29** (пт) 14.00; **30, 1** (сб, ндз) 13.00.

**«Масква»**
«Прынц і я» («Выхадны — усёй сям'ёй!»): **1** (ндз) 13.00.

**«Мір»**
«Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей»: **29** (пт) 15.00; **30, 1** (сб, ндз) 13.00, 15.00.

**«Перамога»**
«Маленькія ўцекачы»: **30, 1** (сб, ндз) 12.00.

**«Піянер»**
«Горад чарадзеяў»: **29** (пт) 11.00; **30, 1** (сб, ндз) 11.20.
«Я — Цэзар»: **29** (пт) 13.00; **30, 1** (сб, ндз) 13.10.
«Мышаня і чырвонае сонейка»: **30, 1** (сб, ндз) 10.00.

## КІНО НА DVD

**Master Records**

**«Лёгка»**
Рамантычная камэдыя, ЗША, 2003, рэж. **Джэйн Вэйнстак.**
У ролях: **Маргарыт Маро, Нэвін Эндрус.**
Жыцьць з каханьнем ня так лёгка… Фільм — удзельнік фэстываляў у Сандэнсе, Таронта, Бостане.

**«16 год. каханьне. перазагрузка»**
Драма, Аўстралія, 2004, рэж. **Кейт Шортланд.**
У ролях: **Эбі Корніш, Сэм Уортынгтан.**
16-гадовая Хэйдзі ўцякае з дому і спрабуе разабрацца ў сваім каханьні і сваёй сэксуальнасьці. Фільм — удзельнік Канскага кінафэстывалю.

**«Тэлевядучы»**
Камэдыя Адама Макея.
**Менск, Кісялёва, 12, т.: 643-21-08**




## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Пустыня, золата, карабель



«Сахара» («Sahara»)
ЗША—Гішпанія, 2005, каляровы, 127 хв.
**Жанр:** прыгоды
**Адзнака:** 5 (з 10)

«Сахара» — старое добрае прыгодніцкае кіно, якое ні на што не прэтэндуе, але й не прымусіць гледача сумаваць.

Для прыгод неабходны тайны, скарбы, пошукі, экзатычныя краіны, ворагі (зямныя варыянты цмокаў і Кашчэяў Бесьсмяротных), бойкі, атракцыёны з элемэнтамі рамантычнай гісторыі ды камічнымі пэрсанажамі.

У карціне «Сахара» ўсе гэтыя складнікі маюцца, зьмяшаныя ў добрай прапорцыі, і гарантуюць дзьве гадзіны лёгкага адпачынку.

Падводны археоляг Дырк Піт (Мэцью Макконахі) шукае амэрыканскі карабель часоў Грамадзянскай вайны 1861—1865 гг. у афрыканскай пустыні (чаго карабель заплыў у пустыню — невядома). Адначасова лекар Эва Рохас (Пэнэлёпа Круз) сутыкаецца з эпідэміяй. Ёй трэба знайсьці крыніцу атруты — і шляхі герояў сыходзяцца.

Адразу ўзгадваюцца клясычныя «Індыяна Джонз» і «Раман з каменем», але «Сахара» не спакушаецца на чужыя ляўры: ёй дастаткова сваіх жанравых і прафэсійна-роўных атракцыёнаў.

Уцёкі й бойкі на катэрах, злачынны завод па перапрацоўцы таксычных адкідаў (Індыяна Джонз, Джэймз Бонд і «Грынпіс» у адным фляконе), патаемны штурм цягніка на вярблюдах, выбухі, золата ў бочках. Стары самалёт пераўтвараецца ў яхту на колах — адмыслова для афрыканскіх барханаў (фільм здымаўся ў Марока), а пустыня ашчэрваецца сакрэтнымі люстэркамі схаванае фабрыкі.

Рамантычная лінія паміж героямі Макконахі і Круз ледзьве пазначаная й не перашкаджае атракцыёнам (а ў бойках лекарка не саступае спэцыяльнаму агенту).

Прыгода ідзе за прыгодай, і «Сахара» — кіно нясумнае, жанрава-вытрыманае й відовішчнае.

Добры адпачынак для ўсёй сям'і на выхадныя.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Канфлікт на Розачкі

Каб прагназаваць вынікі канфлікту «Менск—Вашынгтон», ня трэба быць супэрпупэрпаліттэхнолягам. Трэба зрабіць яго праекцыю на звычайную штодзённую сытуацыю. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Дапусьцім, што недзе ў Менску на Розачкі ў нейкай хрушчоўцы, дзе тараканаў мірыяды, жыве сабе альканаўт-удавец Шурык. Штовечар, як ужарэцца, пачынае зьдзекавацца з ката па мянушцы Трэці Сэктар. Кот вые на ўвесь дом, прыносячы грамадзкасьці масу нэгатыўных эмоцый. Часам хаваецца ў суседзяў.

Нарэшце незамужняя суседка, жаласьлівая і пабожная Ліза, ня вытрывала і запатрабавала ад Шурыка спыніць прасаваць энімала. У іншым разе пагражала выселіць яго за зьдзек з жывёл (наконт гэтага ёсьць адпаведны артыкул).

Шурык у адказ ненарматыўна паслаў Лізу на тры вясёлыя літары («Ідзі вучы склоны, дзеўка»), аднёс паўлітра аўтарытэтнаму брату Ўладзімеру, які толькі што з зоны адкінуўся і ўладкаваўся ахоўнікам ва ўнівэрмаг «Рублёўскі», атрымаўшы ад яго гарантыі маральнага хелпу. А каб прадэманстраваць поўны пафігізм да слоў Лізы, арганізаваў дома ў суботу рамонт. Пасьля чаго зноў пачаў дубасіць жывёліну.

Як бачым, складваецца цікавы штодзённы канфлікт, які адразу становіцца хедлайнэрам для мясцовых мас-мэдыя (бабкі на лавачцы).

Яны доўга і падрабязна разьбіраюць актуалі ды магчымыя сцэнары разьвіцьця падзей.

— Ой, Казімераўна, а ты чула, што ўчора Лізка зноў заяву на Шурыка накатала? Трэцюю ўжо. Ужо гэтым разам у Менгарвыканкам. Ой, ня скончыцца гэта дабром.

— Гэта што, Ферапонтаўна. Учора Шурык з Валодзькам саміт у сквэры арганізавалі. Напіліся да пацалункаў і абяцанак, што кватэры разьмяняюць і будуць жыць разам у адным братэрскім саюзе. Потым у дупу ўжэртыя сюды прыйшлі. Сталі пад бальконам Лізы. Валодзька ўжо адрубленьі быў. А Шурык яшчэ трымаўся неяк. Стаіць і крычыць на ўвесь сьвет: «Ну, хто на мяне з братаном?!» А потым пайшоў і зноў пачаў мучаць таго Трэцяга Сэктара. Ты, кажа, скаціна, самім фактам, што існуеш, мяне фізычна і маральна абражаеш. Мяне, гаранта Жылкодэксу ў гэтай кватэры!

Цяпер давайце паварушым зьвілінамі, чым можа закончыцца такі канфлікт.

1) Ліза такі прывядзе ўчастковага, які накрые Шурыкаву маліну, — 60%.

2) Уладзімера за крадзеж сырка «Дружба» звольняць з пасады ахоўніка ўнівэрмагу, і ён ня зможа абараняць братана. Ліза мабілізуе грамадзкасьць, і Шурыка папруць — 30%.

3) Усё так і застанецца. Шурык будзе мучыць ката. Кот будзе енчыць. Ліза — пісаць заявы. Брат Уладзімер — крышаваць Шурыка. Як толькі кот здохне, канфлікт сам сабой вычарпаецца. Ліза і Шурык плюнуць адно на аднаго — 10%.

4) Нянавісьць Шурыка і Лізы паступова трансфармуецца ў каханьне. Яны возьмуць шлюб, а ката выкінуць нафіг — 0%.

Вось што падказвае мне мая абывацельская думка.


# сёньня

99 гадоў газэце
**Наша Ніва**

7 гадоў часопісу
ARCHE




28 красавіка
19.00

Вялікая заля
Дому літаратара
Уваход вольны

Сьпявае
постамэрыканскі
Лявон Вольскі
Выступаюць рэдактары
і аўтары Першай Беларускай Газэты
і Новага Беларускага Часопісу
Уладзімер Арлоў, Адам Глёбус,
Зьміцер Бартосік, Андрэй Хадановіч,
Лёлік Ушкін, Андрэй Дынько, Валер Булгакаў,
Людка Сільнова, Вера Бурлак, Даніла Жукоўскі,
Сяргей Харэўскі, Андрэй Скурко, Алесь Кудрыцкі, Алесь Белы.
Сэанс адначасовай гульні дае Вольф Рубінчык. Сюрпрызы і цуды.


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Спадарыню Раду** як маму і спадарыню Арыну як бабулю віншуем са зьяўленьнем першынца Данілкі — гэткага пяшчотнага боскага падаруначка. Лебедзі

**Віншуем Вінцука Вячорку** з нараджэньнем унука. Сябры

**Вінцук**, з унукам! Юры

### КАНТАКТЫ

**Пазнаёмлюся зь беларускамоўнай дзяўчынай**, што адмоўна ставіцца да алькаголю ды курэньня. Yasna@inter.by

**Хрысьціяне**! Чакаем Вас: www.bchd.info

**МГА «Хаўрус сяброў»** запрашае адведаць сайт: www.zmk.ngo.by

**Прыгожы хлопец**, 27/188/74, в/а, з гумарам, надзейны, шукае сябра. Тайну гарантую. Ліст з фота (вярну 100%). Дасылайце на адрас: А/с 48, 220108, Менск-108

### КНІГІ

**Дабрачынная раздача** кніжак па гісторыі, паліталёгіі, мовазнаўстве, філязофіі на прымальных умовах. Новыя ды рэдкія кнігі, фільмы на CD, музыка, значкі, футболкі з сымболікай на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (13:00—19:00). Т.: 707-40-01

**Набуду поўны збор** твораў 1990 г. і кнігу «Нявыдадзенае» 1995 г. У.Караткевіча. Т.: 662-99-96, 262-99-96 (дзень), 287-01-04 (вечар). Наташа

**Прадам кнігі**: Ю.Туронак, «Беларусь пад нямецкай акупацыяй»; К.Акула, «Змагарныя дарогі»; Я.Чачот, «Навагрудзкі замак»; «К.Каліноўскі» з сэрыі «Беларускі кнігазбор»; «Я.Карскі»; «Беларускі арнамэнт»; багаты выбар кніг па гісторыі, архітэктуры, мовазнаўстве, этнаграфіі. Т.: 753-70-05

**Прадам кнігі**: Я.Сямашка, «Армія Краёва»; А.Вініцкі, «Матэрыялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне»; В.Грыцкевіч, «Гісторыя і міты»; Я.Запруднік, «Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях»; Л.Геніюш, «Ад родных ніў», факс. 1942 г., Прага, ды інш. Т.: 753-70-05

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: 235-18-72. Юры


**Запрашаем наведаць**
**Камянец-Падольскі** і
**Хацін** (Украіна)



з **13** да **16** **траўня**.

Вас чакае экскурсія па гістарычнай частцы Камянца, наведваньне Катэдральнага сабору і Старой крэпасьці, а таксама вандроўка па Хацінскай фартэцыі. Вы атрымаеце магчымасьць ня толькі пазнаёміцца з унікальнымі помнікамі архітэктуры і гісторыі, але і пабачыць такую цікавую зьяву прыроды, як крышталёвыя пячоры, а таксама стаць удзельнікам фэсту паветраных шароў.

**Далучайцеся да нашых вандровак!**
Тэлефон для даведак: 222-46-51.


## КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі
(для прыватных асобаў) на стар. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль)— 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».
Даведкі праз т. (017) 284-73-29


**Запрашаем у падарожжа**

**7—10 траўня**
**Львоў—Крэхіў—Жоўква—Карпаты**.
35 эўра.

**14—15 траўня:**
**Вільня—Трокі—Меднікі.** 35 эўра.

Т.: 279-05-85, 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
364-12-38, 776-24-35 (Павал)


Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3457. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 20.00 27.04.2005.
Замова № 2380.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а